№ 21 (379) 4 чэрвеня 2004

www.nn.by

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Сустракайце
лета з «НН»
24 старонкі

Чэкісты Лукашэнкі

ад Л да Т.

старонка 5

Як дырэктараў саўгасаў зрабілі фэрмэрамі

Як улада перадала ім зямлю разам з работнікамі і што з гэтага выйшла.

старонка 12

Румын выбраў сэрбаў

Беларускі футбол за крок ад мары.

старонка 11

Мёртвыя не пацеюць

Эсэ Ўладзімера Арлова.

старонка 20

Ён замінаў Расеі будаваць свабоднае грамадзтва

старонка 2

440 даляраў за рубель

Змучаны баямі за асобны эмісійны цэнтар, Нацбанк стварае лягатып для беларускага рубля.

старонка 6

Маленькая разбуральніца імпэрыі КГБ

Латвійскія рэфлексіі Віталя Тараса.

старонка 8

Я хачу стаць прэзыдэнтам

Новая гутарка з сэрыі «Пакаленьне next»: прадпрымальніцкі лідэр Анатоль Шумчанка.

старонка 7

Шчасьлівейшы за сваіх герояў

Справа кандыдата філялягічных навук Алеся Пашкевіча: вынікі.

старонка 10

Бэстсэлеры вясны

Рэйтынг «НН».

старонка 16

Выпускнікі Беларускага ліцэю вытрымалі экзамэны экстэрнам. Палова ліцэістаў працягне адукацыю за мяжой, палова застанецца ў Беларусі.
На выпускным балі Ліцэю прысутнічалі дзеячы інтэлігенцыі і прадстаўнікі дыпкорпусу. Ліцэй робіць новы набор.
Старонка 3.

Сярэдні бал — дзявятка

Дык падпісвайся!

Балтыка чакае

«Наша Ніва» абвяшчае конкурс для падпісчыкаў. Галоўны прыз пераможцу — адпачынак на Балтыйскім моры.
Каб узяць удзел у конкурсе, дасылайце копіі падпісных абанэмэнтаў на 2-е паўгодзьдзе 2004 году на адрас Рэдакцыі. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. Дасылаць можна й факсам на нумар (017) 284-73-29 або, адсканаваўшы, праз электронную пошту nn@promedia.by.

Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку» ды ў прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс».

Цана на месяц — 2580 рублёў на поштах або 1800 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». Гэта нашмат таньней, чым ураздроб.

Не сьпявай пад акном

Апазыцыя не чакае ад выбараў, прызначаных на 17 кастрычніка, *нічога асаблівага*. І гэта мудра. Прынамсі, ніхто не зьвінаваціць у нерэалізьме, калі выбары пройдуць па сцэнары леташніх выбараў у Менскі гарсавет, з масавым удзелам любімых прэзыдэнтам доктарак і дырэктарак. А чаму б парлямэнцкім выбарам і не прайсьці па сцэнары тых мясцовых, калі народ ня супраць?

Іду ў заклад, што наступным прэзыдэнтам будзе дэпутат палаты (наступнікам — не дай божа пераемнікам). Я не сьцьвярджаю, што гэта адбудзецца ў 2006 годзе, ні тым больш сёлета ўвосені пасьля дажджу. Я нават ня пэўны, што гэтая пасада ў яе цяперашнім выглядзе перажыве свайго першазаймальніка — прынамсі, сваіх Гаўлаў і аль-Яураў у Беларусі столькі, што ніякі эскадрон сьмерці ўсіх не перастраляе. Няпісаная канстытуцыя дзейнае палітычнае сыстэмы падказвае, што наступнікам найпрасьцей стаць дэпутату. Чыгір у 2000 годзе ня стаў дэпутатам — ня стаў і прэзыдэнтам. А Х стане дэпутатам — і пачне новую эру. Таму на месцы лукашэнкаўцаў я б паклапаціўся ня толькі пра наяўнасьць у парлямэнце дамаў, але і пра наяўнасьць там дастойных, праверaных апанэнтаў. Тым больш што апазыцыя ў нас пакуль нашмат менш прарасейская, чым прэса, і той, хто так клапоціцца пра захаваньне сваёй краіны, яе сувэрэнітэту і рэальнай незалежнасьці, мусіў бы гэта цаніць. Але ўлада легкадумна недаацэньвае сілу духу нашых апазыцыйных жабак у гляку. Прапусьціўшы адну частку іх дарогай Зянона Пазьняка — на ўзор грамадзянскіх камітэтаў КХП стварыўся Грамадзянскі камітэт абароны канстытуцыі, не ўдакладняючы якой — 1918-га, 1994-га ці 1996 гадоў, цяпер думаньнікі з Чырвонага дому хочуць…

Гэта сэнсацыя! На сайце вельмішаноўнае Аб'яднанай грамадзянскай партыі зьявіўся артыкул пэўнага Андрэя Сталярова аб тым, што толькі сумеснымі намаганьнямі лукашэнкаўцаў і «Пяцёркі +» можна ўратаваць незалежнасьць Беларусі ад расейска-эўрапейскае змовы. Цытую: «Дысыжнмэйкеры Захаду й Расеі пралічылі ўсе варыянты, акрамя аднаго — супольных дзеяньняў апазыцыі і ўлады Беларусі. Мы шчыльна падыходзім да найважнейшага рубяжу ў гісторыі нашай краіны». І яшчэ: «Адміністрацыя прэзыдэнта, «Пяцёрка +» і другія структуры грамадзянскае супольнасьці (! — клічнік мой. — **Аўт.**) стаяць перад сур'ёзным выклікам стварэньня аднае супольнае кааліцыі супраць новых ліній падзелу ў Эўропе, супраць падзелу Беларусі па чэхаславацкім варыянце 1938 г.» У тым, што артыкул быў разасланы па партыйных каналах у панядзелак, трэба бачыць намёк: падобныя высновы прывезла з маскоўскіх і эўрапейскіх ваяжаў найвышэйшае кіраўніцтва партыі.

З гэткіх опусаў тырчаць вушы тых самых аналітыкаў, якія ў 2000 годзе сутыкалі Пазьняка — і ўсіх беларускіх незалежнікаў — з Гансам-Георгам Вікам. Цяпер — усю апазыцыю з Эўропай і Расеяй, якія папросту таксама ні на што асаблівае 17 кастрычніка не разьлічваюць. Асабліва міла, што тыя самыя рупліўцы пра незалежнасьць ад «брусэльскага і маскоўскага саюзаў» яшчэ раней, у 1995-м, задумлялі геніяльны праект саюзу Беларусі й Расеі.

Між тым, калі сур'ёзна, апазыцыя — яе частка прынамсі — ахвотна далучылася б да дзяржавабудаўніцтва. З радасьцю пайшла б на працу ў міністэрствы эканомікі, энэргетыкі, адукацыі. А ўжо ў МЗС ці карупцыянэраў выяўляць — і не сумнявайцеся. У апазыцыі дзясяткі незапатрабаваных галоваў — эканамістаў-практыкаў, мэнэджэраў з заходняй падрыхтоўкай, прафэсараў і маладых прагматыкаў, гатовых выкладацца *дзеля Беларусі.* Але без кампрамісаў з сумленьнем, калі ласка. Ды нешта са стану ўлады не чуваць падобнага кшталту прапановаў. Не падпускаюць на гарматны стрэл! Няйначай баяцца выявіць уласную некампэтэнтнасьць і неэфэктыўнасьць побач з кадрамі новага пакаленьня.

Раз баяцца, дык — не кажы ты мне слоў, што ня грэюць цяплом, як пяецца ў адной учасна адроджанай песьні.

Барыс Тумар

Ён замінаў
будаваць свабоднае грамадзтва

Надоечы ў цэнтры Масквы разагналі пікет, потым мітынг… Тэлеканал НТВ звольніў кіраўніка праграмы «Надоечы» Леаніда Парфёнава… Дума прыняла закон, які рэзка абмяжоўвае магчымасьці палітычных партый і правы грамадзян у арганізацыі рэфэрэндумаў… Ці ня праўда — сваім зьместам гэтыя паведамленьні нагадваюць паведамленьні зь Беларусі 7—8-гадовай даўнасьці?

Прыкладна ў той час у Менск прыехаў быў адзін з заснавальнікаў і кіраўнікоў НТВ Дабрадзееў. Ён сустракаўся зь сябрамі Беларускай асацыяцыі журналістаў, дзяліўся з калегамі вопытам стварэньня свабоднага й незалежнага тэлебачаньня. Праз нейкі час ён узначаліў інфармацыйныя праграмы на РТР — дзяржаўным расейскім тэлебачаньні. На той момант НТВ ужо таксама фактычна перайшло пад кантроль дзяржавы. Толькі некалькі праграм — сярод іх «Надоечы» й «Свабода слова» Савіка Шустэра — выбіваліся з агульнай плыні.

Але пасьля таго як Шустэр запісаў сваю праграму ў Менску з удзелам Лукашэнкі, «Свабода слова» пачала ўспрымацца як назва гумарыстычнай перадачы. Пасьля скандалу з Паўлам Селіным, які «няправільна» паказаў пахаваньне Васіля Быкава, трэба было любой цаной захаваць карпункт НТВ у Беларусі. Карпункт захаваўся. Але хто можа прыгадаць тэмы сюжэтаў цяперашняга карэспандэнта НТВ у Менску?

З падачы Герасімава быў звольнены Парфёнаў. Падстава — інтэрвію з Малікой Яндарбіевай, удавой забітага ў Катары Зелімхана Яндарбіева. Ва ўсім сюжэце — ані слова пра палітыку ці расейскія спэцслужбы, за выключэньнем, мабыць, рэплікі аднаго араба: «Так, я чуў, быў выбух. Забілі прэзыдэнта Чачэніі. Я думаю, гэта зрабілі расейцы ці нехта зь іншай краіны. Нейкія свае разборкі».


PHOTO.BYMEDIA.NET

Забойцы экс-прэзыдэнта незалежнай Ічкерыі былі злоўленыя амаль на месцы злачынства. Гэта быў нечуваны правал спэцслужбаў, ганьба на ўвесь сьвет. А паколькі суд у Досе, у адрозьненьне ад Басманнага суду ў Маскве, непадкантрольны Крамлю, застаецца адно — адыграцца на журналістах.

Віктар Шандаровіч, аўтар праграмы «Лялькі», якая адной зь першых была некалі зьнятая з этэру НТВ, нядаўна пісаў з іроніяй: паспрабуйце ўявіць сабе ў праграме «Час» на 1-м канале — ну добра, не на першым, хай сабе на НТВ — рэпартаж зь фільтрацыйнага лягеру дзе-небудзь у Чачэніі… Цяпер гэтую агаворку можна зьняць.

Віталь Тарас

З РАСЕІ ПРА РАСЕЮ

Такія надышлі часы

Праект Парфёнава быў пабудаваны зусім не на крытыцы рэжыму, а на апісаньні бытаваньня маргінальных супольнасьцяў — хворых на СНІД, таўстуноў, нацыянал-бальшавікоў, мільярдэраў або стрыт-рэйсэраў. І акурат у гэтым сэнсе паводле азначэньня быў у глыбокай эстэтычнай і ідэалягічнай супярэчнасьці з пуцінскай эпохай. Супярэчнасьці, якая насуперак законам папулярнасьці й рынку з тэлезоркі робіць такога ж ідэйнага адшчапенца, а адшчапенцы ў нас, самі разумееце, нядзельны прайм-тайм займаць ня могуць, нягледзячы на лідэрства ў тэлерэйтынгах.

Немагчыма ж зрабіць Расею моцнай бязь лялек ад Упраўленьня ўнутранай палітыкі, якія перажоўваюць зводкі ў аналітычных тэлепраграмах.

Gazeta.ru

ШТО Ў СЬВЕЦЕ РОБІЦЦА

АГП: фонд для «Народнай волі»

У адказ на рашэньне суду аштрафаваць газэту «Народная воля» на 50 млн рублёў на карысьць Ягора Рыбакова, палітрада Аб'яднанай грамадзянскай партыі прапанавала стварыць Фонд падтрымкі газэты і вырашыла ахвяраваць газэце больш за два мільёны рублёў, сабраных партыйцамі.

Ірак: новы ўрад

Іяд Алаві, новы прэм'ер краіны, у аўторак абвясьціў склад свайго ўраду, які налічвае 33 асобы, і паабяцаў прывесьці краіну да сувэрэнітэту й дэмакратыі. Аднак чакаецца, што ўрад Алаві пагодзіцца на прысутнасьць у краіне войскаў кааліцыі. На сёньня ў Іраку разьмешчана 138 тыс. амэрыканскіх жаўнераў і яшчэ 17 тыс. вайскоўцаў зь іншых краінаў, у тым ліку ўкраінцаў, латышоў, малдаванаў і палякаў.

Лукашэнка — за дрывяную незалежнасьць

Чвэрць спажываных Беларусяй энэргарэсурсаў неабходна замяніць мясцовымі відамі паліва, заявіў А.Лукашэнка 31 траўня, уручаючы ўзнагароды энэргетыкам. «Мы ня зможам захаваць незалежнасьць, не забясьпечыўшы энэргетычнай бясьпекі нашае дзяржавы». На думку Лукашэнкі, пытаньне ня ў тым, дзе купляць энэргарэсурсы, а ў тым, каб проста замясьціць чвэрць імпарту. «Важнейшай на сёньня задачы няма», — сказаў ён.

Расея: 700 тыс. беспрытульных

У Расеі каля 700 тыс. беспрытульных дзяцей. Больш было толькі пасьля вайны. Пераважная большасьць іх — не сіроты, а дзеці алькаголікаў, наркаманаў ды зэкаў. Не ратуюць і дзіцячыя дамы. Паводле зьвестак расейскае пракуратуры, якая праводзіла праверку ў гэтай сфэры, 40% юнакоў выходзяць з інтэрнатаў наркаманамі ці алькаголікамі, 40% робяцца злачынцамі, кожны дзясяты ўчыняе самагубства.

Сэрбія: прэзыдэнт стане мільянэрам

Кандыдат, абраны прэзыдэнтам Сэрбіі, стане ня толькі кіраўніком дзяржавы, але адразу і мільянэрам. Памылкова пастаўленая коска ў законе вызначыла, што абранаму ў чэрвені прэзыдэнту будзе сплачана 2,6 млн эўра. Гаворка ідзе пра вяртаньне выдаткаў на выбарчую кампанію. Парлямэнтары зьбіраліся ўвесьці норму аб вылучэньні на кампанію 0,01% дзяржбюджэту, але памылкова запісалі 0,1%. Ніводзін з 250 дэпутатаў не заўважыў памылкі. А цяпер, перад выбарамі, закон ужо забараняе ўносіць зьмены.

МБ; радыё «Свабода»

КАЛЯНДАР

Дзень сьвятой Эўфрасіньні

5 чэрвеня ў цэрквах і касьцёлах будуць ушаноўваць нябёсную патронку Беларусі сьвятую Эўфрасіньню Полацкую. Сёлета спаўняецца 900 гадоў з дня яе нараджэньня (1004).

У падтрымку «Народнай волі»

З ініцыятывы Народнай кааліцыі «Пяцёрка+» 10 чэрвеня а 18-й на Кастрычніцай плошчы ў Менску адбудзецца акцыя «Ланцуг неабыякавых чытачоў» у падтрымку газэты, якую цкуюць судамі. Да акцыі, няма сумневу, далучацца чытачы і ўсіх іншых незалежных газэтаў.

КЛЯСЫЧНЫ ПРАВАПІС

Беларуская партыя

Давыдзюк С., Мартынюк Л. Нанесьці ўдар у дэбюце. — Берасьце: Выдавецтва С.Лаўрова, 2004. — 84 с. 300 ас.

Першая ў сьвеце кніжка пра шахматы на беларускай мове (правапіс клясычны) адрасаваная пачаткоўцам. Яна зьмяшчае ўзоры дэбютных пастак, больш як 100 пазыцый для самастойнага рашэньня. Падрыхтавалі яе кабрынчукі, якія маюць цудоўную шахматную школу ў дамку часоў санацыі і падрыхтавалі лідэраў беларускіх шахматаў Аляксея Аляксандрава і Тацяну Мартынюк. Цікава, што іхнымі ж намаганьнямі ў свой час выйшла першая шахматная кніга на палескай мове (раней за беларускую!). Нават працуючы ў сфэрах, дзе беларуская мова яшчэ не ўвайшла ўва ўжытак, беларусы стараюцца зрабіць, што ў іх сілах, каб яна загучала.

Шахматная рубрыка «НН» — старонка 24.

Рок для чайнікаў

Залатыя дыскі беларускага рок-н-ролу. — Менск, 2004.

Кніжку варта чытаць, калі нічога ня ведаеш пра беларускі рок-н-рол — атрымаеш цэльнае ўяўленьне. Кніжку можна чытаць, калі нечага ня ведаеш пра беларускі рок-н-рол — напрыклад, сапраўднага прозьвішча вакаліста «Мясцовага часу». Кожны дыск ацэньваецца, кожнаму падшукваецца месца, храналягічная пасьлядоўнасьць рэцэнзіяў — ад «Песьняроў» да «Personal Depeche» — дазваляе бачыць наш рок у разьвіцьці. Кніжка выйшла дбаньнямі выкладчыкаў і студэнтаў Беларускага Калегіюму. Большую частку рэцэнзіяў напісалі аўтары «НН» Сяргей Будкін і Павал Сьвярдлоў. Правапіс клясычны.

БТ, СМ

Сярэдні бал – дзявятка

Намесьнік дырэктара зачыненага Гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа Лявон Баршчэўскі цэлы год найбольш баяўся за выпускнікоў. «Ім прапаноўвалі Ліцэй БДУ з абяцаньнямі гарантаванага паступленьня ў гэты ўнівэрсытэт. Выпускны курс быў аб'ектыўна слабейшы за папярэднія, таму многія пайшлі гэтым шляхам. Праўда, сярод тых, хто перайшоў у Ліцэй БДУ, было некалькі моцных вучняў». На выпускным чацьвёртым курсе засталіся 23 навучэнцы.

«Год у падпольлі» загартаваў ліцэістаў. «Цягавіты курс» — так характарызуе сёлетніх выпускнікоў Л.Баршчэўскі. А вось ліцэіст Глеб Лабадзенка называе гэты выпуск ліцэістаў «няправільным». «Абсалютна ўсё ішло ня так, як мае быць, — кажа ён. — Аднак гэты год даў веры ў сябе і Ліцэй».

На сёньня дыплёмы Ліцэю атрымалі 17 чалавек, астатнія вучні маюць запазычанасьці: яшчэ ня ўсе залікі і тэсты здадзеныя, і ім на выпускным балі ўручылі пакуль толькі пахвальныя лісты. Але ўжо ў самы бліжэйшы час 2-3 чалавекі павінны атрымаць дыплёмы. Прынамсі, выкладчыкі гатовы працаваць усё лета. Паводле слоў Баршчэўскага, ня ставіцца ніякіх канкрэтных тэрмінаў, бо кожныя тры дні нехта здае экзамэны экстэрнам. Дарэчы, некаторыя ліцэісты маюць вытрымаць ад 15 да 17 іспытаў. «Бацькі вельмі хваляваліся, што будуць заніжаць адзнакі на іспытах. Але ж адзнакі ў выпускнікоў на экстэрнах выходзяць значна вышэйшыя за ўнутрыліцэйскія, бо мы строга кіруемся міністэрскімі інструкцыямі і ў нас патрабаваньні стражэйшыя», — кажа Лявон Баршчэўскі.

Вынікі ж экстэрнаў на сёньня наступныя: 27 «дзясятак», 52 «дзявяткі», 29 «восемак», 15 «семак», 11 «шостак», 4 «пяцёркі», 2 «чацьвёркі» і 1 «тройка». Пры гэтым у Ліцэі сярэднім балам навучэнцаў была «сямёрка», радзей «васьмёрка».

Зусім ніякіх праблем няма з профільнымі прадметамі — гісторыяй, літаратурай, замежнай мовай, сусьветнай мастацкай культурай. Тут адзнакі рэдка бываюць ніжэйшымі за «восем». Зь нецярпеньнем чакаюць вынікаў цэнтралізаванага тэставаньня па беларускай мове. Сярод найлепшых вучняў Лявон Баршчэўскі называе Аксану Бязрукую, Мікалая Казака, Паўла Котава, Кацярыну Івановіч. Больш за ўсіх зьдзівіў Ільля Касьпяровіч, які здае іспыты ў Койданаўскім раёне і значна палепшыў свае ліцэйскія адзнакі.

Пасьля выпускных іспытаў для ліцэістаў ёсьць два варыянты для працягу адукацыі. Значная частка навучэнцаў выправіцца ва ўнівэрсытэты Чэхіі, Літвы, Германіі, Польшчы. Тым, хто вырашыў працягваць адукацыю ў Чэхіі, прыходзілася выбіраць ужо напрыканцы 2003 г. Такія ўмовы чэскага боку. Туды паедуць шэсьць або сем чалавек, у Літву — пяцёра, адзін ліцэіст выправіцца ў Нямеччыну. Ім ня прыйдзецца здаваць уступных іспытаў. Гэта ўжо вырашана на ўзроўні міністэрстваў адукацыі гэтых краінаў. Там жа для ліцэістаў прызначаны стыпэндыі. «Яны невялікія, але ж на жыцьцё і паездку дамоў хопіць», — кажа Лявон Баршчэўскі.

Перад паступленьнем у Чэхіі і Польшчы ліцэісты цэлы год будуць вывучаць мову. Асноўныя спэцыяльнасьці — гэта міжнародныя адносіны, гісторыя, псыхалёгія, сацыялёгія. Баршчэўскі лічыць адукацыю за мяжой добрым варыянтам. Праўда, ёсьць і іншыя думкі.

Гэтак, бацька сёлетняй выпускніцы Ліцэю філёзаф Ігар Бабкоў лічыць немэтазгодным адпраўляць дзяцей вучыцца за мяжу. «Гэта пяць гадоў самоты. Дый наагул адукацыя ў Літве ці Чэхіі больш правінцыйная, чым у Беларусі. Асабліва па сацыяльных навуках. І няма ніякае гарантыі, што яны вернуцца. Дый ці будуць яны запатрабаваныя пасьля вяртаньня тут?» Баршчэўскі кажа: «Нават калі хто й застанецца за мяжой — будуць прыносіць карысьць дыяспары. Справа знойдзецца заўжды».

Тая частка выпускнікоў, што абрала навучаньне ў Беларусі, таксама аддае перавагу спэцыяльнасьцям гуманітарнага профілю. Глеб Лабадзенка з 42-й групы перамог у конкурсе «Абітурыент журфаку БДУ» і паступіў туды без іспытаў. Ён задаволены, кажа: «Галоўнае — займацца любімай справай, каб не перашкаджалі».

Што датычыць будучыні самога Ліцэю, то вялікі спадзеў ускладаецца на цяперашнія трэці і другі курсы. Апошнія здаюць цяпер экзамэны за курс базавай школы і паказваюць вельмі высокія вынікі. Хаця пасьведчаньне аб базавай адукацыі ім не патрэбна. Другакурсьнікі будуць працягваць вучобу ў Ліцэі. На трэці курс робяць стаўку выкладчыкі. Лявон Баршчэўскі кажа, што для іх плянка больш высокая. «Яны моцныя ў сваіх ведах».

Вядзецца таксама набор на першы курс Ліцэю. Сярод тых, хто прайшоў тэсты і сумоўе, ужо залічана адзінаццаць чалавек. Ліцэй жыве.

Сяргей Дэнскі

Ліцэіст Зьміцер Занкевіч здаваў экстэрнам расейскую літаратуру — яму выпаў білет з Грыбаедавым і Салжаніцыным — па-беларуску, як і вучыў. Настаўнікі-русісты слухалі сьцяўшы зубы. І паставілі дзявятку.

Ліцэй выпрабаваў і многіх бацькоў: адзін зь іх пакінуў высокую пасаду ва ўрадзе Навіцкага, але ягоны сын давучыўся па-беларуску.

З 1 чэрвеня бацькі ліцэістаў пачалі штодзённае пікетаваньне забранага будынку на Кірава, 21.

Трынаццаты!

30 траўня ў Доме літаратара ў Менску адбыўся выпускны баль Беларускага гуманітарнага ліцэю. Гэта быў трынаццаты выпуск, адметны, акрамя парадкавага ліку, тым, што дзяўчат і хлопцаў у ім — пароўну.

Урачыстую частку адкрыў сваёй прамовай Уладзімер Колас. Выпускнікоў вітаў таксама Ніл Гілевіч.

Працяг на старонцы 4.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Ксеня Бязрукая — найлепшая выпускніца Ліцэю

«НН»: Спадарыня Ксеня, ці адчуваеце Вы сябе шчасьлівай, атрымаўшы дыплём?

К.Б.: Зьмяшаныя пачуцьці. Чатыры гады выкладацца з апошніх сілаў, пераадольваць вядомыя цяжкасьці апошняга году і ведаць пры гэтым, што ў гэтай краіне, пры гэтай уладзе нашы ліцэйскія адзнакі ня будуць афіцыйна прызнаныя, — ня дробнае прыніжэньне. Але станоўчае пераважае.

«НН»: У Вас асабіста, наколькі мне вядома, найлепшыя з усяго выпуску адзнакі.

К.Б.: Найважнейшыя для мяне ня ўласна адзнакі, а веды ды здольнасьць іх самастойна здабываць і падзацяганае ўжо паняцьце «ліцэйскі дух», якія я ды мае сябры займелі. Доказам таго, што ў Ліцэі выкладаюць якасна, можа быць тое, як лёгка, у параўнаньні з аднагодкамі, мы здаём экстэрнат у школах. Гэта пры тым, што школьныя і ліцэйскія праграмы не супадаюць.

«НН»: Цяпер, калі Ліцэй скончаны — што Вам найбольш падабаецца і што найбольш не падабаецца ў Ліцэі?

К.Б.: Першае, што мяне ўразіла, калі я ў свой час паступіла ў Ліцэй, — што выкладчыкі зьвяртаюцца да навучэнцаў на «вы». У звычайнай школе «Пятроў, устань!» У Ліцэі ў гэтым сэнсе зусім інакш. Дзень пры дні ў нас культывавалася павага да саміх сябе і да іншых людзей. Другое, вы можаце спраўдзіць у любога ліцэіста, — гэта асаблівае разуменьне намі слова «аўра». Пайшло, памойму, ад спн.Вольгі Дзядзюлі, выкладчыцы літаратуры, якая надавала гэтаму слову асаблівае значаньне. Гэта трэба адчуць — тую аўру, якая напаўняе аўдыторыю, калі ідуць заняткі альбо робяцца нейкія супольныя справы. Аўра еднасьці, аўра разуменьня, аўра супольнае мэты… Ты можаш не сябраваць з кімсьці ў групе і нават быць у сварцы зь сім-тым, але, як толькі пачынаецца лекцыя ці рэпэтыцыя ў нашым тэатры, гэтая станоўчая аўра апаноўвае сьвядомасьць, абуджае творчыя жаданьні. Стварэньне гэтае аўры — пытаньне прафэсійнасьці выкладчыка, а ў Ліцэі выкладчыкі ўнікальныя. Яшчэ з станоўчага — нязмушаная беларускасьць: што ў навуцы, што ў стасунках паміж навукай.

Непрыемнае ў Ліцэі для мяне праявілася, калі яго ліквідавалі як дзяржаўную ўстанову адукацыі, калі нам фактычна аб'явілі вайну. А на вайне як на вайне, і ўчарашні сябар, які не пайшоў з табою да перамогі, перастае быць сябрам. Гэта найцяжэй. Пазбаўленьне нас будынку, калі мы вымушаны сталі займацца ў розных пунктах ва ўсім горадзе, націск на бацькоў, адпаведна націск бацькоў на нас… Але большасьць з нас выстаялі.

«НН»: Некалькі чалавек з апошніх выпускнікоў не атрымалі ліцэйскіх дыплёмаў, хоць і адвучыліся ўвесь курс. Сярод «здраднікаў», як іх жартам называюць, такія знаёмыя імёны і прозьвішчы, як Ганна Бабкова, Вераніка Акудовіч, Глеб Лабадзенка. Яны вырашылі зэканоміць сілы і, праігнараваўшы іспыты ліцэйскія, здаваць экзамэны й тэсты толькі ў школах, куды запісаліся за месяц-два да сканчэньня навучальнага году. Чуў, што сярод астатніх ліцэістаў гэтых вынаходнікаў сёй-той нават пачаў байкатаваць. Як на Ваш погляд, гэтага канфлікту можна было пазьбегнуць?

К.Б.: Разважце самі: 13 іспытаў і тэставаньняў у Ліцэі і 14 — на экстэрнаце. Усё гэта за 40—50 дзён. Я магу зразумець тых, хто «саскочыў» у апошні момант, перайшоўшы ў савецкія школы і здаючы там толькі некалькі кантрольных і тры агульныя іспыты. Але менавіта ў апошні момант важна было праявіць волю, бо, калі б такі сыход стаў масавым, ён выклікаў бы паніку, і ўсё, за што мы змагаліся апошні год, магло б раптам скасавацца. Адміністрацыя Ліцэю досыць акуратна да іх паставілася: яны давучыліся, атрымалі даведкі аб праслуханых курсах, яны ганараваліся на выпускным балі. Да выказваньня ім непавагі, здаецца, не дайшло і сярод навучэнцаў. Разышліся калі не сябрамі, дык і ня ворагамі: усе ж беларусы, усе ж у адной нядолі.

«НН»: Дыплямаваныя сёлета ліцэісты ўжо ведаюць, у якой краіне працягнуць навучаньне. Ці не заганная сама сыстэма? Паступіў, адвучыўся, эміграваў. Беларусі гэта патрэбна?

К.Б.: Я ўжо столькі разоў адказвала на гэтае пытаньне, што выкладу свае аргумэнты па пунктах. Па-першае, мы не эмігруем. Вядома, як там у каго і што складзецца, не загадаеш, але асабіста я зьбіраюся адвучыцца й вярнуцца, каб жыць і працаваць тут. Я ня бачу сябе безь Беларусі. Па-другое, навучаньне ў больш разьвітых краінах і для сучаснага сьвету, і ў гістарычным аглядзе — гэта выключна станоўчая зьява. Згадайце таго ж Скарыну. Адукаваныя ў замежжы людзі, вяртаючыся на Бацькаўшчыну, нясуць з сабою новы ўзровень цывілізаванасьці, культуры, ведаў, тэхналёгіяў. Па-трэцяе, нават і не вяртаючыся, ствараюць на новым месцы дыяспары, робяцца праваднікамі ўплыву і інтарэсаў сваіх народаў. Вось таму прэтэнзіі наконт гэтага ня маюць грунту. Хто хоча зьехаць, зьедзе і безь Ліцэю. Зрэшты, ліцэістаў ніхто, акрамя ўладаў, калі яны за тое возьмуцца, не змушае вучыцца не ў сваёй краіне. Можна, здаўшы экстэрнат і маючы атэстат пра сярэднюю адукацыю, павесіць ліцэйскі дыплём на сьцяну і паступаць у нашы ВНУ.

Гутарыў Вадзім Карцаў

Трынаццаты!

Працяг са старонкі 3.

Пасол Злучаных Штатаў Джордж Крол звыкла выступаў на «прыгожай беларускай мове». Ягонае «Ньяхай жыв'е Бэларусь!» традыцыйна выклікае авацыю. Пасол Францыі Стэфан Шмялеўскі, працытаваўшы французкую «Монд» пра «Ліцэй, які не хацеў паміраць», сказаў, што нашы ліцэісты сваім прыкладам трываласьці ў свабодзе навучылі ўсю эўрапейскую моладзь. Генадзь Бураўкін успамінаў уласны выпускны 50 год таму, Уладзімер Арлоў падараваў усім выпускнікам свае кнігі «Адкуль наш род» і «Краіна Беларусь».

Ліцэйская завуч Ірына Сідарэнка была па-жаночаму сэнтымэнтальнаю. Ня менш хваляваўся, прамаўляючы, і стары Васіль Лявонаў — былы міністар сельскае гаспадаркі.

Вялі вечарыну ліцэісты зь вялікай тэлевізійнай будучыняй — Яўген Воўк і Наста Варачаева (сябры тэатральнай суполкі вучэльні). Ідэальныя строі, італскія манеры, дыкцыя старое школы. Ім нават удавалася ратаваць камэрнасьць і нязмушанасьць мерапрыемства (прысутнічалі, акрамя ліцэістаў, бацькі навучэнцаў; зь іхных складак, уласна, і ладзілася імпрэза), калі давала збоі апаратура.

Уручэньне выпускнікам дыплёмаў, а таксама падарункаў ад гасьцей і малодшых курсаў — апагей сходу. Сьлёзы, воплескі, гімны…

Афіцыйная частка сьвята плаўна перайшла ў неафіцыйную: быў паказаны польскі фільм «Партызанская школа», праз усяго яго праходзіць песьня выпускніцы Любы Аношкі «Я не хачу паміраць». Міні-канцэртам прагучалі іншыя песьні зь дзьвюх ужо выдадзеных ліцэйскіх плытак і трэцяе, якая толькі плянуецца (прадусар праектаў — Франак Вячорка). Павесяліў публіку паэт Андрэй Хадановіч, выканаўшы пад электрагітару сваю новую сьцёбную кампазыцыю «Дзяўчонка зь Беластоку» («…ня будзь ка мне жастока»).

На банкеце непазьбежнае дараваньне назьбіраных за гады крыўдаў і непаразуменьняў праходзіла пад баянныя пераборы ў выкананьні выкладчыка сацыяльных дысцыплін Аляксея Крукоўскага. Сустракаць сьвітаньне апошняга веснавога дня пад раніцу выбраліся самыя стойкія героі новае Беларусі.

Вацлаў Заякоць

ІЛЬЯ КАСЬЛЯРОВІЧ

42-я група з кляснай кіраўніцай Натальляй Русіной

БУДЗЬ СЯРОД ПЕРАМОЖЦАЎ

Абвяшчаецца конкурсны набор на ліцэйскія курсы для вучняў 8—11 клясаў сярэдніх школаў Менску й Менскага раёну. На курсах вывучаюцца дысцыпліны базавай і сярэдняй школы на ўзроўні, дастатковым для здачы экстэрнам экзамэнаў на атрыманьне пасьведчаньня аб базавай і атэстату аб сярэдняй адукацыі. Паглыблена, у індывідуальным парадку, вывучаюцца дысцыпліны гуманітарнага цыклу: беларуская і замежныя мовы, літаратура, гісторыя, геаграфія.

Навучаньне вядзецца выкладчыкамі колішняга Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа паводле праграмаў, распрацаваных у Ліцэі.

Распрацоўваюцца пляны стварэньня прыватнага Беларускага гуманітарнага ліцэю, у якім змогуць займацца навучэнцы ліцэйскіх курсаў, а таксама арганізацыі навучальнага працэсу за мяжой. Выпускнікі Ліцэю будуць мець магчымасьць атрыманьня бясплатных стыпэндыяў на навучаньне ва ўнівэрсытэтах эўрапейскіх краінаў.

Больш падрабязную інфармацыю пра ўмовы конкурсу можна атрымаць праз тэлефоны: 8-0296-29-59-03; 8-0296-39-27-15; 8-0296-33-48-59.

Курсы ладзіць індывідуальная прадпрымальніца Савіцкая У., пасьв. №690215877, выд. Менскім аблвыканкамам 4.01.2003.

ХРОНІКА РЭПРЭСІЙ І СУПРАЦІВУ

Кватэру экс-старшыні ГА «Грамадзянскі форум» **Івана Няверава** 18 траўня абшукалі невядомыя, якія назваліся супрацоўнікамі міліцыі. 20 траўня судзьдзя Салігорскага гарсуду Аксана Каляда аштрафавала кіраўніка філіі Незалежнага прафсаюзу прадпрымальнікаў **Аляксандра Цацуру** на 20 базавых велічыняў за «дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі». Ён мае абскарджваць вырак у Менскім абласным судзе, бо прафсаюз ёсьць філіяй зарэгістраванага Беларускага незалежнага прафсаюзу. 26 траўня Віцебскі абласны суд адмовіў **ГА «Верас»** у абскарджаньні папярэджаньня ўправы юстыцыі аблвыканкаму. 25 траўня міліцыянты Савецкага РУУС Менску затрымалі непаўналетніх **Максіма Громава** і **Кацярыну Клімко**, абвінавацілі іх у нанясеньні на сьцены надпісаў «Свабоду Марынічу!» і склалі пратаколы паводле арт.143 КаАП («Антысанітарыя»). 26 траўня на маладзёнаў завялі крымінальную справу паводле арт.341 («Апаганьваньне пабудоваў і псаваньне маёмасьці»). Паводле гэтага арт. ім пагражае зьняволеньне на 3 месяцы. 26 траўня пачаліся слуханьні па справе кіраўніка Гарадзенскай абласной філіі АГП **Уладзімера Чырвоненкі**, абвінавачанага паводле арт.166 КаАП («Непадпарадкаваньне супрацоўнікам міліцыі»). Адміністрацыйная камісія ў Горадні 26 траўня пастанавіла аштрафаваць галоўнага рэдактара газэты «День» **Міколу Маркевіча** на 1 б.в., а наклад газэты сканфіскаваць за публікацыю меркаваньня Валер'я Леванеўскага. Сакратар Берасьцейскага абкаму Партыі камуністаў **Мікалай Шыкеля** 27 траўня дастаў судовае папярэджаньне за распаўсюд улётак кааліцыі «5+». 28 траўня менская друкарня «Сьветач» скасавала кантракт з рэдакцыяй недзяржаўнай ваўкавыскай **«Местной газеты»**, друкаваць выданьне адмовілі ся таксама друкарні ў Менску, Баранавічах і Слоніме. 28 траўня віцебскія гарадзкія ўлады перашкодзілі дэпутатцы гарсавету **Вользе Карач** сустрэцца з выбарцамі. 27 траўня **АГП** накіравала зварот на імя генпракурора Беларусі Віктара Шэймана ў сувязі з паказам на тэлеканалах фільму «Дарога ў нікуды», у якім яны пабачылі паклёп на старшыню партыі Анатоля Лябедзьку. Інспэктар па апэратыўнай рабоце Слонімскай фінансавай міліцыі Ўладзімер Юрчак 20 траўня быў прыцягнуты да матэрыяльнай адказнасьці за неправамоцныя дзеяньні ў справе кіраўніка грамадзкага аб'яднаньня «Воля да разьвіцьця» **Міхася Варанца**. Прафактывіста з Горадні **Івана Романа** 28 траўня сьледзтва прызнала пацярпелым: 8 сакавіка яго зьбілі невядомыя, але крымінальную справу міліцыя распачала толькі праз 2 месяцы пасьля здарэньня. Калегія па грамадзянскіх справах Вярхоўнага суду 31 траўня разгледзела скаргу «Народнай волі» ў судзе супроць экс-кіраўніка БТ Ягора Рыбакова: **«Народная воля»** мусіць выплаціць Рыбакову за маральную шкоду 50 млн руб., журналістка **Марына Коктыш** і экс-вядоўца тэлевізіі **Элеанора Язерская** — па 1 млн руб. кожная. 31 траўня на беларуска-літоўскай мяжы быў затрыманы намесьнік кіраўніка «Маладога фронту» **Яўген Скочка**: у яго сканфіскавалі па 14 асобнікаў праграмы выбарчага блёку «Маладая Беларусь». У Барысаве 31 траўня за распаўсюд улётак «Свабоду Марынічу!» затрымалі актывістаў «Зубра» **Аляксандра Моніча**, **Аляксандра Кандрашова**, **Андрэя Быркова**, **Зьмітра Моніча**. 1 чэрвеня супрацоўнікі міліцыі, узброеныя аўтаматамі, спрабавалі бяз ордэру ўвайсьці ў кватэру актывісткі «Зубра» **Любові Кучынскай**: калі дзяўчына затэлефанавала адвакату, міліцыянты зьехалі.

АШ

З УСЁЙ КРАІНЫ

Полацак займеў карабель

29 траўня, сёлетні Дзень гораду, увайшоў у гісторыю Полацку некалькімі падзеямі. Упершыню гарадзкое сьвята адзначалася цэлы тыдзень: мерапрыемствы пачаліся яшчэ ў панядзелак 24 траўня — у бібліятэках прайшлі сустрэчы зь пісьменьнікамі, а ў цэнтральнай бібліятэцы адбылася гадзіна памяці Быкава. У аўторак у кінатэатры дэманстравалі дакумэнтальныя фільмы пра Полацак і «Настасьсю Слуцкую». У сераду прайшоў фэстываль графіці. Чацьвер — дзень тэатральны. Полацкі тэатар-студыя «Гармонія» паказаў сваю новую пастаноўку «Каралеўская карова». Рэжысэрка Валянціна Нагорная пачула шмат цёплых слоў ад полацкіх аматараў Мэльпамэны. У пятніцу палачане адкрылі новы, дзясяты музэй — дзіцячы. Месьціцца ён у старым прыгожым дамку на беразе Дзьвіны побач з паркам. Такі музэй зьявіўся ў Беларусі ўпершыню.

Таксама напярэдадні сьвята на чыгуначным вакзале зьявіўся фантан з двума бронзавымі журавамі, а побач з паркам адпачынку прышвартаваўся прагулачны карабель, які будзе абслугоўваць турыстаў.

Эпіцэнтар сьвяткаваньня 1142-годзьдзя гораду прыпаў на суботу. З раніцы ў мастацкай галерэі адбылося адкрыцьцё выставы «Іканапіс Беларусі XXI ст.», там і прагучала навіна: новым ганаровым грамадзянінам Полацку стаў мітрапаліт Філарэт.

У мастацкім музэі адбылася прэзэнтацыя карціны Івана Хруцкага «Партрэт невядомай з кошыкам у руках» з фондаў Нацыянальнага мастацкага музэю. Гэты вялікі майстар партрэту XIX ст. нарадіўся пад Полацкам, працяглы час жыў у сваім маёнтку Захарнічах, дзе й пахаваны. На жаль, у Полацку няма ніводнай карціны І.Хруцкага, таму палачане імкнуцца атрымаць працы майстра-земляка хаця б у часовае карыстаньне. У астатнім сьвята прайшло традыцыйна — з канцэртам і салютам на Пляцы Свабоды, з выступамі самадзейных артыстаў, з уручэньнем падарункаў найлепшым працаўнікам, з палётамі над горадам на паветраных шарах і верталёце, з горадам майстроў на праспэкце Маркса (дарэчы, сёлета палова гэтай вуліцы ад плошчы Скарыны ў бок супэрмаркету «Стралец» будзе перайменавана ў Пакроўскі бульвар).

Васіль Кроква, Полацак

У Барысаве нечуванае

Каторы ўжо тыдзень на рэчцы Бярэзіне стаіць карабель, якога ў нашым горадзе ня бачылі шмат гадоў. Судна прыплыло з Гомелю і ачышчае рэчышча.

Са Старога рынку прыбралі касэты

На рынку Старога гораду болей ужо ня купіш касэтаў і кампактаў. Прычынай стала адсутнасьць абавязковых умоў продажу. Цяпер гандлярам музычнай прадукцыяй трэба распаўсюджваць прадукцыю ў адмысловых павільёнах.

Зьміцер Панкавец, Кастрыца

Аварыя на пераезьдзе

Аўтафургон з расейскімі нумарамі рухаўся з боку Бярозы па старой дарозе Кобрынь—Стоўпцы. У вёсцы Няхачава, што на Івацэвіччыне, прыкладна ў 23 гадзіны кіроўца скіраваў яго на чыгуначны пераезд, каб трапіць на «алімпійку». Калі апынуўся на пуцях, у паўпрычэпе трэснуў тармазны шлянг і ўсе сыстэмы заклінавала. Кіроўца, зразумеўшы, што здарылася, узяў сыгнальны ліхтар і пабег насустрач цягніку Берасьце—Масква, які паказаўся ўдалечыні. На жаль, цудаў не бывае. Пазьбегнуць сутыкненьня не ўдалося. Лякаматыў урэзаўся ў паўпрычэп і ператварыў яго разам з грузам у кучу мэталалому, адкінуўшы ўбок на 76 мэтраў. Дзякуй Богу, абышлося без ахвяраў. Праз 56 хвілін усё было прыбрана з каляіны і рух аднавіўся.

Алесь Лаўранюк, Івацэвічы

Дом афіцэраў спусьцяць на рэйкі

Беларуская чыгунка зьбіраецца набыць у Баранавічах Дом афіцэраў, на ўтрыманьне якога ў арміі няма грошай.. На агледзіны гмаху 21 траўня прыяжджаў намесьнік начальніка Беларускай чыгункі Вячаслаў Абрамаў.

На падыходах да пакуль яшчэ афіцэрскага дому яго сустрэла купка вэтэранаў, якія выказалі сваю нязгоду з продажам. Афіцэры таксама супраць, аднак адкрыта выказвацца не адважваюцца. Як лічаць былыя і дзейныя вайскоўцы, вынікам выкупу ДА станецца спыненьне культурнай працы ў войску, бо ў часьцях няма заляў для заняткаў спортам і адпачынку, якія ёсьць у ДА. Абрамчык супакойваў вэтэранаў тым, што нічога яшчэ ня вырашана.

Клюб чыгуначнікаў у Баранавічах ёсьць, але ён, хаця й падноўлены, у некалькі разоў меншы за афіцэрскі. Акрамя таго, у Баранавічах маецца Музэй чыгункі зь вялізнай вулічнай выставай цягнікоў.

Электронны злодзей

Два электрыкі аднаго з прадпрыемстваў Баранавіч сабраліся неяк разам выпіць. Паддалі добра, і адзін сьцягнуў у другога плястыкавую картку, на якую якраз прыйшлі грошы — больш за мільён рублёў.

Пакуль гаспадар прачухваўся, злодзей пасьпеў зьняць з карткі ўсе грошы. Аднак яго вылічылі й схапілі міліцыянты. Сьледчыя прагледзелі на банкамаце сьпісы людзей, якія здымалі грошы непасрэдна да злодзея і пасьля яго. Сьведкі дакладна апісалі хітруна, балазе да банкамата каля прадпрыемства стаяла невялікая чарга і ўсе адзін аднаго добра ведаюць.

Руслан Равяка, Баранавічы

Родныя дзеці Андропава

«НН» прапануе вашай увазе ўрывак з новай кнігі публіцыста Аляксандра Фядуты «Аляксандар Лукашэнка. Ягоны час, ягоны народ».

PHOTO.BYMEDIA.NET

Лукашэнку пашанцавала. Пасьля 11 верасьня пра яго і ягоную «элегантную «перамогу» ўжо ніхто і не прыгадаў.

Лукашэнку не пашанцавала. Пасьля 11 верасьня ніхто ня быў у стане ацаніць зроблены ім дэманстратыўны крок — замену Мясьніковіча Латыпавым.

А ацаніць якраз было што.

Ва Ўрала Рамдракавіча Латыпава да гэтага часу склалася ўстойлівая рэпутацыя «лібэрала ад КДБ». Рэпутацыя грунтавалася на міце, укаранёным у масавую сьвядомасьць палітолягаў яшчэ на пачатку 80-х гадоў мінулага стагодзьдзя зь цяжкай рукі Юр'я Андропава, які змагаўся за поўную ўладу ў камуністычнай партыі і савецкай дзяржаве. Андропаву было прынцыпова істотна прадэманстраваць, што ёсьць сіла, якая супрацьстаіць лядачаму ідэалягічнаму таталітарызму a-la Суслаў і Леанід Брэжнеў. З генсека (а значыць, і з партыйнага апарату, які ён увасабляў) сьмяяліся на кухнях, і гэтаму сьмеху, што разьядаў лад зьсярэдзіны, своечасова проціпаставілі легенду пра чэкістаў — апошніх рамантыкаў рэвалюцыі, якія імкнуцца ачысьціць яе спадчыну ад моху і наліплых ракавінак (мох нарос вышэй ватэрлініі, ракавінкі наліплі ніжэй). Маўклівы Штырліц асацыяваўся з сапраўдным героем вайны, у той час як школьнікаў прымушалі зубрыць цытаты з «Малой Зямлі», зачытанай Вячаславам Ціханавым услых цалкам перад тэлекамэрай і ледзьве не па памяці. Разьведчык — разумны, інтэлігентны, які ўсё разумее (а паколькі экранны — то і без аніводнага матнага слова), — увайшоў у жыцьцё кожнай савецкай сям'і.

Разам з доўгім носам (сапраўды доўгім!) Ціханава туды ж увайшоў такой самай прыблізна даўжыні нос старшыні КДБ Ю.Андропава. Пра тое, што Юры Ўладзімеравіч піша вершы, ведала толькі вузкае кола маскоўскіх інтэлігентаў, але й гэтага было досыць. Партрэт рамантыка першых гадоў рэвалюцыі быў гатовы.

І да таго ж, як і належыць шэфу ўсіх разьведвальных службаў краіны, ён быў добра паінфармаваны ня толькі пра тое, што кепска ў нас, але й пра тое, што і наколькі добра ў іх. У іх — у сьвеце доўга і духмяна «загніваючага» капіталізму. Гэта значыць уяўляў сабе, што менавіта трэба зрабіць для рэстаўрацыі карціны «Купаньне чырвонага каня» ў адпаведнасьці зь першапачатковай задумай мастака. У гэта чамусьці верылі.

Але Андропаў кіраваў менш за два гады. Народ плакаў па ім як па нязбытнай мары пра жаданы «парадак». (Я сам плакаў у дзень ягонага пахаваньня: мне здавалася, што я вярнуся зь Ленінграду, дзе засьпелі мяне «дні ўсенароднага смутку», у родную Горадню, і п'яныя зноў будуць валяцца на вуліцах, як было пры «дарагім Леаніду Ільлічу».) Усе думалі, што менавіта «парадак» здольны ўваскрасіць да новага жыцьця ідэалы, якія патанулі ў п'янстве і пахаваныя пад кучай нічым не апраўданых узнагарод. Ня выйшла.

Таму, дарэчы, напаўінтэлігентную мяккасьць андропаўскага вылучэнца Гарбачова на ягоным (Андропава) фоне ўспрынялі як слабасьць і няведаньне таго, што трэба рабіць.

А што трэба рабіць? — «От Андропаў ведаў!», «От Сталіна на вас няма!»

Такую прафэсійную андропаўскую рэпутацыю атрымаў у спадчыну і Ўрал Латыпаў. Але адначасова да яе дадалася рэпутацыя лібэрала-заходніка. Прафэсар, доктар юрыдычных навук, гэткі ўсходні візыр (а Ўсход, як вядома, — штука тонкая), які не ўнікае кантактаў з рознакалібэрнымі апазыцыянэрамі. Дапушчаныя да яго незалежна ад маральнага аблічча журналістачкі зь незалежнай прэсы млелі.

Не, усё слушна. Доктар юрыдычных навук, прафэсар, паліглёт — гэта значыць інтэлігент. Як тут было не зачараваццa? І зачараваліся, і паверылі. Так, мабыць, трусы вераць кракадзілу, які плача ад шчасьлівай магчымасьці бачыць іх. Вось ён усхліпне яшчэ разок, паспрабуе абцерці кароткай лапай апошнюю сьлязу, якая па-здрадніцку набегла на вока, але не дацягнецца і, з апэтытам уздыхаючы, папаўзе на сьнеданьне. Да іх папаўзе, да трусоў…

Пакуль Латыпаў працаваў у МЗС, ён ня нёс адказнасьці за ўнутрыпалітычныя працэсы. Ён быў на сваім месцы — так, прынамсі, здавалася і яму, і большай частцы навакольных. І прэзыдэнт не рабіў тады асаблівых дурнот на міжнароднай арэне, і сам Урал рабіў цалкам прыстойнае ўражаньне на іншаземцаў. Тады на яго ўскладаліся вялікія надзеі — прычым з абодвух бакоў. Прыедуць з Захаду жанчыны — ён іх зачаруе, цьвёрда, з мармытком гаворачы на ўсіх іхніх мовах; куды там старамоднаму партыйнаму красунчыку Антановічу! А тут міністар новай фармацыі. Партшкол не заканчваў, спэцыяліст па міжнародным тэрарызьме, а не партыйны філёзаф. На гэта, відаць, і разьлічвалі, прызначаючы міністрам. Што ўсе пытаньні будуць вырашаны адным росчыркам пяра, нават не давядзецца больш працаваць — ні па пытаньні прызнаньня, ні па якіх-небудзь іншых пытаньнях.

Але Захад не паверыў. Там увогуле цяжка вераць прамармычаным словам палкоўнікаў запасу. Там чакаюць спраў. А спраў не было. Не было ніводнай сур'ёзнай саступкі — не, ня Захаду — таму, што прынята называць агульнадэмакратычнымі стандартамі. І бессэнсоўна было разыгрываць ролю міністра новай фармацыі. Унутрыпалітычныя праблемы заўсёды ўскладняюць работу замежнапалітычнага ведамства. Намаганьнямі беларускіх апазыцыянэраў і асабіста Аляксандра Лукашэнкі адбыўся няўклюдны байкот, апазыцыя канчаткова ператварылася ў нешта пазасыстэмнае, а Ўрал не захацеў умешвацца ў гэты працэс. Думаў, што як-небудзь само рассмокчацца? Не рассмакталася. Дэмакраты ня трапілі ні ў мясцовыя органы ўлады, ні ў парлямэнт. А ў дадатак да ўсяго здарыўся бунт сярод сілавікоў, што стаміліся ад Шэймана: Мацкевіч і Бажэлка, як сьцьвярджаюць асобныя сродкі і крыніцы інфармацыі, запатрабавалі адхіленьня дзяржсакратара Рады Бясьпекі ад пасады аж да арышту. У выніку адбыўся шэраг скандальных адставак, спалучаны з шэрагам такіх жа скандальных назначэньняў. І далёка ня самым скандальным было прызначэньне Ўрала Латыпава, які знаходзіўся ў момант усяго скандалу ў Вене, на месца, яшчэ ўчора занятае Віктарам Шэйманам. Аб прафэсару Латыпаву на некаторы час забыліся. Спатрэбіўся палкоўнік Латыпаў.

Так пачаўся для Ўрала Рамдракавіча сьнежань 2000 г. Яго выцягнулі з крэсла кіраўніка МЗС, у якое ён ужо пачаў быў урастаць, замяніўшы яго пустышкам Хвастовым (рэдкі выпадак, калі імя адпавядае сутнасьці чыноўніка). І пасадзілі ў крэсла дзяржсакратара. І ў гэтым, яшчэ ўчора самым уплывовым крэсьле краіны, ён адчуў сябе крайне няўтульна. Ён затузаўся. І гэта было зразумела.

У адрозьненьне ад палітрука Шэймана, Латыпаў быў кадравым кагэбістам. Ён ведаў цану той Сыстэме, якая ўзгадавала яго. Ён ведаў яе слабыя і моцныя бакі і прывык да таго, што людзі Сыстэмы гуляюць паводле правілаў. А чалавек, чыю прысутнасьць ён, здавалася, адчуваў уласным задам, амаль пяць год паклаў на барацьбу з гэтай Сыстэмай, на разбурэньне правілаў. Шэйман стварыў машыну пакарэньня спэцслужбаў і сілавых ведамстваў, жорсткай барацьбы зь імі, а ня проста кантролю. І вакол яго былі людзі, арыентаваныя на гэтую барацьбу, і сама структура ведамства, выседжанага Шэйманам, была таксама арыентавана на гэта. З Латыпавым усё было куды прасьцей. Латыпаў згадзіўся з тым, што ў ягонага новага ведамства засталося грознае імя, але было вырвана грознае джала. Ён задаволіўся пакінутым яму і засяродзіўся на тым, што лічыў правільным, — пачаў пісаць аналітычныя запіскі ў адным экзэмпляры. Строга ў адпаведнасьці з субардынацыяй. Запіскі клаліся на стол Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму. У шэрагу выпадкаў па іх прымаліся рашэньні. У шэрагу выпадкаў — станоўчыя. Гэта было правільна. У прафэсіяналізьме палкоўніка Латыпава Вярхоўны Галоўнакамандуючы не сумняваўся ні хвіліны.

Час, праўда, рабіўся ўсё больш і больш смутным. Набліжаліся прэзыдэнцкія выбары. І навасьпечаны дзяржсакратар Саўбезу цьвёрда памятаў, хто павінен быў іх выйграць. Менавіта ён прапанаваў тую мадэль выбарчай кампаніі, на якой урэшце і спыніўся Вярхоўны. Менавіта ён прапанаваў разыграць ролю не Івана Жахлівага, як, мабыць, палічыў бы за лепшае сам Вярхоўны, а добрага цара-бацюхны, гэткага новага Ўладзімера Краснае Сонейка. Няхай кляймуе яго апазыцыя, няхай брэшуць варожыя галасы, а ён езьдзіць сабе ад Пінску да Дзяржынску паўз Менск і спрабуе ашчасьлівіць выбаршчыка. Вось і зарплату ўжо паднялі да 100 даляраў. Вось ужо і газавую трубу правялі. Вось, нарэшце, пацалаваліся зь дзядулем, паднялі на руку дзяўчынку і сфатаграфаваліся на памяць з усімі сустрэчнымі старшынямі калгасаў. Пры гэтым надзвычай важна было ўтрымацца і нікога з сустрэчных не пасадзіць тут жа за краты. Хоць ве-е-ельмі карцела!

Сам Латыпаў, як выказалася адна журналістка, якая яму чамусьці сымпатызавала, «усяго толькі» адказваў за Менскую вобласьць. Адказваў, не сыходзячы ў водпуск — гэта значыць атрымліваючы заробак зь дзяржаўнай казны. І забясьпечваючы аднаго з прэтэндэнтаў аналітычнымі запіскамі ў адным экзэмпляры — за кошт падаткаплатнікаў. Менавіта яму, гэтаму адказнаму ва ўсіх адносінах дзяржаўнаму службоўцу, гэты прэтэндэнт быў абавязаны, несумненна, двума самымі ўдалымі хадамі сваёй кампаніі. Па-першае, Латыпаў прапанаваў на ролю сьцяга ў кампаніі па зборы подпісаў не Ўладзімера Канаплёва, а канаплёўскага пратэжэ Мікалая Чаргінца. Выбар быў цалкам удалы: генэрал-пісьменьнік «ад мянта» падыходзіў на ролю мабілізатара народных мас і пазбаўляў будучага прэзыдэнта ад гнятлівага пачуцьця абавязку былому сябру. Другі ж удалы ход быў зьвязаны з нэўтралізацыяй галоўнага ідэалягічнага куратара — Уладзімера Замяталіна. Прычым для гэтага Латыпаву нават не давялося напружвацца — ён толькі заручыўся падтрымкай памочніка прэзыдэнта (фактычна — галоўнага памочніка) Уладзімера Макея, якога ў свой час сам жа й вылучыў у Адміністрацыю з МЗС, і Ірыны Абельскай, пэрсанальнае доктаркі прэзыдэнта. І прэзыдэнт, прыслухаўшыся да голасу гэтых простых людзей, уразумеў, наколькі менавіта прагрэсіўнае беларускае чалавецтва ня любіць небаракі Замяталіна. (Чалавецтва — але не Латыпаў. Урал Рамдракавіч, крайне стурбаваны тым, каб не нажываць сабе лішніх непрыяцеляў, нават зрабіў ласку асабіста павіншаваць Уладзімера Пятровіча з днём нараджэньня — ужо пасьля ягонай адстаўкі.)

Праўда, гэта не азначае, што разам з Замяталіным сышла замяталіншчына.

Працяг будзе.

- Прафэсар, доктар юрыдычных навук, гэткі ўсходні візыр, які не ўнікае кантактаў з рознакалібэрнымі апазыцыянэрамі. Як тут было не зачараваццa? Так, мабыць, трусы вераць кракадзілу, які плача ад шчасьлівай магчымасьці бачыць іх.

Клеймаваньне зайчыка



Нацыянальны банк стварае лягатып для беларускага рубля

Змучаны баямі за асобны эмісійны цэнтар, Нацбанк вырашыў узяць тайм-аўт ды заняцца стварэньнем іміджу дагэтуль непахаванай нацыянальнай валюты. У краіне аб'яўлены конкурс (прыз — 50 базавых адзінак) на стварэньне графічнага знаку для беларускага рубля. Цяпер усе мы маем шанц на хвілінку зрабіцца крэатыўнікамі, дызайнэрамі ды капірайтэрамі. Каб натхніцца на творчасьць, пазнаёмцеся з кароткай гісторыяй стварэньня значкоў сусьветна вядомых валют.

Будучым стваральнікам знака для беларускага рубля варта мець на ўвазе сумны прыклад эўра. Увядзеньне новай валюты ў агульнаэўрапейскае абарачэньне 1 студзеня 2002 г. было для 86-гадовага дызайнэра Артура Айзэнмэнгера сьвятам са сьлязамі на вачах. Знак €, прэзэнтаваны як сьвежасьпечаны сымбаль, насамрэч быў прыдуманы Айзэнмэнгерам больш як чвэрць стагодзьдзя таму. Гэта было ягонае апошняе заданьне перад сыходам на пэнсію з пасады галоўнага графічнага дызайнэра Эўрапейскай эканамічнай супольнасьці, бабулі сучаснага Эўразьвязу. Паводле задумы мастака, € сымбалізаваў сабой ідэю аб'яднанай Эўропы — пра супольную валюту актыўная гаворка тады яшчэ не ішла. З офісу Айзэнмэнгера ў Люксэмбургу эскіз значка трапіў у Эўракамісію ў Бруселі, дзе амаль 20 год зьбіраў пыл у шафе.

У 1997 г. тагачасны прэзыдэнт Эўракамісіі Жак Сантэр прэзэнтаваў сьвету знак эўра, паведаміўшы, што яго толькі што стварыла цэлая каманда дызайнэраў. Нягледзячы на ўнёсак Айзэнмэнгера ў стварэньне блакітнага сьцяга Эўразьвязу ды эўрапейскага знака якасьці CE, ягонага аўтарства ў дачыненьні да знаку эўра так і не прызналі.

Так ці йначай, афіцыйнае тлумачэньне € наступнае: гэта сынтэз грэцкай літары «эпсылён», што сьведчыць пра глыбокую гісторыю Эўропы, і літары «Е» — першай у назьве кантынэнту. Паралельныя гарызантальныя лініі сымбалізуюць стабільнасьць эўрапейскай валюты. Дарэчы, сам Айзэнмэнгер сьцьвярджае, што знак — усяго толькі спалучэньне літараў «Е» і «С» (European Community — Эўрапейская супольнасьць).

У далёкім XVIII ст. гішпанская валюта пэса была, бадай, такой самай распаўсюджанай па ўсім сьвеце, як даляры цяпер. Гішпанскія грошы называлі таксама піястрамі. Вядома, друкарак ды ксэраксаў у тыя часы яшчэ ня вынайшлі, таму бухгальтарам ды справаводам даводзілася ўсе дакумэнты пісаць ад рукі. Каб не марнаваць часу ды паперы, назву валюты ў множным ліку пасьля лічбаў пісалі скарочана — «PS». Паспрабуйце накрэмзаць гэтае спалучэньне літараў разоў дзьвесьце, і вы заўважыце, што літары так і просяцца злучыцца ў адну. Зь цягам часу гэта ўвайшло ў звычай — літару «S» пачалі стала пісаць паверх «P». Паспрабуйце самі. Нічога не нагадвае? Калі ж ад літары «P» для зручнасьці пакінулі толькі дзьве вэртыкальныя рыскі ці ўвогуле адну, атрымаўся ўсім вядомы знак $. Упершыню ён сустракаецца ў паперах, пазначаных 1770 г.

У 1794 г. нованароджаныя Злучаныя Штаты вырашылі займець уласныя грошы. Першыя срэбныя манэты ЗША мелі супольную вагу з пэса. Каб не вынаходзіць ровара, іх вырашылі назваць далярамі (гішпанскі даляр — іншая, менш пашыраная мянушка пэса). Графічную адзнаку «зялёныя» таксама запазычылі ў гішпанскай валюты.

Ангельцы аніяк не жадаюць пакласьці сваю валюту на ахвярнік агульнаэўрапейскай гаспадаркі. Значок фунта стэрлінгаў — адзін з тых кавалачкаў нацыянальнай культуры, ад якога ня могуць адмовіцца зацятыя традыцыяналісты Туманнага Альбіёну. Графічны знак брытанскай валюты — гэта насамрэч літара «L», напісаная на старасьвецкі лад. Гарызантальная рыска паведамляе пра тое, што перад намі скарачэньне. Літара «L» узятая з лацінскага слова «libra», назвы старажытнарымскай меры вагі. (Вось, дарэчы, чаму брытанская мера вагі фунт скарочана пішацца «lb»).

Краіна Ўзыходзячага Сонца займела «ену» параўнальна нядаўна — падчас эпохі Мэйдзі («адукаванага кіраўніцтва»). У 1868 г. разам з затворніцкімі часамі фэадальнага сёгунату Такугавы ў нябыт адышла архаічная й неймаверна складаная грашовая сыстэма эпохі Эдо. На пасад Японіі ўзышоў 14-гадовы імпэратар Міцухіта, які і ўвёў новую валюту. Назва «ена» вядзе свой радавод ад кітайскіх грошай «юань» (у даслоўным перакладзе «народная валюта»). Графічная адзнака ены (двойчы перакрэсьленая літара «Y») склалася пазьней, сымбалізуючы сабою ўплыў эўрапейскай культуры. Гэткі сабе атрымаўся іерогліф на заходні лад.

Два месяцы таму пранеслася чутка, нібыта ўкраінцы ўзялі для грыўны знак даляра, напісаны наадварот — нібы ў люстэрку. Цалкам беспадстаўнымі плёткі не былі. 1 сакавіка Нацыянальны банк Украіны сапраўды ўвёў афіцыйны графічны знак нацыянальнай валюты — двойчы перакрэсьленую рукапісную літару «г» (паводле першай літары слова «грыўна»). Аднак абедзьве рыскі перасякаюць яе не вэртыкальна, як у знаку даляра, а гарызантальна, сымбалізуючы, як і ў выпадку з эўра, стабільнасьць нацыянальнай валюты. На конкурс, прызначаны Нацбанкам Украіны, было даслана больш за тысячу прапаноў. Чакаецца, што галоўную ролю ў папулярызацыі значка грыўны адыграюць прадавачкі крамаў, якія дабраахвотна будуць пазначаць на цэньніках знак украінскіх грошай.

Стварыўшы свой знак для рубля, мы апярэдзім расейцаў і створым такі капірайт, зь якім давядзецца лічыцца нават на гістарычнай радзіме «драўлянага».

Спробы стварыць графічны знак для рубля рабілі неаднойчы, але надта няўдала. У 1999 г. расейскі штотыднёвік «Коммерсант-деньги» правёў конкурс «Знак рубля». Атрымалі безьліч варыянтаў — ад стылізаванай літары «ять» да мадэрновага сярпа-молата. Нехта нават прапанаваў узяць за знак сьлед лапця Афанасія Нікіціна на беразе Індыйскага акіяну. Але да прапановаў «Коммерсанта» так ніхто й не прыслухаўся — Цэнтрабанк РФ заявіў, што ня бачыць сэнсу замяняць абрэвіятуру «РР» на незразумелы іерогліф.

На пачатку гэтага году Расейскі інстытут нацыялёгіі (займаецца дасьледаваньнем і абаронай расейскіх нацыянальных інтарэсаў), не праводзячы аніякіх конкурсаў, прапанаваў узяць за знак рубля літару «Ф». Яна ўяўляе сабою люстэркавую выяву дзьвюх літар Р (рубель Расеі), да таго ж контур літары падобны да расейскага гербу — дзьвюхгаловага арла. Прэса амаль узьвяла новы лягатып «на цараваньне», але Цэнтрабанк ізноў «зарубіў» графічны рубель. 19 сакавіка 2004 г. ён накіраваў у Інстытут нацыялёгіі афіцыйны ліст, падпісаны дырэктарам дэпартамэнту эмісійна-касавых апэрацыяў А.Юравым. Ён ветліва параіў навукоўцам не праяўляць залішняй ініцыятывы, бо Цэнтрабанк аніякіх конкурсаў праводзіць не зьбіраецца. «Што да канвэрсоўнасьці любой валюты, дык яна, як вядома, залежыць ад стану эканомікі краіны, а не ад знаку, што гэтую валюту выяўляе», — патлумачыў спадар Юраў у канцы ліста.

Як бачна, кіраўніцтва нашага Нацбанку з расейскімі калегамі нязгоднае. Будзем, аднак, спадзявацца, што маскоўскія нацыёлягі да нас не дабяруцца. Літара «Ф» была б надзвычай няўдалым знакам для беларускага рубля. Яна ў нашай мове чужаніца — нездарма словы зь літарай «Ф» спрэс запазычаньні.

Сумны досьвед Расеі сьведчыць пра тое, што прыдумваць графічнае ўвасабленьне рубля — цяжкая і няўдзячная справа. Вось каб стварыць лягатып талера… Адзінае, калі да гэтага дойдзе справа, дык галоўнае — ня скрасьці знаку мангольскай валюты, тугрыка.

Дарма сьмеяцеся. Манголія мае даўнюю традыцыю друкаваньня грошай, якая сягае ў часы Чынгісхана. Дарэчы, менавіта там у 1227 г. зьявіліся першыя на сьвеце папяровыя грошы. А сучасныя тугрыкі друкуе брытанская фірма «Tomas De La Company».

Алесь Кудрыцкі

«NC» зачынілі

Самы альтэрнатыўны сталічны клюб пераяжджае

Як нам паведаміў дырэктар клюбу Юры Баброўскі, іх «папрасілі» вызваліць памяшканьне на вул. Кастрычніцкая, 17, хоць тэрмін арэнды яшчэ ня скончыўся. Клюбнай ліцэнзіі таксама падаўжаць ня будуць. Рэч у тым, што гэты клюб знаходзіцца на тэрыторыі станкабудаўнічага заводу імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, дзе ня так даўно зьмянілася кіраўніцтва. Ранейшыя заводзкія кіраўнікі ставіліся больш лагодна да дзейнасьці «NC», але ж новым чыноўнікам аказалася недаспадобы вірлівае клюбнае жыцьцё ды публіка, што вечарамі зьбіраецца ля іх заводу. Кіраўніцтва станкабудаўнічага заводу нават скіравала заяву ў выканкам з просьбай разабрацца.

Намесьнік генэральнага дырэктара станкабудаўнічага заводу Аляксандар Галаванаў, на чый загад клюб зачыняюць, камэнтароў не дае.

Вечарыны ў «NC» пачыналіся, як правіла, у 19.00, калі працоўны дзень ужо скончаны, а жылых будынкаў у радыюсе некалькіх кілямэтраў няма, таму незразумела, чым мог замінаць адзін з самых папулярных менскіх клюбаў заводзкаму начальству. Ходзяць чуткі, што гэтае памяшканьне перакупіў нейкі бізнэсовец.

Апошнім часам у «NC» можна было пабачыць выступы «Нэйра-Дзюбелю», маладых камандаў, тутсама беларускія рокеры ладзілі ў сьнежні дабрачынную акцыю «Цукеркі — дзецям». Аднойчы «NC» ужо трапіў у зводкі навін: у студзені канцэрт гарадзенскіх каманд быў разагнаны АМАПам. Тады ўсіх, хто прыйшоў у клюб, затрымлівалі без тлумачэньня прычынаў, саджалі ў міліцэйскія аўтобусы й адвозілі ў Ленінскае РУУС.

Сп.Баброўскі аптымізму не губляе, кажа, што ўжо адшукаў памяшканьне ў іншым раёне гораду, дзе зьбіраецца адкрыць клюб такога ж фармату. «Адно толькі шкада, — кажа дырэктар «NC», — што такога выгоднага месца пазбавілі».

Сяргей Будкін

АРЦЁМ ЛЯВА

Нэагатычна-прамысловыя кварталы вуліцы Кастрычніцкай — самыя бязьлюдныя ў Менску. Апроч работнікаў станкабудаўнічага заводу там амаль ніхто ня ходзіць. Галасьлівыя наведнікі «NC» дадавалі вуліцы жывасьці.

Я хачу стаць прэзыдэнтам

Офіс прадпрымальніцкай арганізацыі «Пэрспэктыва» месьціцца ў дамку ў цэнтры Менску на вуліцы Захарава. Дом абляпілі шматлікія офісы невялікіх прыватных фірмачак (арэнда нерухомасьці, цырульня, рамонт, аўдыт), супрацоўнікі якіх ахвотна паказваюць мне офіс Анатоля Шумчанкі. Сустракае сам гаспадар, каржакаваты хлапец гадоў 30 у «хамелеоністых» акулярах. Зацемнены офіс, кветкі на стале. На сьцяне — партрэт самога спн.Анатоля. Гаспадар прапануе сесьці.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Анатоль Шумчанка: Пяць год Леванеўскі крычаў «Далоў прэзыдэнта!». Чым гэта дапамагло прадпрымальнікам?

«НН»: Вы не гаворыце па-беларуску?

Анатоль Шумчанка: Я ня ўмею добра гаварыць па-беларуску: у школе не было пастаяннага настаўніка. Таму ня буду крыўдзіць мовы кепскім гучаньнем.

«НН»: Гэта ў Менску так мову выкладалі?

А.Ш.: Так. Я нарадзіўся ў Менску 29 год таму, вырас і вучыўся таксама тут. У 15 год застаўся бяз бацькі. Ён быў перадавы рабочы, неаднаразова друкаваўся ў «Советской Белоруссии» на першых палосах, аднойчы атрымаў ганаровую грамату ЦК КПСС. Такі ён быў. А маці працавала на «Інтэграле».

«НН»: І як у такой камуністычнай сям'і мог вырасьці бізнэсовец?

А.Ш.: Я б сказаў «вырас бы, каб не…». Калі б я быў бізнэсовец, я б не займаўся той дзейнасьцю, якой цяпер займаюся. У нашай краіне няма бізнэсоўцаў увогуле, бо займацца бізнэсам азначае быць вольным у сваім мысьленьні й дзеяньнях. Ёсьць лёкаі, якія абслугоўваюць цяперашні рэжым зь яго дазволу. І ёсьць тыя, каму замінаюць разьвіцца ў бізнэсмэна. Людзі павінны выказваць свой пратэст супраць уціску праз парлямэнт і іншыя палітычныя структуры. Цяпер такой магчымасьці няма. Такім чынам, я хацеў стаць бізнэсмэнам, але цяперашні прэзыдэнт ня даў мне гэтага зрабіць. Мая задача — праз зьмену ўлады канстытуцыйным шляхам выправіць свой лёс і палепшыць жыцьцёвы стан. Прадпрымальнікі зьяўляюцца базай для гэтай зьмены.

«НН»: Мэта Вашага жыцьця — стаць бізнэсоўцам. Калі Вы ўжо не захацелі абслугоўваць рэжым у абмен на дазвол мець бізнэс, чаму Вы ня зьехалі туды, дзе бізнэс рабіць можна?

А.Ш.: Не хачу. Я сябе адчуваю цалкам камфортна толькі ў Беларусі. Ні пры якіх абставінах нікуды не паеду. Больш за тое, у мяне пастаўлена мэта і я зьбіраюся яе рэалізаваць, калі дасьць Бог. Праз 6 год я здолею ўпершыню заявіць пра свае пляны.

«НН»: Хочаце стаць нашым прэзыдэнтам?

А.Ш.: Абсалютна дакладна. Калі, натуральна, сытуацыя ня зьменіцца. Мною рухае імкненьне ўладкаваць уласнае жыцьцё, жыцьцё мае сям'і, пастаянную плынь фінансаў, мець свабоду выказваньняў і ўчынкаў. Калі б у мяне ўсё гэта было, я б не займаўся грамадзкай дзейнасьцю. Пакуль гэтага ня будзе, я буду працаваць на зьмены. Калі для гэтага трэба будзе стаць прэзыдэнтам, я стану. Я ж бачу, колькі разумных людзей навокал. Трэба, каб ім далі шанец рэалізаваць свае здольнасьці. Калі нехта зьявіцца да мяне — добра. Калі ж у 2006 г. ня выйдзе, то ў 2011-м, калі мне будзе 36 год, у нас усё ўдасца.

«НН»: А калі давядзецца сесьці на нары, а не на пасад? Ужо Леванеўскі там.

А.Ш.: За ўсё даводзіцца плаціць. Я ўжо там быў пяцёра сутак. Што зьменіцца, калі сяду яшчэ? Будзе мне там нядобра. Але ж арганізацыя ня спыніць дзейнасьці, бо я там не адзін. І гэта галоўная вартасьць «Пэрспэктывы». Што тычыцца Леванеўскага, я ня буду камэнтаваць ягонай справы. Некалі ягоныя людзі пісалі на мяне даносы ў міліцыю. Хачу сказаць: пакуль мы не адмовімся ад унутрыпалітычнай барацьбы, не навучымся скіроўваць фінансы на адну мэту, датуль у нас будзе Лукашэнка і сёньняшняя сытуацыя ды адсутнасьць прыгожых палітычных лідэраў. Хаця, на маю думку, ва ўмовах дыктатуры зьяўленьне яркіх палітыкаў немагчыма. Альбо магчыма на кароткі час. Гэтага матылька патушаць, як патушылі Ганчара.

«НН»: Тады Вы апісваеце зачараванае кола.

А.Ш.: Так. Пакуль ня будзе адзінага фронту, няма мэханізму рэалізацыі заплянаванага. Пяць год Леванеўскі крычаў «Далоў прэзыдэнта!». Чым гэта дапамагло прадпрымальнікам?

«НН»: А што магло б дапамагчы?

А.Ш.: Нядаўна выклікала мяне «Пяцёрка-плюс». Кажуць: давайце будзем каардынаваць нашыя дзеяньні. Я кажу: давайце. Я сказаў: каб «Пэрспэктыва» сёньня супрацоўнічала з дэпутацкімі групамі або «Пяцёркай-плюс», я стаўлю адну ўмову. Толькі праз умацаваньне структурных падразьдзяленьняў «Пэрспэктывы» магчыма яе супрацоўніцтва з рознымі структурамі. Чаму ж палітычная партыя павінна аказваць фінансавую й нефінансавую дапамогу арганізацыі для ўмацаваньня яе структур? Але ў тым і справа: калі мы адмаўляемся ад палітычнага суперніцтва, мы падтрымліваем у рэгіёне таго лідэра, які карыстаецца ўплывам. Калі ім зьяўляецца прадстаўнік палітычнай партыі альбо «Пэрспэктывы», на яго і павінна быць скіравана ўся фінансавая і інтэлектуальная дапамога. Тады гэта будзе адзіны фронт. А сёньня гэтага няма. Нядаўна я быў на мітынгу ў Салігорску, на які сабралася сотня прадпрымальнікаў і прыехала «Пяцёрка-плюс». Я кажу: хто тут з «Пэрспэктывы»? 70% паднялі рукі. Вось вам рэальная праца. Там ёсьць Аляксандар Цацура, які каардынуе працу ў Салігорску, карыстаецца аўтарытэтам сярод прадпрымальнікаў. Пад канец мітынгу выходзіць жанчына і кажа (а «Пяцёрка» тут жа стаіць — БНФ, АГП, камуністы): «Нам патрэбны свой чалавек у парлямэнце. Я прапаную стварыць ініцыятыўную групу па вылучэньні Аляксандра Цацуры кандыдатам у дэпутаты». Фішка ў чым: у Беларусі ў XXI ст. у прысутнасьці прадпрымальнікаў выходзіць прадпрымальніца й вылучае ў кандыдаты прадпрымальніка. У нармальнай краіне было б так: выходзіць прадпрымальнік і кажа: «Сябры! У нас ёсьць грошы. А вось тут стаяць пяць партыяў. І мы павінны вызначыцца, якую зь іх мы падтрымаем і прафінансуем». Але яны гэтага не сказалі. Для мяне гэта было адкрыцьцём і поўным абсурдам. Вазьміце Амэрыку: там бізнэсоўцы не ідуць у палітыку. А наймаюць палітыка для лабіяваньня сваіх інтарэсаў. Гэта паказьнік таго, што сьвядомасьць у нас памяшаная вельмі сур'ёзна. Так народ ставіцца да таго, што называецца палітычным рухам. І я задаю пытаньне: ці ёсьць у нас палітыкі і палітычны рух?

> У нармальнай краіне было б так: выходзіць прадпрымальнік і кажа: «Сябры! У нас ёсьць грошы. А вось тут стаяць пяць партыяў. І мы павінны вызначыцца, якую зь іх мы падтрымаем і прафінансуем». У нас выходзіць прадпрымальніца й вылучае ў кандыдаты прадпрымальніка.

«НН»: Вы ацэньваеце цяперашні стан краіны як ненармальны?

А.Ш.: Я ацэньваю яго як трагедыю і катастрофу.

«НН»: Які фармат Вашага ўдзелу ў выбарах?

А.Ш.: Выбараў ня будзе. Я задаю сабе пытаньне: удзельнічаць ці не? Палітык — гэта той, хто мае грошы, інтэлектуальны рэсурс, уплыў на грамадзтва, структуры і да т.п. І мае магчымасьць заявіць пра сябе ў поўнай меры. Калі я гэтага ня маю, я не палітык, я не іду на выбары, я не спрабую падняцца на прыступку, якая аб'ектыўна сёньня для мяне недасяжная. Сёньня сацыяльны слой прадпрымальнікаў склаўся. Гэта 200 тыс. чалавек. За 5—6 год я гэту сфэру абыду ўздоўж і ўпоперак ды здолею зрабіць нармальную палітычную кар'еру. А цяпер — да кагосьці далучыцца? Ды няма да каго, па вялікім рахунку. Яднаюцца з тым, у каго большыя сілы, рэсурсы й магчымасьці. А сёньня «Пэрспэктыва» — наймацнейшая з гэтага пункту гледжаньня. Акцыі прадпрымальнікаў самыя зладжаныя, масавыя й выніковыя. Прадпрымальнікі на сёньня — самы маналітны слой грамадзтва, да таго ж пакрыўджаны на ўлады. Небясьпека страты маёмасьці і фінансаў аб'ядноўвае прадпрымальнікаў. А што можа аб'яднаць сёньня, напрыклад, рабочых? Прадпрымальнікі — тыя людзі, на чыім прыкладзе рабочыя, дактары і настаўнікі могуць вучыцца адстойваць свае правы. У прадпрымальнікаў ёсьць досьвед барацьбы, які дазволіць ім устаць плячом да пляча зь лідэрамі бюджэтнікаў і рабочых. Іншае пытаньне — мы павінны захаваць лідэраў, каб гэтыя агмяні не загасілі. На шчасьце, гэтых агмянёў робіцца сярод прадпрымальнікаў усё болей. На месцы аднаго патушанага загараюцца два. Улада нас выхоўвае. Каб улада не выдавала такіх паскудных законаў, я б ня ведаў, як ім супраціўляцца.

«НН»: Можна зьнішчыць прадпрымальнікаў як клясу?

А.Ш.: Можна загнаць у цень. Ды без прадпрымальніцкіх грошай ці выжыве рэжым фінансава?

«НН»: Вы надзвычай ясна выклалі Вашу пазыцыю. Але, сп.Анатоль, каб стаць прэзыдэнтам цывілізаванай Беларусі, трэба быць ня проста лідэрам самай прасунутай групы, але агульнанацыянальным чалавекам. Трэба, напрыклад, вывучыць мову.

А.Ш.: Гэта так. Але якія праблемы з мовай? Я вывучу. Я вучуся ад Юрася Зянковіча і Алеся Міхалевіча. Пакуль ёсьць пераходны бар'ер, трэба пераступіць яго. З мовай, як і зь іншым, трэба быць прагматыкам. Мова ўвойдзе ў побыт, калі беларусам быць будзе ганарова і прэстыжна. Калі беларус паедзе за мяжу на машыне 2004 г. выпуску і сустрэнецца з расейцам, у якога машына 1994 г. выпуску. Але калі мы езьдзім на машыне 1985 г., а расеец — 2004 г., мы імкнёмся гаварыць па-расейску. Калі выкладчык атрымае на 100 даляраў у месяц болей за выкладаньне па-беларуску, астатнія умомант пяройдуць на мову.

«НН»: Што ж, цікавая ідэя. Вельмі Вам удзячная за гутарку.

А.Ш.: Няма за што! Заходзьце!

Кар. (пакуючы дыктафон): А што гэта Ваш партрэт на сьцяне вісіць? Культ асобы ў офісе?

А.Ш.: Не, каб супрацоўнікі ведалі: я заўжды тут! *(Сьмяецца.)* А вунь вісяць дакумэнты, якія сьведчаць пра нашы перамогі ў барацьбе за нашы правы.

Гутарыла Сьвятлана Курс

Латвійскі сындром

Віталь Тарас

Калега, зь якім мы разам запаўнялі анкеты ў латвійскай амбасадзе ў Менску, зрабіў для сябе геаграфічнае адкрыцьцё. Пагледзеўшы ўважліва на вялізную мапу Латвіі на сьцяне, ён раптам са зьдзіўленьнем вымавіў: а я й ня ведаў, што Беларусь мяжуе з Латвіяй!

Калегу апраўдвае хіба ягоны малады ўзрост. Бо для жыхароў савецкай Беларусі Рыга была найчасьцей першым пасьля Вільні «замежным» горадам, куды было даволі лёгка патрапіць. Дастаткова было купіць агульны білет на фірменны цягнік «Чайка».

Нават беларуская інтэлігенцыя зь яе нізкімі заробкамі магла калі-нікалі дазволіць сабе адпачынак на беразе Балтыйскага мора ў Юрмале (больш заможная рабочая кляса аддавала перавагу, зразумела, паўднёваму берагу Крыму ці Гаграм). А строгасьць, зь якой латышы сустракалі ўсходніх гасьцей дзе-небудзь у Сігулдзе альбо Дубултах, ня толькі не адпужвала савецкіх беларусаў, а наадварот, узмацняла ў іх адчуваньне далучанасьці да заходняе цывілізацыі. Менавіта так — строга й няўсьмешліва, але падкрэсьлена карэктна — паводзілі сябе пэрсанажы савецкіх фільмаў пра жыцьцё на Захадзе ў выкананьні балтыйскіх, найперш латыскіх кінааактораў.

Цяпер, калі Латвія зрабілася сапраўдным замежжам, паўнапраўнаю часткаю NATO й Эўразьвязу, патрапіць туды зь Беларусі ня так лёгка. Правілы ўезду ў гэтую краіну, бадай, найбольш строгія ў параўнаньні зь іншымі суседзямі. Напрыклад, у латвійскую візу абавязкова ўклейваюць фатакартку — гэта агульнае патрабаваньне і для беларусаў, і для расейцаў. Зрэшты, не відаць прычыны, зь якой Латвія павінна была б праводзіць адрозьненьне паміж гэтымі дзьвюма катэгорыямі грамадзянаў. Палітыка афіцыйнага Менску адносна Рыгі мала чым адрозьніваецца ад палітыкі Крамля. Афіцыйная пазыцыя беларускага кіраўніцтва ў гэтым пытаньні, праўда, наўрад ці сфармаваная — як і ў дачыненьні да многіх іншых міжнародных пытаньняў. Аднак цяперашні пасол Беларусі ў Латвіі сп.Ламкоў, які зьмяніў на гэтай пасадзе Міхаіла Марыніча, неяк у інтэрвію расейскамоўнай радыёстанцыі ў Рызе заявіў, што 40% насельніцтва Беларусі складаюць расейцы. Прадстаўнік беларускага МЗС у адказ на пытаньні цікаўных журналістаў прамармытаў быў нешта накшталт таго, што пасол «трохі памыліўся ў разьліках». Але ж афіцыйнага абвяржэньня лухты дагэтуль няма.

У кожным выпадку, звычайныя грамадзяне чэрпаюць інфармацыю пра замежныя краіны ня столькі з афіцыйных дакумэнтаў ці прамоў палітыкаў, але, як і за савецкім часам, з тэлебачаньня й газэтаў. Вось цікавы момант. Памочнік прэзыдэнта Пуціна сп.Прыходзька ў нядаўняй гутарцы зь беларускімі журналістамі паведаміў, што больш за 70% публікацыяў у «Советской Белоруссии» на расейскую тэматыку маюць нэгатыўны характар, астатнія — нэўтральны. Цяжка сказаць, ці вядзе якая-небудзь яшчэ краіна падобны падлік. Але згадаць хоць некалькі большменш цікавых публікацыяў пра Латвію ў беларускім друку за апошні час наўрад ці хто зможа.

З другога боку, апісаньне «масавых парушэньняў правоў чалавека» ды іншых «жахаў» у жыцьці Латвіі застаецца ўлюбёнай тэмай на БТ. І ў гэтым яно дакладна паўтарае расейскую прапаганду. Даходзіць да абсурду. Можна дапусьціць, што пратэсты расейскамоўных школьнікаў, якія ня хочуць вучыць латыскую мову, могуць хваляваць сэрцы расейцаў (хоць немагчыма ўявіць, каб расейскае міністэрства адукацыі, скажам, дазволіла б нейкай школе 40% прадметаў выкладаць на латыскай ці беларускай мове — нават у месцах кампактнага пражываньня беларусаў ці латышоў). Але гаварыць аб гэтым у краіне, дзе беларускіх школаў засталося па адной на кожны абласны цэнтар, — непрыхаваны цынізм. Дарэчы, што да расейскамоўных бацькоў тых самых школьнікаў, якія пратэстуюць на вуліцах, дык яны, згодна са статыстыкай, ня толькі не далучаюцца да гэтых пратэстаў, але ў пераважнай большасьці пасылаюць сваіх дзяцей вучыцца ў латыскія школы. Бо, як і ўсе нармальныя бацькі ва ўсім сьвеце, яны рупяцца пра будучыню сваіх дзяцей. І гэтая будучыня ў іх вачох неаддзельная ад краіны, у якой яны жывуць, — ад Латвіі.

Што ж да паведамленьняў пра масавую скупку насельніцтвам цукру й запалак у латвійскіх крамах у чаканьні падвышэньня цэнаў, дык у Рызе аповед пра «таварны голад» здольны выклікаць у найлепшым выпадку спачувальную ўсьмешку ці кпіны. Цэны на многія тавары ды паслугі тут даволі хутка растуць, як і ў Беларусі. Але каб з гэтае прычыны нехта пачаў скупляць цукар ці яшчэ нешта ў запас… На такога чалавека паглядзелі б проста як на вар'ята. Тое самае, дарэчы, было б у Варшаве, Парыжы ці Нью-Ёрку.

Зрэшты, абвяргаць прапаганду — занятак малапрадуктыўны. Цудоўна ведаючы гэта, у Латвіі на падобную дэзінфармацыю з боку суседзяў проста не зьвяртаюць увагі. Там жывуць сваім жыцьцём. Пытаньне ў тым, чаму гэтае нармальнае жыцьцё выклікае такую ярасную нянавісьць, амаль што гістэрыку ў расейскіх палітыкаў. І чаму менавіта Латвія абраная аб'ектам татальнай «крытыкі» ў расейскіх і беларускіх СМІ?

Што Латвія можа несьці ваенную пагрозу Расеі ці хаця б Беларусі — такога ня здольны ўявіць нават глыбока ненармальны чалавек. Памер, насамрэч, мае значэньне. Аляксандар Лукашэнка неяк зазначыў, прымаючы даверчыя лісты ад нігерыйскага пасла, што Беларусь — таксама як і Нігерыя — краіна хоць і невялікая, але пачуцьце ўласнае годнасьці мае. Між тым, размова тычылася аднае з самых буйных афрыканскіх краінаў, дзе жыве 115 мільёнаў чалавек. Цяжка сказаць — ці ў беларускага кіраўніка было скажонае ўяўленьне пра гэтую краіну, ці так ён успрымае ў глыбіні сваёй душы Беларусь? Дарэчы, у сьпісе «галоўных ворагаў прэсы» Лукашэнка тады займаў акурат трэцяе месца адразу за прэзыдэнтам Нігерыі Сані Абачам.

А латышы жартуюць на тэму памераў сваёй краіны. Даволі папулярны ролік з рэклямай латвійскага піва пабудаваны на тым, што тамтэйшыя навукоўцы зрабілі адкрыцьцё: з космасу нібыта відаць, што Латвія — самая вялікая краіна ў сьвеце! Самаіронія не перашкаджае жыхарам Латвіі быць апантанымі заўзятарамі ў спорце. Ці многа знойдзецца краінаў, акрамя Латвіі (калі ёсьць такія ўвогуле), якія б дамагліся значных посьпехаў адначасна і ў хакеі, і ў футболе? Латвія, прыгадайма, у адрозьненьне ад Расеі, выйшла ў фінал першынства Эўропы па футболе ў Партугаліі без «стыкавых» матчаў. Пры гэтым ніякага ажыятажу з будаўніцтвам лядовых палацаў ці футбольных манэжаў за кошт дзяржавы ў Латвіі не назіраецца.

Пры поглядзе на мапу Ўсходняй Эўропы міжволі ўзьнікаюць алюзіі наконт Давыда й Галіяфа. Што сукупны нацыянальны даход Расеі можна параўнаць з даходам Партугаліі — гэта расейцы яшчэ могуць перажыць. Але тое, што маленькая Латвія, якая некалі была часткай СССР, пачынае жыць заможна разам з усімі сваімі жыхарамі, у тым ліку расейскага паходжаньня, — гэтага ўжо ніяк нельга стрываць.

Зразумела, у Маскве цудоўна ўсьведамляюць, што цяпер не 1940-ы год на дварэ, а 2004-ы і што агрэсія супраць Латвіі была б такім самым самазабойчым актам, як і напад Латвіі на Расею. Тым ня менш, расейскае кіраўніцтва з дапамогай спэцслужбаў спрабуе разгайдаць сытуацыю ў гэтай краіне пад выглядам абароны інтарэсаў расейскамоўных грамадзянаў. Мабыць, некаторыя штабныя стратэгі разглядаюць яе ледзь не як «слабае зьвяно» ў сыстэме НАТО, з дапамогай якога нібыта можна шантажаваць Эўрапейскі Зьвяз і Захад у цэлым. Гэтым стратэгам, мабыць, не прыходзіць у голаў, што падобнымі спробамі яны толькі надаюць рашучасьці латыскім палітыкам дый простым грамадзянам ва ўмацаваньні незалежнасьці сваёй краіны й адначасна — інтэграцыі яе ў Эўропу. Больш за тое, маленькая Латвія часам гучна й адкрыта ўздымае голас у абарону дэмакратыі ў суседняй Беларусі. Прынамсі, яе пазыцыя ў шэрагу пытаньняў, зьвязаных з пэрспэктывай дэмакратыі ў Беларусі, апошнім часам выглядае нават больш прынцыповай, чым пазыцыя некаторых іншых краінаў, якія раней за Латвію вярнуліся на шлях дэмакратыі.

Ёсьць і яшчэ адна важная акалічнасьць, якая прыцягнула да Латвіі дадатковую ўвагу ва ўсходніх суседзяў. 3 чэрвеня спаўняецца 10 гадоў, як у Латвіі дзейнічае закон аб архівах КГБ. Латвія сталася адной зь першых краінаў былога СССР, дзе такі закон быў прыняты. З заканчэньнем тэрміну дзеяньня закону ўзьнікла патрэба ў яго пераглядзе й удасканаленьні. Менавіта дзеля таго, каб закон быў бездакорным з гледзішча эўрапейскага права ў цэлым і правоў чалавека ў прыватнасьці, прэзыдэнт Фрайбэрге вярнула яго ў парлямэнт на дапрацоўку. Але адразу ўсім было ясна — закон будзе прыняты і кожны грамадзянін Латвіі будзе мець права даведацца, якія матэрыялы на яго захоўваюцца ў архівах былога КГБ. А зь цягам часу дойдзе й да шырокай іх публікацыі. Як выразна кантрастуе гэты факт з тым, што адбываецца цяпер у Расеі і асабліва ў Беларусі.

Магчыма, тут палягае яшчэ адна прычына таго, што антылатвійская прапаганда становіцца ўсё больш агрэсіўнай і мэтанакіраванай. Справа ня толькі ў тым, што асобныя дакумэнты з архіваў здольныя нанесьці шкоду апэратыўнай дзейнасьці ФСБ—КГБ альбо падарваць маральны прэстыж «чэкістаў». Гэты «прэстыж» заплямлены назаўсёды і беззваротна іхнымі злачынствамі супраць чалавечнасьці. Справа ў тым, што чарговым разам падрываецца міт пра «імпэрыю КГБ», вера ва ўсёмагутнасьць спэцслужбаў. Чарговы раз прагучаў напамін, што напісанае застаецца, а сёньняшнія сьледчыя, якія зьбіраюць «кампрамат» на неляяльных рэжыму грамадзянаў, заўтра самі патрапяць у сьпіс нядобранадзейных асобаў.

У матэрыяльным пляне Латвія, напэўна, ня шмат чым можа дапамагчы Беларусі. У маральным пляне — значна больш. Некалі Латвія адна зь першых прызнала БНР. Само паняцьце «Народны фронт» прыйшло ў палітычны лексыкон Беларусі 90-х гадоў мінулага стагодзьдзя з Латвіі. Дэмакратыя там даўно вырасла з вопраткі «народнага фронту». Сёньня гэтая маленькая краіна ўсёй хадой свайго разьвіцьця нібы кідае выклік свайму гістарычнаму суседу — Балтакрывіі: не спазьнецеся.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Амбасадар Эганс Нэйманіс не зважае на антылатвійскую прапаганду БТ і трымаецца думкі, што «той стэрэатып, што беларусы й расейцы — адзін народ, не адпавядае рэчаіснасьці».

У 2003 г. аб'ём узаемнага таваразвароту між Беларусяй і Латвіяй павялічыўся да 240 млн даляраў ЗША. Беларусь экспартуе ў Латвію аўтамабільную і сельскагаспадарчую тэхніку, мінэральныя ўгнаеньні, нафтахімічную прадукцыю. Імпартуе — прадукты харчаваньня, электрапрыборы, машыны і мэханізмы.

Што беларусу даспадобы, для швэда — звычайная зьява

Карэспандэнт «НН» правёў тыдзень са швэдзкай моладзьдзю ў Менску і тыдзень у Швэцыі.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Швэды завіталі да нас па праграме студэнцкага абмену, што ладзілася прыватнай школай (аналяг нашага тэхнікуму) зь невялічкага Кронабэргу і Беларускай асацыяцыяй журналістаў. Матэрыяльны бок паездкі забясьпечваў Швэдзкі інстытут — установа, якая займаецца папулярызацыяй швэдзкай культуры й Швэцыі ў сьвеце і аналягаў якой у Беларусі, на жаль, няма.

Якія яны, гэтыя швэды?

Для скандынаўскіх студэнтаў візыт у Беларусь зьявіўся добрай магчымасьцю пабачыць на ўласныя вочы замежную дзяржаву ды пашырыць тым самым сьпіс краін, якія даводзілася наведваць. Беларускія студэнты, у сваю чаргу, дзякавалі лёсу за атрыманы шанец і чакалі незабыўных уражаньняў ад падарожжа.

Напярэдадні сустрэчы ўсё часьцей турбавала думка: «А якія яны, гэтыя швэды? Ці моладзь у Эўропе адрозьніваецца ад беларускіх студэнтаў? Калі так, дык наколькі? І за кошт чаго?»

Калі мы ўпершыню ўбачылі швэдзкіх студэнтаў, падалося, што перад вачыма паўсталі людзі зь іншай плянэты — ні больш ні менш. Настолькі незвычайна выглядалі яны ў нашым асяродзьдзі, настолькі абыякавым здавалася іхнае стаўленьне да навакольля. Аднак па меры знаёмства за вонкавай стрыманасьцю мы адкрылі сабе цікавых і таварыскіх хлапцоў і дзяўчат.

Швэды спыніліся ў гасьцініцы «Юбілейная», якую яны ўпарта менавалі «Люблянай». Будучыя журналісты акупавалі прывабныя мяккія канапы і зьдзіўлена пазіралі праз шкло на мурзатых будаўнікоў, што мітусіліся ля бязладзьдзя пліткі і асфальту, у грудах якой гублялася ня толькі прылеглая да гатэлю тэрыторыя, але і ўвесь праспэкт Машэрава. На лягічнае пытаньне «What is this?» прадбачлівыя беларускія студэнты падрыхтавалі ляканічны адказ наконт сусьветнай вайны, што нядаўна прайшла тут.

З цыгарэтай у роце і сьпевамі па жыцьці

Першым адкрыцьцём сталася тое, зь якой асалодай швэды смакталі беларускія цыгарэты. Чырвоны пачак з назвай, знаёмай кожнаму заўзятару тытуню, часьцяком мільгаў у руках моладзі. Скандынавы сапраўды ўпадабалі гэты адмысловы прадукт. Ня толькі празь ніжэйшую цану (алькаголь ды тытунь у Швэцыі надзвычай дарагі; за грошы, якія там каштуе пачак, у Беларусі можна купіць больш за два дзясяткі адпаведных аналягаў). Цыгарэты падаліся замежным гасьцям надта моцнымі, што іх надзвычай усьцешыла. Дадому кожны зь іх павёз паўнюткую сумку вырабаў Гарадзенскай тытунёвай. Незвычайны шопінг зьдзейсьнілі й тыя, хто да шкоднага занятку прыхільнасьці ня мае. Чырвоныя пачкі ў гэтым выпадку прызначаліся сябрам — як далікатэсны падарунак з далёкай краіны.

Швэдзкая моладзь увогуле разьняволеная і незакамплексаваная. Падлеткі практычна не зьвяртаюць увагі на вопратку: вызначальным тут зьяўляецца крытэр «прывабная», а не азначэньне «модная». Шыкоўнай адзежы ў іх не сустрэнеш.

А ў часе чаканьня ці то ў метро, ці то ў гатэлі, калі вакол не стае вольных месцаў, моладзь без аніякага сумневу ўладкоўваецца на падлозе, што ў нас выклікае зьдзіўленыя позіркі прахожых.

Увечары, калі мы гулялі ў цэнтры, швэды ўбачылі зь дзясятак дарожных рабочых у яркай аранжавай вопратцы, якія арганізавана, нібыта рота вайскоўцаў, рухаліся ў адпаведным кірунку.

— Orange people! Orange people! — узбуджана залямантавалі скандынавы і пачалі шчоўкаць аб'ектывамі фатакамэр.

Другога разу яны неспадзеўкі засьпявалі нацыянальную песьню проста пасярод вуліцы. Швэдзкай моладзі ўвогуле падабаецца гэты адмысловы занятак. Знаёмыя мэлёдыі яны зацягваюць пры любой нагодзе, чым зноў-такі прыцягваюць неўразумела-зьдзіўленыя позіркі беларусаў, для якіх сьпевы нацыянальных песень на вуліцы — не прымета добрага настрою, а вынік адпаведнага фізычнага стану.

Дарэчы, размаўляюць між сабой швэды толькі па-швэдзку. Нягледзячы на тое што другой мовай у краіне неафіцыйна зьяўляецца ангельская, карыстаюцца ёй швэды толькі ў гутарках зь іншаземцамі.

Калярытная эўрапейскасьць

Швэдзкая моладзь, узгадаваная ў эўрапейскай краіне, мае і адпаведныя ўласнаму сьветапогляду патрабаваньні. Што беларусу даспадобы, для швэда — звычайная зьява, якая нічым адметным са штодзённасьці не вылучаецца.

Буэль марыць стаць фатографам. На плячы ў яе — шыкоўная камэра, для набыцьця якой айчыннаму студэнту ня хопіць і ўсіх стыпэндый за пэрыяд навучаньня ў ВНУ. «Колькі ў цябе было ўласных выстаў ва ўнівэрсытэце?» — пытаецца яна. Пачуўшы адказ аб немагчымасьці такога мерапрыемства, зьдзіўлена паціскае плячыма: «Ды няўжо? А як тады заахвочваць студэнтаў да плённай працы? У нас сьцены бібліятэкі, сталовай і іншых памяшканьняў школы ўпрыгожваюць мастацкія і фатаграфічныя работы студэнтаў».

Галоўны прынцып, якога трымаюцца швэдзкія настаўнікі, — гэта ўдасканальваньне майстэрства навучэнцаў на практыцы. Мінімум тэорыі. Студэнты пішуць артыкулы, робяць стужкі, абмяркоўваюць надзённыя праблемы за «круглым сталом». Калі настаўнік Фрэдрык пачуў ад мяне пералік некаторых адмысловых дысцыплін, якія мы вывучаем ва ўнівэрсытэце на журфаку, ён аж схапіўся за галаву. А як мы знаходзім час для напісаньня артыкулаў? — спытаўся ён ды выказаў сумневы наконт прафэсійнай прыдатнасьці работнікаў Міністэрства адукацыі.

Іншасьць пабытовых звычак прыметна вылучае іншаземцаў зь людзкога натоўпу ў беларускай сталіцы. Гэта датычыць ня толькі паводзінаў ды выгляду, але й рэакцый на характэрныя праявы нашага жыцьця. Мы рухаліся па адной з цэнтральных вуліц, калі чацьвёра падлеткаў пачалі высьвятляць адносіны. Бойка працякала даволі жвава з выкарыстаньнем як прыдатных для гэтага працэсу частак цела, так і пэўных спэцыфічных прылад. Швэдзкая моладзь назірала за пэрформансам з-за кустоў, куды спалохана пахавалася адразу пасьля пачатку імправізаванай дзеі…

> На лягічнае пытаньне «What is this?» прадбачлівыя беларускія студэнты падрыхтавалі ляканічны адказ наконт сусьветнай вайны, што нядаўна прайшла тут.

А яшчэ швэды прагныя да новых ведаў. У таго ж Фрэдрыка я ўбачыў невялічкі нататнік, дзе зьмяшчаліся атрыманыя зьвесткі пра Беларусь: напрыклад, працяглы сьпіс айчынных музычных гуртоў на беларускай (!) мове, назваў якіх ня ведае і значная частка жыхароў нашае краіны.

Калі швэды знаходзяць нешта цікавае для сябе, яны ніколі не хаваюць уласных пачуцьцяў: захоплена ўсклікаюць, хітаюць галавой і зьдзіўлена пазіраюць табе ў вочы, дзякуючы за паведамленьне і ў той жа час прымушаючы далей працягваць пачатую думку. Пра гэткіх удзячных суразмоўцаў можна толькі марыць.

Гэты стогн у нас песьняй завецца

Швэдзкай моладзі не зразумець нашых праблем. Гэтая высновa ўсё больш трывала замацоўвалася з кожным днём двухбаковых зносінаў. Студэнты, якія зьявіліся зь іншасьвету, дзе ўзровень жыцьця рухаецца ў адваротным кірунку, дзе сьветапогляд грамадзян прадугледжвае абавязковае існаваньне пэўных маральных каштоўнасьцяў і самавызначэньня, ніяк не маглі ўцяміць, чаму айчынныя студэнты ВНУ не падарожнічаюць па замежных краінах, чаму ў Беларусі няма ўмоў для выказваньня ўласнага пункту гледжаньня ў СМІ, чаму значная частка беларусаў жыве ў галечы. Уявіць існаваньне аналягічных праблемаў на радзіме швэдам не ставала ні духу, ні фантазіі.

Мы вячэралі ў адной зь менскіх рэстарацыяў, калі Фрэдрык распачаў гаворку пра Курапаты, якія надоечы наведаў разам з студэнтамі. З жалем гаварыў пра крыжы, пра сьвятарны дух месца. І я недарэчы прыгадаў намер улад зруйнаваць кавалак лесу ды пабудаваць на яго тэрыторыі палацы для багацеяў. Недарэчы — бо Фрэдрык быў настолькі ўражаны пачутым, што ня мог болей есьці дэсэрт. Разам з Буэль яны пачалі даказваць немагчымасьць такое ідэі, а потым, калі пераканаліся ў адваротным, ускочылі зь месца, яшчэ хвілін дзесяць нешта жвава абмяркоўвалі на швэдзкай мове. Праз гадзіну ён падышоў да мяне і папрасіў дапамогі ў пошуку фактычнага матэрыялу, паведаміўшы, што зьбіраецца напісаць артыкул на гэтую тэму.

Кірунак мысьленьня швэдзкай моладзі зусім іншы, чым у нашай.

Пачуўшы на вуліцы з прымача жаласьлівыя сьпевы дзяўчыны, якая абяцала паляцець высока на неба за зоркай, швэды спыталі: «Is it a music?» А калі дазналіся, што песьня доўгі час займала першыя прыступкі ў гіт-парадах, гучна зарагаталі, нібы кажучы: «Як беларуская моладзь слухае гэткую лухту?»

Гэта быў апошні дзень швэдзкага візыту. Наперадзе нас чакаў няпросты шлях у далёкую скандынаўскую краіну.

Сяржук Гусачэнка

Працяг будзе.

Шчасьлівейшы за сваіх герояў

Справа Пашкевіча: вынікі

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Гісторыя з доктарскай дысэртацыяй старшыні Саюзу пісьменьнікаў Алеся Пашкевіча збаламуціла ціхае асяродзьдзе ўнівэрсытэцкае навукі. Яна таксама стала тэстам на «эфэктыўнасьць» працы перапарадкаванага прэзыдэнту ВАКу.

Кандыдат філялягічных навук, выкладчык філфаку БДУ Алесь Пашкевіч абараніў дысэртацыю «Канцэпцыя нацыянальнага быцьця ў прозе беларускага замежжа XX ст.» на філфаку Белдзяржунівэрсытэту яшчэ ў лістападзе 2002 г. Абароненая праца колькі месяцаў бяз руху праляжала ў Вышэйшай атэстацыйнай камісіі, якая зацьвярджае ўсе навуковыя работы. Зрэшты, такі быў лёс ня толькі Пашкевічавай доктарскай: некалькі месяцаў ВАК наагул не разглядаў аніякіх дысэртацыяў. Толькі ў сярэдзіне 2003 г. атэстацыйная камісія, ператасаваная і падпарадкаваная прэзыдэнту, зноў узялася за працу. Экспэртная рада ВАКу, якая складалася зь літаратуразнаўцаў, двойчы пасылала дысэртацыю на закрытую («чорную») рэцэнзію й двойчы атрымлівала дадатны водгук. Прычым другі раз, паводле зьвестак «НН», рэцэнзэнтам быў дасьледчык расейскай літаратуры.

Ціск апазыцыянэраў на ўладу

Ужо сам факт, што працу адправілі на другую «чорную» рэцэнзію, прычым неспэцыялісту ў галіне, сьведчыў пра тое, што з Алесем Пашкевічам вядуць нейкую незразумелую гульню. І сапраўды, калі ВАК ня здужаў даць ганьбы Пашкевічавай працы рукамі навукоўцаў, зьявіўся ліст... пяці вэтэранаў! Прычым накіраваны ён быў адначасова ў Адміністрацыю прэзыдэнта, міністру адукацыі й старшыню ВАК Анатолю Рубінаву. Свае імёны пад ім паставілі генэрал-маёр у адстаўцы Аляксей Быкаў; палкоўнік, Герой Савецкага Саюзу, доктар гістарычных навук Аляксандар Філімонаў; палкоўнік у адстаўцы, Герой Савецкага Саюзу Іван Кустаў; палкоўнік у адстаўцы, Герой Савецкага Саюзу Віктар Лівенцаў (гонарам і духоўнай элітай назваў А.Лукашэнка вэтэранаў вайны, абвяшчаючы ў аўторак падзяку прэзыдэнта Герою Савецкага Саюзу Віктару Лівенцаву); Герой Савецкага Саюзу, доктар гістарычных навук Дзьмітры Жмуроўскі.

«Дысэртацыю Пашкевіча А.А. мы разглядаем як імкненьне беларускіх апазыцыянэраў ад навукі аказаць ціск на ўладу з мэтай прымусіць ВАК Беларусі прызнаць навуковай, а значыць, і правільнай антыдзяржаўную, антыпатрыятычную, нацыянал-здрадніцкую ідэалёгію фашыстоўскіх халуёў — пісьменьнікаў і паэтаў замежжа. Мы просім вас абараніць ідэалёгію сучаснай беларускай дзяржавы, абараніць беларускую навуку ад перавёртышаў, кар'ерыстаў і палітычных прайдзісьветаў», — пісалі яны ў сваім звароце.

Ліст зьявіўся акурат тады, калі далей адкладваць з зацьвярджэньнем дысэртацыі не выпадала. Цікава, што ніводзін з аўтараў ліста на абароне Пашкевічам дысэртацыі ня быў. Між тым, імёны некаторых з гэтых герояў даўно вядомыя ня толькі гісторыкам вайны, але й гісторыкам мірнага часу. Гэтак, В.Лівенцаў, які заслужыў падзяку прэзыдэнтуры, як успамінае Валянцін Тарас, у свой час удзельнічаў у цкаваньні Васіля Быкава за аповесьць «Мёртвым не баліць».

Рэцэнзія як прысуд

Старшыня Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Анатоль Рубінаў прапанаваў Пашкевічу забраць работу, «паправіць» і пераабараніць. Прэзыдыюм ВАКу ўстрымаўся ад залічэньня працы, нават не выносячы яе на галасаваньне. А паколькі сярод літаратуразнаўцаў аматараў збэсьціць калегу не знайшлося, кіраўніцтва ВАКу паслала літаратурную працу на рэцэнзію... у Інстытут гісторыі. Ці меў ВАК такое права? «Пасылаць не забаронена, але я ж пісаў не па гісторыі! Работу па матэматыцы мэдыкам не пасылаюць!» — абураецца А.Пашкевіч. Свайго малодшага калегу падтрымлівае Міхась Тычына: «Гэта непрафэсіяналізм! Мы ж ня лезем у гісторыю, не дыктуем ім». Дырэктар Інстытуту гісторыі Мікалай Сташкевіч, аднак, лічыць такую сытуацыю абсалютна нармальнай: «Правільна, што гісторыкі выказаліся: ня трэба адраджаць калябарацыянізм!»

Закрытая гістарычная рэцэнзія была разгромнай. Стыль невядомага аўтара нагадваў прысуды 30-х гадоў: «Усьлед за аўтарамі дысэртант дэманструе лютую нянавісьць да ўсяго савецкага, малюе савецкую рэчаіснасьць толькі чорнымі фарбамі». «Пад раздачу» невядомага (але пазнавальнага) рэцэнзэнта патрапілі ўсе, нават героі паўстаньня 1863—1864 г., якое не было «аніякім беларускім». Высновы экспэрта нагадваюць закадравую тэкстоўку славутых фільмаў БТ: «Не таму эмігравалі пісьменьнікі, што, як піша дысэртант на с.13, «ня мелі ўмоў для жыцьця і дзейнасьці», а таму што баяліся адказнасьці за зьдзейсьненыя злачынствы супраць сваёй краіны і свайго народу. Яны не былі «літаратарамі-выгнанцамі», а ганебнымі ўцекачамі».

Паводле вынікаў рэцэнзіі ў красавіку адбылося пасяджэньне экспэртнай рады гісторыкаў (пазьней у дакумэнтах яна ўжо фігуравала як «камісія, створаная для разгляду звароту вэтэранаў»). Высновы рады-камісіі былі адназначныя: «Прыведзеныя ў звароце вэтэранаў вялікай айчыннай вайны прэтэнзіі да аўтарэфэрату дысэртацыі зьяўляюцца абгрунтаванымі». 28 красавіка Прэзыдыюм ВАКу прагаласаваў супраць залічэньня Пашкевічавай дысэртацыі.

Цьвёрда трымаўся філфак...

Так была «зарэзаная» праца Пашкевіча.

Да гонару калектыву філфаку, ён ня стаў выслужвацца, нават калі лёс дысэртацыі быў вызначаны. У 2002 г. на абароне Пашкевічавай дысэртацыі «за» галасавалі ўсе прысутныя, акрамя аднаго, які ўстрымаўся (сапсаваў свой бюлетэнь). І хоць на філфаку ходзіць пагалоска, што асобныя сябры Вучонае рады цяпер канкуруюць за права быць тым адным, хто ўстрымаўся, — зусім як іншы пэрсанаж прыпісвае сабе голас Ціхіні, пададзены супраць Белавескіх пагадненьняў, — усё ж Вучоная рада адмовілася адклікаць сваё рашэньне. Гэта ў цяперашніх умовах праява не абы-якой грамадзянскай мужнасьці. І даносам на імя рэктара ўнівэрсытэту Васіля Стражава на факультэце ходу пакуль не давалі. Натуральна, пасьля правалу дысэртацыі становішча А.Пашкевіча на факультэце акрэсьліваюць як «няпэўнае», але гаворкі пра звальненьне старшыні Саюзу пісьменьнікаў не ідзе.

Затое, як сьведчыць справа, на гуманітарных спэцыяльнасьцях Акадэміі навук па-ранейшаму лёгка знайсьці выканаўцаў палітычных замоваў. ВАК жа, які зь мінулага году падпарадкоўваецца беспасярэдне прэзыдэнту, выявіўся цяжкой артылерыяй, здатнай правесьці адстрэл «нячэсных» навукоўцаў. Пасьля выпадку з старшынём Саюзу пісьменьнікаў гуманітарнікам давядзецца дзесяць разоў падумаць, перш чым абраць рызыкоўную тэму.

Прафэсар Вячаслаў Рагойша, які быў старшынём экспэртнае рады ВАК на момант разгляду Пашкевічавай «Канцэпцыі», не сумняецца ў высновах літаратуразнаўцаў: «Я з адказнасьцю кажу, што дысэртацыя напісана на высокім узроўні і вартая таго, каб быць залічанай. Два гады таму наш ВАК зацьвердзіў дысэртацыю па творчасьці расейскага пісьменьніка Дзьмітрыя Мережкоўскага, які ўсю вайну правёў з Мусаліні і ўслаўляў яго».

Брацца за творчасьць пісьменьнікаў, што супрацоўнічалі з нацыстамі ў часе вайны, — прадпрыемства рызыкоўнае. Аднак Сэліна ці Гамсуна французы ці нарвэжцы вывучаюць — як частку літаратурнае спадчыны, а не для таго каб салідарызавацца зь іхнымі палітычнымі поглядамі. І гісторык — аўтар рэцэнзіі, і падпісанты пісьма не гавораць адкрыта пра існаваньне закрытых для навукоўца тэмаў. Нягледзячы на ўсе шараханьні дзяржаўнага курсу ў апошнія 10 гадоў, тэм дасьледаваньняў навукоўцам яшчэ ніхто не навязваў. Няма гэтага й цяпер.

Многія сябры Саюзу пісьменьнікаў адкрыта гавораць, што валтузьня вакол дысэртацыі — усяго толькі добра арганізаваная помста А.Пашкевічу за тое, што ён не паддаўся ціску на СП і не зрабіў з арганізацыі частку ідэалягічнага апарату дзяржавы, што ўдзельнічаў у пахаваньні Быкава, якое адбылося ня так, як хацелася б бонзам з высокіх кабінэтаў. Сам пісьменьнік-навуковец прыгадвае словы, сказаныя яму ў вечар абраньнем на зьезьдзе СП: не забывайцеся, што вам «абараняцца».

У А.Пашкевіча сёньня ёсьць прапановы абараняцца ў Кіеве і Маскве (у ІСЛІ — Інстытуце сусьветнай літаратуры). Але ён кажа, што навуковыя званьні беларускі літаратуразнавец павінен атрымліваць на радзіме. Не трымае Пашкевіч крыўды й на вэтэранаў: «Ліст пісалі зусім іншыя людзі. Тыя, хто падпісаў, добра нават не разьбіраюцца, хто такая Арсеньнева, а хто — Пётра Сыч…»

Сыстэма спрабавала А.Пашкевіча зламаць, але ён аказаўся шчасьлівейшым за аб'ектаў свайго навуковага зацікаўленьня. Тых якраз нямецкая таталітарная машына завабіла і маральна скрышыла. Ці то сучасны мэханізм горш адладжаны, ці то А.Пашкевіч дужэйшы.

Аркадзь Шанскі

За крок ад мары

Румын выбраў сэрбаў

Менск. Чацьвер. Спартовая кавярня. Да пачатку футболу — амаль цэлая гадзіна, а вольных месцаў насупраць пяцімэтровага тэлеэкрану ўжо не знайсьці. У паветры разьлітае чаканьне, на століках — піва сярод спартовай прэсы. Атмасфэра распальваецца. Справа група размаляваных у чырвона-зялёныя колеры падлеткаў горача абмяркоўвае шанцы абедзьвюх камандаў: «Ды што там гэтыя макароньнікі, у нас на іх на ўсіх ёсьць Глеб!» Зь левага боку — станісты мужчына сярэдніх гадоў нешта тлумачыць свайму сыну гадоў дзесяці. Абодва ў футболках нацыянальнай каманды… Стартавы сьвісток чэскага арбітра Зламала на «Рурштадыёне» ў нямецкім Бохуме выклікае ў залі буру авацыяў. Пачалося! Да тэлеэкранаў уласных тэлевізараў прыліпла пераважная большасьць мужчынскага насельніцтва краіны. Футбол — наша прадуха. Перамогі беларускіх футбалістаў — сапраўднае сьвята, якое бывае толькі зрэдку. Але зь яго надыходам усе жыцьцёвыя клопаты і праблемы адыходзяць на другі плян.

…Гэтай падзеі мы чакалі доўгія дзесяць гадоў. Роўна столькі, колькі ў Беларусі існуе сувэрэнны футбол. Беларускія футбольныя заўзятары ўжо прызвычаіліся да таго, што наша моладзь выступае значна лепей за сваіх дарослых калегаў. За пяць адборачных цыклаў да чэмпіянатаў сьвету і Эўропы (з 1994 да 2003 г.) моладзевая зборная атрымала амаль у тры разы болей перамог, чым нацыянальная. Але ніколі беларускім хлопцам не выпадала пераадолець кваліфікацыйны раўнд. Нават той супэрталенавітай камандзе першага скліканьня, гонар якой на пачатку 90-х баранілі нязьменныя лідэры цяперашняй «нацыяналкі» — «кіеўцы» Бялькевіч з Хацкевічам, Штанюк, Кульчы…

Выпрабаваньне фаварытам

Сёлетні сэзон каманда Пунтуса пачала з таварыскага турніру на Мальце. Параза ад славакаў (0:2) і перамога над альбанцамі (2:1) — ня болей чым працоўныя моманты, неблагая магчымасьць для абкаткі. Апошняй жа перадчэмпіянатаўскай рэпэтыцыяй стала ўпэўненая хатняя перамога над другім фіналістам кантынэнтальнага першынства Швайцарыяй — 4:0. Нягледзячы на гэта, сярод фаварытаў эўрапершынства Беларусь ня значылася, хутчэй наадварот. Аб гэтым сьведчылі і вынікі маштабнага галасаваньня, наладжанага на афіцыйным вэб-сайце Эўрапейскага Зьвязу футбольных асацыяцыяў (УЭФА): толькі 4% (меней — у Швэцыі ды Швайцарыі) заўзятараў бачылі беларусаў патэнцыйнымі пераможцамі.

Затое галоўны трэнэр нашай каманды Юры Пунтус паставіў максымальную задачу — трапіць у лік трох наймацнейшых, што ў сваю чаргу дазволіць яго падначаленым выступіць на Алімпіядзе. Такім чынам, беларускія майстры скуранога мяча выправіліся на фінал у выгоднай ролі «чорнага коніка». Праўда, не абышлося бяз страт. Яшчэ да паездкі ў Нямеччыну за бортам каманды праз траўмы засталіся гульцы асновы Алег Попель і Віталь Надзіеўскі. А ўжо на самім турніры звышсур'ёзныя пашкоджаньні атрымалі Арцём Канцавы і Павал Шмігера.

Першая гульня на чэмпіянаце мусіла стаць сапраўдным выпрабаваньнем для беларусаў, бо экзамэнаваць іх выпала чатырохразоваму чэмпіёну Эўропы — італьянцам. Аб моцы гэтай каманды можна было меркаваць з аднаго толькі факту: усе 22 гульцы ў яе складзе выступаюць за клюбы наймацнейшай у сьвеце італьянскай футбольнай лігі, а яе лідэр — 21-гадовы Альбэрта Джылярдзіна з «Пармы» — стаўся там сёлета найлепшым бамбардзірам.

Ужо пачатак сустрэчы выявіў агрэсіўную атакавальную манеру падначаленых Юрыя Пунтуса: якое-колечы нэрваваньне і боязь перад грандамі адсутнічала цалкам. А ўжо на шостай хвіліне падачу з вугла ўсюдыіснага «флянга» Цімафея Калачова ўдарам галавой замкнуў абаронца Раман Кірэнкін. Калі гадзіньнік чэскага арбітра адлічваў перадапошнюю хвіліну першай паловы сустрэчы, паўабаронца нямецкага «Штутгарту» Аляксандар Глеб завяршыў свой каронны слаламны праход эфэктным стрэлам з 25 мэтраў. Італьянцы зломленыя псыхалягічна. Усё, што ім удалося ў другім тайме, — толькі скараціць разрыў.

Румынскі кат

«Калі мы здолеем перамагчы ў другой гульні харватаў, тады дарога ў паўфінал будзе для нас адкрытая і мы здолеем дасягнуць сваёй мэты», — адзначыў пасьля гістарычнай перамогі Юры Пунтус. Аднак другая сустрэча выйшла куды больш складанай за першую. Пакінуўшы на лаўцы запасных цэлы шэраг тых, хто ўдала дзейнічаў супроць апэнінцаў (Калачоў, Карніленка, Тарасенка, В.Глеб), Пунтус упусьціў сьвежую кроў (Сашчэка, Цыгалка, Бегаскі, Сокал). Гульня, аднак, не заладзіліся ад самага пачатку, і пры канцы першага тайму супернікі «расьпячаталі» вароты Юр'я Жаўнова. Здавалася, усё так бясслаўна для нашых і скончыцца, калі б ня ўдалая трохходаўка Калачоў—Цыгалка—Кірыльчык, якая на 82-й хвіліне сталася выратавальнай.

Лёс дзьвюх пуцёвак у паўфінал вырашыўся на трэці дзень спаборніцтваў. Пунтус выставіў на гульню баявы склад першага дня, і пачыналася ўсё вельмі абнадзейліва. У пачатку Алег Шкабара па-майстэрску скарыстаў дакладны навес Калачова і адкрыў лік. Але праз якія дзьве хвіліны румынскі арбітар Аляксандру дан Тудар на роўным месцы зламаў сцэнар гульні. Цімоха Калачова выдалілі з поля ў вельмі спрэчнай сытуацыі, за трохі прыпозьнены падкат Калачова сьпераду. Спартовыя СМІ запратэставалі: «Арбітар паўдзельнічаў у выбіваньні беларусаў». Трэнэр Пунтус быў яшчэ больш катэгарычным: «Гэта быў ня матч, гэта быў зьдзек з нашай каманды».

Беларусь—Сэрбія 1:2

WWW.FCBATE.BY

Юры Пунтус: «Гэта цяжка было назваць матчам, гэта быў зьдзек з нашай зборнай».

Чорная гадзіна надышла для беларусаў у другім тайме. Перш за ўсё лідэр сэрбаў Данка Лазавіч рэалізаваў пэнальці за парушэньне правілаў на мяжы штрафной з боку Тарасенкі, а затым балканцы адзначыліся ўжо ў гульні — 1:2. Безвыходным становішча зрабілася пасьля абуральнага ўчынку Аляксандра Глеба: груба згуляўшы ў цэнтры поля, ён быў справядліва выдалены, пакінуўшы каманду пакутаваць удзевяцёх. Вынік — трэцяе месца ў групе і заказаныя квіткі дамоў. Сэрбія ды Італія ідуць далей.

Анатомія выступу

Нягледзячы на няспраўджаную мару пра паўфінал, сам выхад у лік васьмі наймацнейшых камандаў кантынэнту — несумненны посьпех, роўнага якому сувэрэнны футбол дагэтуль ня ведаў. У кожнага посьпеху — свае складнікі.

Складнік 1. Дасягненьне моладзевай каманды — двайная перамога беларускага спорту, бо ўсе да аднаго ўдзельнікі каманды — гадаванцы айчыннай футбольнай школы. Насуперак згубнай палітыцы Мінспорту апошніх гадоў па завозе ў Беларусь так званых «варагаў» — расейскіх і ўкраінскіх здабытчыкаў мэдалёў — Пунтус і К° давялі, што старанная і мэтанакіраваная праца на сваёй глебе заўжды дае станоўчы вынік. Для таго каб пераканацца ў гэтым, дастаткова паглядзець на геаграфію каманды-трыюмфатаркі: Юры Жаўноў — з Добрушу, Арцём Канцавы — з Гомелю, Дзяніс Сашчэка — з Асіповіч, Аляксей Сучкоў — зь Ліды, Зьміцер Молаш — з пасёлку Міханавічы Менскага раёну, браты Цыгалка і браты Глебы — зь Менску, Сяргей Карніленка — зі Віцебску…

Складнік 2. Рэжысэрам футбольнага сьвята для беларусаў можна па праве назваць галоўнага трэнэра моладзевай каманды і барысаўскага «БАТЭ» Юр'я Пунтуса. Нягледзячы на свой самы малады ўзрост сярод трэнэраў каманд — удзельніц эўрапершынства, 43-гадовы Пунтус працуе са зборнай цягам апошніх чатырох гадоў і ў сваім прафэсійным разьвіцьці не стаіць на месцы. Ня менш важным для гульнявога ўзаемаразуменьня ёсьць і тое, што 7 з 22 гульцоў прадстаўлялі ў зборнай «БАТЭ», а яшчэ трое — цяпер легіянэры — таксама выхадцы з барысаўскага клюбу.

Складнік 3. Аляксандар Глеб — наш адказ футбольнаму сьвету. Выхаванец менскай дынамаўскай школы чатыры гады таму быў куплены нямецкім «Штутгартам» у барысаўскага «БАТЭ». Летась Аляксандар быў удастоены срэбнай узнагароды Бундэсьлігі і паводле апытаньня адмыслоўцаў трапіў у тройку найлепшых легіянэраў чэмпіянату. Цяпер таленавіты беларус — адзін з найярчэйшых маладых гульцоў Эўропы, на яго палююць такія гранды сусьветнага футболу, як італьянскі «Інтэр» і гішпанскі «Рэал». Аматары і адмыслоўцы «гульні №1» сыходзяцца ў адным: Глеб — наша ўсё. Таму прыкры ўчынак Аляксандра ў вырашальным двубоі ўспрымаецца не інакш як здрада.

Кастусь Лашкевіч

Чэмпіянат Эўропы па футболе сярод моладзі (да 21 году)

Беларусь—Італія — 2:1 (Бохум; Кірэнкін, 6, А.Глеб — Джылярдзіна, 58)

Беларусь—Харватыя — 1:1 (Абэрхаўзэн; Кірыльчык, 82 — Лучыч, 38)

Беларусь—Сэрбія і Чарнагорыя — 1:2 (Абэрхаўзэн; Шкабара, 13 — Лазавіч, 47 (пэн), Мілаванавіч, 55)

Шлях у эліту

Кваліфікацыйны раўнд першынства Эўропы-2004 стаўся для ўсіх прыемнай нечаканасьцю. Тым часам як нацыянальная каманда, якая перажывала скандалы, паразы й зьмену галоўнага трэнэра (замест Малафеева прыйшоў Байдачны), замкнула турнірную табліцу 3-й адборачнай групы, наша моладзевая зборная атрымала пяць перамог у пяці апошніх сустрэчах і толькі па дадатковых паказьніках саступіла пальму першынства чэхам — найлепшай камандзе мінулага чэмпіянату. Зрынутымі аказаліся каманды вялікіх футбольных дзяржаў — Галяндыі (2:1) і Чэхіі (1:0).

Лёсаваньне вызначыла ў супернікі беларусам суседзяў-палякаў. Пераможца паядынку трапляў у фінальную стадыю кантынэнтальнага форуму, дзе акрамя прэстыжных узнагародаў мелі разыгрывацца і пуцёўкі на Алімпіяду.

Першы з паядынкаў адбыўся ў Менску на засьнежаным полі стадыёну «Дынама» і скончыўся малапэрспэктыўнай для нас нічыёй — 1:1. Затое ў матчы ў адказ напорыстая гульня братоў Аляксандра і Вячаслава Глеба ды Цімафея Калачова ўвагнала ганарыстых гаспадароў у стан грогі — 0:4. Упершыню ў айчыннай гісторыі футбалісты прабіліся ў фінальны эўрапейскі турнір.

Як дырэктараў саўгасаў

Як улада перадала ім зямлю разам з работнікамі і што з гэтага выйшла

Базыль Літвіновіч

Галоўны герой Коласавай «Новай зямлі» з прычыны адсутнасьці ўласнага кавалка зямлі вымушаны быў пайсьці на службу да Радзівіла, і гэта надзвычай прыгнятала яго. Пошукі выйсьця ўмацавалі Міхала ў неадольнай мары пра вольную працу на ўласным кавалку зямлі.

Сёньняшнія бялыніцкія фэрмэры ў свой час таксама знаходзіліся на службе. Хтосьці зь іх шчыраваў у калгасе, нехта зарабляў на хлеб працай ва ўстанове. Калі ў калгасах перасталі плаціць грошы і праца страціла ўсялякі сэнс, найбольш энэргічныя ўбачылі для сябе выйсьце ў фэрмэрстве.

Куды хочаш, абы не ў калгас

Цяпер у Бялыніцкім — тыповым усходнебеларускім — раёне афіцыйна налічваецца 22 сялянскія гаспадаркі, якія валодаюць дзьвюма тысячамі гектараў зямлі, што складае каля 2% ад зямель раёну. Памер надзелаў вагаецца ад 13 да 150 гектараў.

Напачатку, калі фэрмэрскі рух толькі пачаў узьнікаць, стаўленьне да новых гаспадароў было даволі скептычнае. Хадзіла фраза: фэрмэр будзе існаваць роўна столькі, колькі будзе існаваць калгас. Гэтым сьцьвярджалася простая залежнасьць фэрмэра ад калгасу, дзе ён мог разжыцца ўгнаеньнямі, тэхнікай, палівам, камбікормам. Аднак, наколькі мне вядома зь мясцовай крымінальнай статыстыкі, ніводзін фэрмэр яшчэ ня быў злоўлены на крадзяжы калгаснай маёмасьці. Наадварот, ёсьць нямала прыкладаў, калі менавіта фэрмэр дапамагае калектыўнай гаспадарцы. Прыкладам, камбайнам на час жніва.

Да фэрмэра часьцей пачынаюць зьвяртацца па дапамогу і вяскоўцы, бо ў мясцовым саўгасе «няма магчымасьці» ці проста не дапросішся. А калі і дапросішся, то не дачакаешся той помачы.

Сёньня ўжо не чуваць ранейшай іроніі, калі гавораць пра фэрмэраў. Як не чуваць і высновы другой: «Фэрмэры краіны не накормяць!»

Праўда, многія па-ранейшаму перакананы, што будучыня сельскай гаспадаркі ўсё-такі за буйнымі таварнымі сельгаспрадпрыемствамі і месца фэрмэрству ў тым заўтрашнім дні няма.

Вядома, некаторыя фэрмэрскія гаспадаркі распадаюцца. Дзеля справядлівасьці трэба сказаць, што сярод фэрмэраў сустракаюцца і такія, хто стварае гаспадарку толькі на тры гады. Гэта акурат той пэрыяд, на які пашыраецца дзеяньне пэўных ільгот.

Праз тры гады, выціснуўшы з узятай у арэнду зямліцы ўсе сокі, можна адмовіцца ад фэрмэрства. А можна зарэгістраваць новую фэрмэрскую гаспадарку, аформіўшы дакумэнты, скажам, на жонку, брата альбо цешчу. І зноў будзеш тры гады карыстацца льготамі.

Аднак рэдка-рэдка які былы фэрмэр вяртаецца ў калгас. Ён выпраўляецца на заробкі ў Расею, стараецца атрымаць афіцыйны статус беспрацоўнага, уладкоўваецца на працу ў лясьніцтва, ідзе качагарам. Куды хочаш, абы не ў калгас.

Такі фэрмэр ужо глынуў волі, адчуў смак працы без прынукі ды папрокаў.

Эфэктыўнасьць разьвіцьця сельскагаспадарчай вытворчасьці ва ўсе савецкія часы жадала быць лепшай. А да пачатку новага тысячагодзьдзя яна дайшла да такой небясьпечна нізкай мяжы, што прымусіла ўрад краіны выпрацаваць праграму, скіраваную на ўдасканаленьне АПК. Паўсюдна загаварылі пра рэфармаваньне калгасаў і саўгасаў, былі распрацаваны рэспубліканская, абласныя ды раённыя праграмы ажыцьцяўленьня той рэформы. Пры канцы 2001 г. аграрнікам прапаноўваўся шэраг мадэляў пераўтварэньня гаспадарак.

І на тое былі свае прычыны. Адна зь іх заключалася ў скарачэньні дзяржаўнай падтрымкі калгасаў. Агульныя аб'ёмы датаваньня беларускага АПК з 505 даляраў на гектар сельгасугодзьдзяў у 1990 г. за восем гадоў скараціліся ажно да 52 даляраў. Дадамо да гэтага славуты дыспарытэт цэнаў на прамысловую і сельскагаспадарчую прадукцыю, знос асноўных фондаў (для калектыўных гаспадарак Бялыніччыны гэты паказчык на сёньня перавышае 80%), адсутнасьць матывацыі працы… Словам, калектыўная сельская гаспадарка гінула на корані, дарэшты вычарпаўшы свой патэнцыял ды рэсурсы.

Рэфармаваньне бялыніцкіх сельгаспрадпрыемстваў плянавалася распачаць са зьмяненьня іх арганізацыйнай структуры. Для гаспадарак з крытычным эканамічным станам былі прапанаваны тры мадэлі: санацыя; стварэньне ўнутрыгаспадарчых падразьдзяленьняў, заснаваных на прынцыпах падрадных адносін, эканамічнага разьліку; прызнаньне банкрутам.

На той час у раёне налічвалася 18 гаспадарак — 6 саўгасаў і 12 калгасаў. На працягу 2002—03 г. іх засталося 14. Праўда, калгасы пры гэтым сталі называцца сельскагаспадарчымі вытворчымі кааператывамі (СВК), а саўгасы — унітарнымі камунальнымі сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі (УКСП).

Зьмена шыльдаў — першы і, можа, адзіны пакуль бачны вынік рэформы.

І старшыня рашыў стаць фэрмэрам

Тры з чатырох зьніклых гаспадарак паглынулі эканамічна мацнейшыя суседзі. Найбольш красамоўную рэвалюцыю перажыў саўгас «Іскра». Магчыма, такі шлях, як «Іскраў», чакае сотні беларускіх вёсак.

У дачыненьні да «Іскры» першапачаткова быў вынесены вырак — аб'явіць банкрутам. Фінансавы стан «Іскры» на студзень 2002 г. характарызаваўся наступнымі паказчыкамі: на балянсе гаспадаркі мелася асноўных фондаў на 537 637 000 рублёў, грашовыя сродкі на разьліковым рахунку адсутнічалі. Агульная сума выстаўленых плацяжоў па вяртаньні крэдытаў складала 226 мільёнаў рублёў. У ліку іх доўг перад «Магілёўэнэрга» быў 119 млн. Фінансавыя прэтэнзіі да гаспадаркі прад'явілі 25 арганізацый. Саўгас быў прызнаны ўстойліва неплацежаздольным, няздатным адказваць па абавязацельствах. На той час у саўгасе працавалі 68 чалавек, 12 зь іх складалі так званы адміністрацыйны пэрсанал. Пратэрмінаваная запазычанасьць па выдачы заработнай платы выражалася сумай, большай за 4 млн рублёў.

Абласны гаспадарчы суд узбудзіў справу аб банкруцтве саўгасу, накіраваў у гаспадарку часовага кіраўніка, у ролі якога выступіў Беларускі навуковы інстытут укараненьня новых формаў гаспадараньня ў аграпрамысловым комплексе. Праз нейкі час у Бялынічах адбыўся сход крэдыторaў саўгасу «Іскра».

Прадстаўнік часовага кіраўніка на падставе праведзенага аналізу прыйшоў да заключэньня, што пры ажыцьцяўленьні пэўнага пляну аздараўленьня саўгас «Іскра» можа зрабіцца рэнтабэльнай гаспадаркай. Тут жа ім быў агучаны і 30-месячны плян санацыі гаспадаркі: выключэньне зь севазвароту 100 гектараў нізкапрадукцыйнага ворыва, продаж машыны, трактара, камбайна «Ніва», двух недабудаваных «клюшачнікаў», цялятніку, 8-кватэрнага жылога дому, складу ядахімікатаў і г.д. Праўда, невядома было, хто б гэта наважыўся стаць пакупніком выстаўленай на продаж нерухомасьці. Тэхніку, вядома, раскупілі б. А каму спатрэбіцца «клюшачнік»?

Прадстаўнік «Магілёўэнэрга» адчуў, што прапанаваны плян аздараўленьня зьяўляецца хутчэй нязбытнай марай яго аўтараў, чым рэальным крокам па аздараўленьні дабітай гаспадаркі, і рашуча выказаўся за тое, каб саўгас аб'явілі банкрутам, што ў сваю чаргу гарантавала вяртаньне запазычанасьці. Яго пачалі пераконваць, упрошваць, дырэктар гаспадаркі разам з прадстаўніком часовага кіраўніка расьпераживаліся пра лёс нямоглых пэнсіянэраў (хто ім дапаможа апрацаваць прысядзібныя ўчасткі, калі ня будзе саўгасу?)… Урэшце прадстаўнік «Магілёўэнэрга» зьмякчыўся і надаў свайму голасу статус «устрымаўся».

Замест банкруцтва ў дачыненьні да «Іскры» была прыменена санацыя.

Вось жа, у выніку першага году аздараўленьня гаспадаркі УКСП «Іскра» дабіўся наступных паказчыкаў (за 2003 г.). Сярэднямесячны заробак у цэлым склаў 61 тысячу 667 рублёў.

Беларускаму навуковаму інстытуту ўкараненьня новых формаў гаспадараньня ў АПК за кіраваньне гаспадаркай было пералічана 7 мільёнаў 918 тысяч рублёў.

Рэнтабэльнасьць склала мінус 13,8%.

Агульныя страты за год выразіліся ў суме 31,1 мільёна рублёў. Для параўнаньня: агульны фонд заработнай платы за год склаў 38 млн 480 тыс. рублёў.

Відавочна, аздараўленьне аніякай карысьці не прынесла. Толькі зацягнула агонію. Таму вырашана паўторна распачаць у дачыненьні да «Іскры» працэдуру банкруцтва.

І вось тады дырэктар саўгасу Рыгор Жукаў паралельна выказаў на-

Апошні аднаасобнік Кузьма

Зь бялыніцкіх прыхільнікаў «прышчэпаўшчыны» ўлады не зламалі толькі аднаго — Кузьмы Шыдлоўскага. Можа, каб пасьпеў ён перавезьці сваю сядзібу на хутар, «сьцягнулі» б і яго. Кузьма запазьніўся з выездам са сваёй вёскі Лічынка. Таму лічыўся не хутаранінам, а аднаасобнікам. Аніводнага дня ў калгасе не прабыў.

У 39-м памерла падчас родаў яго жонка Настасьля: калгас ня даў аднаасобнікам машыны, каб даехаць да больніцы. За 15 год сумеснага і шчасьлівага жыцьця яны нарадзілі пяцёра дзяцей. Старэйшай дачцэ, Вользе, споўнілася 17, а малодшанькай, Таньцы, яшчэ і трох не было.

Пахаваў Кузьма сваю Настасьсю і рашыў дзецям быць і за бацьку, і за маці. Яму кажуць: кінь, Кузьма, дурасьцю займацца — дзяцей у прытулак паздавай, а сам хадзі да нас, у калгас уступай. Але пры жывым бацьку дзяцей круглымі сіротамі рабіць Кузьма Шыдлоўскі не захацеў!

Высылкай пачалі палохаць — не застрашылі.

Паглядзелі актывісты, што на яго ня дзейнічаюць ні застрашваньне, ні ўгаворы іхнія, выдзелілі 10 сотак зямліцы і падаткамі абклалі. Але ён выкручваўся. Сам не даесьць, дзяцей не дакорміць, а выканае іх загады. Мяса дзяржава патрабуе? Купіць сьвінчо якое і здасьць.

— У нас тут пяць аднаасобніцкіх гаспадарак было, — згадваў дзед Кузьма. — Чатыры зь іх праз немагчымасьць заплаціць падаткі падаліся ў калгас. Вымусілі іх. А я ў той арцелі аніводнага дня не пабыў. Мяне прымусам не ўзялі. Я аказаўся мацнейшым за калгас. Мацнейшым за ўладу.

Дажыў Кузьма да пэнсійнага ўзросту — аказалася, няма ў яго працоўнага стажу. Быццам не працаваў ён! Падаткі самі, безь ягонай працы, выплачваліся. Затым колькі рублёў пачалі ўсё ж такі даваць. Потым павялічылася пэнсія да васьмі рублёў…

Думаю, каб ня ціснулі на Кузьму, каб спрыялі яго гаспадарлівасьці, падтрымлівалі хлебаробскую кемлівасьць і ўвішнасьць, спадар Шыдлоўскі меў бы вялікую, заможную фэрмэрскую гаспадарку…

Памёр ён на 101-м годзе жыцьця, ціха адышоўшы ў сьвет іншы тры гады таму.

Б.Л.

Вясна 1929 году. У бялыніцкай вёсцы Бахані актывісты стварылі калгас. З гэтае радаснае падзеі сфатаграфаваліся на памяць. (Фота з архіву аўтара.)

зрабілі фэрмэрамі

Фэрмэрская ніва. А рагуля на ёй — чужая, саўгасная.

мер стаць фэрмэрам. Райвыканкам ня так даўно прыняў рашэньне аб выключэньні зь земляў «Іскры» кавалку агульнай плошчай аж 525,9 га і перадаў яго ў арэнду на тры гады Р.Жукаву. Зьявіўся новы пан?

Не, заняцца ўшчыльную арганізацыяй сваёй фэрмэрскай гаспадаркі Рыгору Лазаравічу пакуль перашкаджаюць саўгасныя справы: толькі скончылася пасяўная кампанія. Саўгасу быў даведзены плян яравой сяўбы, які трэба выконваць: паміраць зьбірайся, а жыта сей. Пэўнага клопату вымагае і забесьпячэньне працэдуры банкруцтва.

— Фэрмэрскімі справамі, — тлумачыць сп.Жукаў, — ушчыльную займуся толькі з восені. Да наступнай вясны мяркую зарэгістраваць гаспадарку, падабраць работнікаў. Забяру да сябе толькі тых, хто ўмее і хоча працаваць. Гультаі ды п'яніцы няхай шкрабуць свае патыліцы.

Безь мяжы між сваім і калгасным

Зь «Іскрай» мяжуе саўгас «Эсьмоны». На тэрыторыі гаспадаркі знаходзіцца вёска Заазер'е, знакамітая ня толькі сваім цудоўным возерам ды журавінавымі балотамі. У ёй нарадзіўся пісьменьнік-эмігрант Мікола Цэлеш, які даводзіў, што вядомая бітва на Нямізе адбылася ня ў Менску, а менавіта тут, непадалёку ад яго Заазер'я…

Саўгас «Эсьмоны» таксама першапачаткова плянавалі аздаравіць. Праўда, да паслуг Беларускага навуковага інстытуту ўкараненьня новых формаў гаспадараньня ў АПК не зьвярталіся. Можа, вопыт «Іскры» аказаўся дастаткова пераканаўчым.

За апошнія два гады ў «Эсьмонах» зьмяніліся тры дырэктары. Цяперашні кіраўнік саўгасу Леанід Буймістраў на сваёй пасадзе другі год.

Яшчэ летась ён прыняў рашэньне паспрабаваць сябе ў якасьці фэрмэра. На сёньня ён знаходзіцца ўсяго за нейкіх паўкроку ад узаконьваньня сваёй сялянскай гаспадаркі — засталася пара фармальнасьцяў. Райвыканкам яму ў арэнду на тры гады даў 653,8 га зямельных угодзьдзяў, зь іх больш за 400 га прыпадае на ворыва.

— Зьяўляючыся дырэктарам саўгасу, — тлумачыць Леанід Уладзіміравіч, — я адказваю за ўсё і за ўсіх. А мае магчымасьці ўплываць на становішча ў гаспадарцы абмежаваныя. У рабочых саўгасу адсутнічае матывацыя да працы, нізкія заробкі зьяўляюцца асноўнай прычынай дрэннай дысцыпліны. На банкаўскім рахунку саўгасу даўно пуста. А бясплатна толькі птушкі сьпяваюць у лесе. Праблемы набягаюць адна на адну, вырашыць іх немагчыма. Раней у саўгасе працавала 87 чалавек. Цяпер засталося 40. «Адсеялася» амаль палова калектыву. Працаваць у сваёй фэрмэрскай гаспадарцы прапаную чалавекам дваццаці, ня больш. У арэнду бяру таксама 10 трактароў — машын з наборам сельгасагрэгатаў, жывёлагадоўчую фэрму з жывёлай. Буду спэцыялізавацца на мясе й малацэ ды вырошчваць збожжа. Разьлічваю з другога году гаспадараньня мець прыбытак.

Цяпер Буймістраў і нясе адказнасьць за стан спраў у саўгасе «Эсьмоны», і працуе фэрмэрам. Мабыць, яму цяжка правесьці цяпер дакладную мяжу паміж сваім і саўгасным, калі яно ўяўляецца пакуль як адно цэлае.

Цяжкі, як фэрмэрава доля

З былых старшыняў могуць вырасьці буйныя землеўласьнікі, а пакуль большасьць фэрмэраў — дробныя гаспадары.

Займацца фэрмэрствам — справа нялёгкая. Ад зямлі хутчэй станеш гарбатым, а не багатым. Таму далёка ня кожны вытрымлівае іспыты на ажыцьцяўленьне сваёй мары. За апошнія тры гады на Бялыніччыне спынілі сваё існаваньне 15 фэрмэрскіх гаспадарак, у тым ліку чатыры — летась.

Не застрахаваны ад няўдачы і фэрмэры, «прызначаныя» дзяржавай, — былыя мэнэджэры сельгаспрадрыемстваў.

Калгас імя Кірава зімой 2003 г. падзялілі на тры часткі. Як паведамлялася на старонках раённай газэты «Зара над Друццю», «кіраўцы першымі ў раёне прагаласавалі за тое, каб на базе калгасу арганізаваць тры сялянскія (фэрмэрскія) гаспадаркі». Аднак нават году не праіснавалі дзьве буйныя фэрмэрскія гаспадаркі, якія былі ўтвораны на базе калгасу. Гаспадаром-арандатарам адной зь іх, «Сьцёхава», стаў былы галоўны інжынэр расфармаванага калгасу Л.Серафімовіч, а другой, «Алешкавічы», — былы яго старшыня А.Жураўлёў. Агулам абодва фэрмэры валодалі 1335 гектарамі зямельных угодзьдзяў (591 га арандаваў Серафімовіч, 743,9 — Жураўлёў). Яшчэ трэцяя частка зьніклага ў Леце калгасу імя Кірава была перададзена ААТ «Бялыніцкае райаграпрамтэхзабесьпячэньне».

На пачатку гэтага году і А.Жураўлёў, і Л.Серафімовіч напісалі адпаведныя заявы, у якіх прасілі райвыканкам ліквідаваць іхнія фэрмэрскія гаспадаркі. Не пацягнулі.

І гэта лягічна. У гэных фэрмэраў ад пачатку не было нават і каліва жаданьня адчуць сябе гаспадарамі. Яны былі і засталіся звычайнымі вясковымі начальнікамі. Зношаная тэхніка, якая дасталася ў арэнду, зьбяднелая ад шматгадовага недагляду зямля не маглі прынесьці прыбытку адразу. Гэта было заранёў вядома як самім «фэрмэрам», гэтак і простым работнікам. А таму ўсе працавалі, гледзячы адзін на аднаго: абы дзень адбыць да вечару. Новага, што магло б узрушыць людзей, зьмяніць іхнія адносіны, акрэсьліць спадзеў, яны не прапанавалі. Чакалі нейкага цуду. Ды яго не адбылося — абедзьве «фэрмэрскія» гаспадаркі год завяршылі са стратамі. Райвыканкам вымушаны быў перадаць іх зямлю ў арэнду ААТ «Бялыніцкае райаграпрамтэхзабесьпячэньне».

Працяг на старонцы 14.

Хто забіў Жвікоў?

«...Зямля дасьць волі, дасьць і сілы,
Зямля паслужыць да магілы,
Зямля дзяцей тваіх ня кіне,
Зямля — аснова ўсёй айчыне».

Адным зь першых наноў, пасьля савецкіх інтэрпрэтацый, пераасэнсаваў такое Коласава чатырохрадкоўе Аляксандар Жвік. Цяпер найчасьцей становяцца фэрмэрамі ад безвыходнасьці, тупіковасьці, патрэбы матэрыяльнай. Жвік жа быў хутчэй рамантыкам, чым жорсткім прагматыкам.

Нарадзіўшыся ў Галоўчыне, Аляксандар да самай пэнсіі працаваў у Мурманску. Зарабіўшы неблагую пэнсію, на пачатку 90-х ён разам з жонкай-інвалідам, якая без дапамогі Аляксандра не магла зрабіць і двух крокаў, вярнуўся ў родны Галоўчын. На вясковых могілках былі пахаваныя яго бацькі і расстраляны фашыстамі за сувязь з партызанамі старэйшы брат Хведар.

Жвікі вярнуліся ў старэнькую бацькоўскую хатку. Асвойтаўшыся, Аляксандар вырашыў стаць землеўласьнікам, чым зьдзівіў, бадай, усіх сваіх землякоў.

Толькі цяпер, пасьля жудаснага забойства Аляксандра Жвіка і ягонай жонкі, думаю, што стаў ён фэрмэрам не таму, што хацеў разбагацець, зрабіцца гэтакім мясцовым панком. Жвікі абое атрымлівалі пэнсіі. На пражыцьцё грошай хапала.

Не, Жвік хацеў паказаць землякам прыклад вольнай працы на ўласным кавалку зямлі. Пайшоў у фэрмэры ад патрэбы душэўнай, аказаўся пакліканым да гэтай справы. Ён, як і Коласаў Антось, быў майстрам на ўсе рукі. І меў пры гэтым таксама надзвычай паэтычную душу. У яго было жаласьлівае сэрца, і гэта адчувала нават жывёла. Памятаю, заўсёды дзьверы ў ягоную хату пільнавалі тры, пяць сабак. Яны зьбягаліся сюды з усяго Галоўчына і найбліжэйшых вёсак у спадзяваньні ня толькі і ня столькі на дармавую костку са Жвікавай рукі.

Здаралася, што сабакі жылі на гэтым падворку па некалькі дзён, тыдняў, забываючыся на сваіх гаспадароў. Пільнавалі разам са Жвікам яго пяць ці сем каровак, якія пасьвіліся на арандаваным поплаве побач зь сядзібай.

Ён марыў дабудаваць-такі новую хату, зруб якой чарнеў побач з бацькавым старэнькім домам; жадаў адрамантаваць куплены ім гусенічны трактар-бульдозэр, што калеў побач з сажалкай. Ён хацеў упарадкаваць і тую сажалку — пачысьціць, запусьціць рыбу, на беразе паставіць альтанку, а вакол закласьці сад.

Пра свае летуценьні ён расказваў і аднавяскоўцам, якія па-рознаму ўспрынялі Жвікава фэрмэрства. Ён падахвочваў іх, стараўся разварушыць, страсянуць…

Да яго ў Галоўчыне самым вялікім быў надзел у гектар зямлі. У Жвіка было каля двух дзясяткаў гектараў. І практычна ўсю яе адвёў ён пад луг. Аляксандар Жвік меў кабылу, трымаў ад трох да сямі рагуляў, гадаваў сямейку козаў. Малака ад кароў ён не прадаваў. Яго выдойвалі цяляткі.

— Гэта ж трэба наняць жанчыну-даярку, — разважаў Жвік. — Заплаціць ей за працу. Прадасі ў калгас малако, а выручаных грошай ня хопіць, каб разьлічыцца з даяркай. Няхай лепш цяляткі п'юць малачко.

Ён нават дэкаратыўных курачак разьвёў з такім жа яркім пеўнікам-прыгажуном. Той быў нястомны ў каханьні. Хапала ў яго, маленечкага, з добры кавальскі кулак, сілаў і на курачак сваёй пароды, і на цыбатых нясушак, і на атлусьцелых бройлераў. Пачаў заглядацца, паганец, нават на суседзкіх гусей, што ўводзіла ў нечуваную лютасьць тлустага гусака, які раўніва пільнаваў, аберагаючы ад настырнага певунка, сваіх сяброўак.

Ад сваёй гаспадаркі асаблівай выгады фэрмэр Жвік ня меў. Жыў і працаваў у сваё задавальненьне, нікому не замінаючы, нікога не засланяючы.

Раньняй вясной 2000-га ў Галоўчыне здарылася трагедыя. Апоўначы запалаў Жвікаў дом. Усхапіўся, быццам тая паходня. Пажар заняўся знутры і адразу ж на ўсю плошчу хаты. Пажарнікі і суседзі прытушылі яго, праз дым і пажадлівы агонь уварваліся ў хату і… здранцьвелі. Аляксандар і ягоная жонка-інвалід былі зьвязаны. На іх целах знайшлі прыметы катаваньняў. Стала відавочна, што ў іх нешта выпытвалі, білі. Пра што хацелі даведацца?

І па сёньня гэта застаецца таямніцай.

На Галоўчынскіх могілках зьявіліся два сьвежыя грудочкі.

Забойцу (ці забойцаў) Жвікаў шукаюць безвынікова да сёньня.

Афіцыйная вэрсія гэтага жудаснага здарэньня — наўмыснае забойства дзеля рабаўніцтва. Падчас сьледзтва ўдалося высьветліць, што са Жвікавай хаты прапалі некаторыя рэчы, прадукты харчаваньня. У 2002 г. у поле зроку міліцыі патрапіў аднавясковец Жвікаў, які быў западозраны ва ўчыненьні гэтага злачынства. Але той раптоўна скананаў сваёй сьмерцю...

Як дырэктараў саўгасаў зрабілі фэрмэрамі

Працяг са старонкі 13.

Такім чынам, падзелены каля году таму калгас імя Кірава ўзьяднаўся і стаў структурным падразьдзяленьнем прамысловага прадпрыемства. Гаспадарчая дзейнасьць у ім вядзецца згодна з звыклым, калгасным прынцыпам.

Застаецца спадзявацца, што лёс новых фэрмэрскіх гаспадарак Жукава і Буймістрава будзе шчасьлівейшым.

А тое найперш залежыць ад таго, як ляжа карта, паспрыяе зьбег абставінаў, шэраг шчасьлівых выпадковасьцяў. Прыкладам, надарыцца пагода, і фэрмэр — той жа Буймістраў — зьбярэ багаты ўраджай збожжа, якое з выгадаю перапрацуе ў камбікорм. А яшчэ мясцовы сыраробны завод зь ім своечасова расплаціцца. А яшчэ пазыку ўдасца выбіць... Напраўду, для посьпеху аднаго добрага надвор'я дужа мала. Фэрмэру патрэбна яшчэ й такая «драбнічка», як уласны апякун з разгалінаванымі гарызантальнымі ды вэртыкальнымі сувязямі. Быў бы ўведзены інстытут прыватнай уласнасьці на зямлю, які гарантаваў бы селяніну поўную эканамічную свабоду, — роля «сваіх людзей» на парадак зьменшылася б. А сёньня бязь іх — ну як працаваць з выгадаю на няўдзячнай зямлі?

Як абысьці падатковую інспэкцыю

Калі фэрмэрскіх гаспадарак адзінкі, то падсобныя гаспадаркі маюць усе вяскоўцы. Разам 7800 сем'яў валодаюць 4 тысячамі гектараў зямлі. На кожную сям'ю ў сярэднім прыпадае паўгектара. У асабістых гаспадарках летась гадавалася 3415 галоў буйной рагатай жывёлы, 8354 — сьвіней, 1072 — коней. Прыкладам, жыхарка вёскі Ланькаў Тацяна Ткачэнка трымае трох кароў, ад якіх штогод прадае каля 11 тон малака. Летась у падсобных гаспадарках было 218 трактароў.

Павышаць статус такой уласнай гаспадаркі да фэрмэрскай людзі зусім не жадаюць. А навошта? Фэрмэрства — гэта абавязковая неабходнасьць весці пэўную бухгальтэрыю, быць падсправаздачным чалавекам. Гэта і чаканьне візытаў розных правяральшчыкаў.

Адзін былы фэрмэр у свой час узяў у арэнду 27 га зямлі. Праз шэсьць гадоў ён спыніў існаваньне гаспадаркі, пакінуўшы ў арэндзе паўтара гектара без утварэньня юрыдычнай асобы. За час фэрмэрства ён, дзякуючы ўласнай разваротлівасьці, набыў ва ўласнасьць па лізынгу новы трактар МТЗ-12-21. Інфляцыя дазволіла яму на працягу нядоўгага часу цалкам пагасіць лізынгавыя плацяжы, і трактар стаў ягоным. Цяпер той чалавек валодае паўтара гектарамі зямлі, мае трактар, каня і чатырох кароў, малако ад якіх з ахвотаю набываюць многія бялынічане. З таго і жыве.

Далучыцца б да «Радзімы»

З 12 экс-калгасаў раёну працьвітае толькі адна гаспадарка — «Радзіма». Маючы 8% зямлі раёну, летась «Радзіма» давяла сваю долю ў агульным аб'ёме вырабленай у раёне сельгаспрадукцыі да 40%.

Калі ўраджайнасьць збожжавых па раёне летась была 19,6 цэнтнэра з гектара, дык з палеткаў «Радзімы» іх сабралі па 35,5 ц. Ад кожнай каровы за мінулы год тут надоена па 6190 кіляграмаў малака (па раёне — толькі па 2180 кг). Сярэднямесячны заробак працаўнікоў СВК «Калгас «Радзіма» за 2003 г. складаў 213 тысяч рублёў без уліку выдадзенай натуральнай даплаты (штомесячна па 6 кг мяса, па 2 — макароны ды мукі, а таксама збожжа, сена). Прычым амаль напалову заробак утвараюць так званыя стымулюючыя даплаты — за катэгорыю (усе работнікі гаспадаркі ад старшыні да палявода падзелены на тры катэгорыі, якія штомесячна прэміруюцца на 40, 20 і 0% ад налічанага заробку), тэхналягічнасьць, вядзеньне здаровага ладу жыцьця (кінуў паліць, прыкладам, — штомесяц атрымліваеш 10% ад заробленай асноўнай сумы). Для астатніх калгасаў гэта выглядае як фантастыка.

Летась да «Радзімы» далучылі суседнюю гаспадарку — калгас імя Фрунзэ, які знаходзіўся на мяжы распаду. Цікава, што з 67 былых фрунзэнцаў, якія перад аб'яднаньнем выказалі жаданьне працаваць у складзе аб'яднанага калектыву, вытрымалі патрабаваньні праўленьня «Радзімы» толькі 25. Астатнія пазвальняліся.

Многія зайздросьцяць сялянам з «Радзімы». Бо ж, за выключэньнем дзьвюх гаспадарак, усе астатнія спрацавалі са стратамі.

Адну з важных прычынаў сёньняшняй устойлівасьці гаспадаркі варта пашукаць у пачатку 90-х гадоў мінулага стагодзьдзя. Калгас, які тады імкліва вырваўся зь сераднякоў, шчасьліва пазьбегнуў працэсу «прыхватызацыі». Грашовыя рэсурсы, у тым ліку і бюджэтныя, укладаліся ў вытворчасьць: у гаспадарцы зьявіўся сучасны комплекс па гадоўлі цялушак, набыта шмат тэхнікі, кароў-«ленінградак», узьніклі падсобныя промыслы (мукамольны, для вырабу макароны, каўбасы). Старшыня калгасу Аляксандар Лапацентаў — ня толькі спрактыкаваны арганізатар, але й тонкі псыхоляг ды ўдумлівы выхавальнік. Ён дае магчымасьць зарабіць, але й рублём сувора карае за правіннасьці.

Фэрмэрства як шыльда

Сярод тых 22 фэрмэрскіх гаспадарак ёсьць і пара-тройка такіх, для якіх узятая ў арэнду зямля адыгрывае хутчэй ролю шыльды. Асноўная ж іх спэцыялізацыя — нарыхтоўка і продаж піламатэрыялаў, выраб сталяркі. Не, зямля, выдзеленая ім, не пустуе, засяваецца. Але ня зь ёй зьвязваюцца спадзяваньні гэтых фэрмэраў. Прадукцыя пілярамы ды сталярнага цэху карыстаецца попытам, прыносіць гарантаваны прыбытак. У крайнім выпадку, не сапсуецца, калі паляжыць нейкі час незапатрабаванай. Гэта ж вам не малако, ня мяса… Такія ўладальнікі фэрмэрскіх гаспадарак скарыстоўваюць і наёмную працу.

У Галяндыю, па ідэі Прышчэпава

Узімку мінулага году мясцовы фэрмэр Уладзімер Карпянкоў прапанаваў на базе аднаго з калгасаў скарыстаць галяндзкі вопыт. Некалькі год таму сп.Уладзімер па сваёй ахвоце адмыслова наведаўся ў гэтую краіну, каб грунтоўна пазнаёміцца з арганізацыяй тамтэйшай сельгасвытворчасьці.

Ідэя выкарыстаць замежны досьвед слушная і, заўважым, няновая. Яшчэ ў 20-х гадах мінулага стагодзьдзя ў Беларусі надзвычай актуальным быў заклік уладаў ператварыць нашу краіну ў «чырвоную Данію». У выніку пачалі зьяўляцца хутары, сельгаспасёлкі, іх уладальнікам выдаваліся льготныя пазыкі. Толькі на Бялыніччыне ў час, вядомы як «прышчэпаўшчына», узьнікла больш за сотню хутароў. Калі ж народнага камісара земляробства БССР Зьмітра Прышчэпава абвінавацілі ў сымпатыях да кулацкіх гаспадарак і ў супраціўленьні калектывізацыі, узьніклыя і акрэплыя за некалькі гадоў хутаранскія (чытай — фэрмэрскія) гаспадаркі пачалі «сьцягваць» у арганізаваныя калгасы.

Фэрмэр Уладзімер, у двух словах, прапанаваў усю калгасную зямлю падзяліць на ўчасткі памерам ня больш за 60 гектараў кожны і раздаць іх у арэнду калгасьнікам, якія пажадаюць на ёй гаспадарыць. З калгаснай тэхнікі стварыць штосьці накшталт мясцовай МТС, якая пры патрэбе аказвала б паслугі тым самым фэрмэрам. Начальства гэтыя ягоныя ідэі падтрымала. Аднак думалі-рашалі паўзімы, а там і вясна настала. У калгасе зьмяніўся старшыня. Калгас той, выбраны ў якасьці базавага, узорнага, з горам папалам адсеяўся. І ўжо ўзьнікла пытаньне да ініцыятара перайманьня галяндзкага мэтаду: маўляў, як гэта, гаспадарка так патрацілася на пасяўную — і цяпер раздаць зямлю калгаснікам? Зьбяром увосень ураджай, а там відаць будзе.

Словам, ідэя не рэалізавалася. Астыў да яе, урэшце, і сам фэрмэр.

Загартоўка адказнасьцю

Нягледзячы на дрэнную матэрыяльна-тэхнічную базу, мясцовыя фэрмэры ўсё-такі з горам папалам сточваюць канцы з канцамі. Іх гаспадаркі — прымітыўныя, аб выкарыстаньні сучасных тэхналёгій і тэхнікі няма і гаворкі. Аднак яны намнога далей прасунуліся па шляху абуджэньня ў сваіх душах пачуцьця гаспадара, чым, скажам, самы ўзорны работнік з тае ж пасьпяховае «Радзімы».

Фэрмэр цалкам залежны ад вынікаў уласнай працы. Самі ўмовы прымушаюць працаваць да зьнямогі, выкручвацца, быць прадпрымальным. Яны пакутліва праходзяць гэты шлях станаўленьня як гаспадара. Шлях, які быў гвалтоўна перапынены бальшавіцкім экспэрымэнтам, што атрымаў найменьне калектывізацыі.

Якую вялікую б зарплату ні атрымліваў калгасьнік, ён працуе на калгас. Ён цалкам залежны ад дыктату старшыні, залежны ад калектыву. У яго няма тут свайго… Па вялікім рахунку, калгасьнік нават у самым заможным калгасе застаўся звычайным падзёншчыкам.

Калгасьнік адказвае за якасьць сваёй працы і стан спраў у гаспадарцы толькі сваім заробкам. Фэрмэр — уласнай маёмасьцю. У гэтым і заключаецца розьніца паміж імі. Адсюль і пачынаецца шлях станаўленьня селяніна ў гаспадара.

Фэрмэр на сябе працуе сам. Калі выкарыстоўвае падзёншчыкаў, зь імі абавязкова разьлічваецца.

На калгасы працуюць усе. Пасяўная, касавіца, уборка: суботнікі, шэфства, праца беспрацоўных, школьнікаў… І ўсё за бясплатна.

Вось і на пэрыяд сяўбы сёлета ў калгасы Магілёўшчыны толькі з двух гарадоў, Магілёва і Бабруйску, накіравалі 570 трактарыстаў, сьлесараў і электразваршчыкаў. Амаль штодзённа на працу ў калгасы і саўгасы выяжджалі па два дзясяткі работнікаў з устаноў Бялынічаў. Дадайце сюды крэдыты і льготы. На жаль, уся тая дапамога ім — нібыта вада ў пясок.

Пра такую падтрымку фэрмэры нават і ня мараць.

* * *

Мне падаецца, што ўрэшце наша сельская гаспадарка натуральным чынам пяройдзе на рэйкі фэрмэрства, зробіцца хутаранскай. Як і задумвалася пры канцы 20-х гадоў мінулага стагодзьдзя. І дапаможа ёй у гэтым дэмаграфічная сытуацыя. Экспэрымэнт па выкараненьні непэрспэктыўных вёсак пасьпяхова завяршаецца. Выміраюць ужо ня толькі аддаленыя вёскі, меншае жыхароў і ў цэнтральных сядзібах гаспадарак.

Ад апошняга перапісу колькасьць жыхароў Бялыніччыны скарацілася больш як на 2 тысячы і цяпер складае 23500 чалавек. Зь іх 8061 зьяўляюцца пэнсіянэрамі. Вясковая моладзь, як правіла, не затрымліваецца пад бацькоўскім дахам. Нават выпускнікі сельгасВНУ і каледжаў далека ня ўсе даяжджаюць на працу па разьмеркаваньні. Нараджаецца адзін, а чацьвёра паміраюць…

Перамены на карысьць эфэктыўнага гаспадараньня проста неўнікнёныя.

* * *

Цікава ўсё ж такі, які шлях для сябе абралі б дзеці Міхала сёньня?

Базыль Літвіновіч,
Бялынічы

Старая рукадзельніца зь вёскі Майск УКСП «Эсьмоны» Ганна Багамаз. Жанчына ўсе сваё жыцьцё адпрацавала на саўгасных палетках. Цяпер зрэдку дастае з куфра посьцілкі, ручнікі, каб вярнуцца хоць у думках у сваю маладосьць.
Пэнсіянэрка, як і многія аднавяскоўцы, трымае жыўнасьць, мае паўгектара зямлі і не зьвяртае аніякай увагі на пэратрусы ў родным саўгасе.

Так выглядае Заазерскае возера (выгляд з боку вёскі Карманаўка ў кірунку да вёскі Заазер'е). Яго часта згадваў у сваіх творах і лістах на Радзіму пісьменьнік-эмігрант Мікола Цэлеш. Вакол раскінуліся ўгодзьдзі саўгасу «Эсьмоны».

Narodžanyja grantavaj systemaj,

prykryvajucca lavackimi lozunhami

Dazvolcie zreahavać na artykuł sp.Uškina ū «NN» ad 28 traūnia, u jakim jon maluje harotny i, ja navat by skazaū, dekadencki stan biełaruskich uciekačoū u Čechiji.

Na samaj spravie takija typy nazirajucca ūva ūsich dyjasparalnych kolach, va ūsich narodaū, što mieli ci majuć aktyūnuju emihracyju. Jość balšynia, jakaja paciahnułasia za ūjaūleńniem, što tam «miodam namazana». Tych chutka apanoūvaje rospač, bo dabrabyt miascovy stvaraūsia stahodździami j na jich nie pašyrajecca aūtamatyčna. Kab da jaho chacia b trochu dałučycca, treba *vielmi* doūha i *vielmi* pilna pracavać, na što jany ū balšyni niazdolnyja (z roznych pryčynaū — ad asabistych da kvalifikacyjna-adukacyjnych). Pieravažnaja častka hramadztva jich nie prymaje. Tady jany traplajuć va ūlońnie sacsystemy — dzie macniejšaj, dzie slabiejšaj… Nastaje asabistaja i kamunitarnaja dehradacyja z usimi vynikami — gieta lakalnaje, adukacyjnaje, prafesijnaje i h.d. U druhim pakaleńni mahčyma ūźniknieńnie ekstremisckich płyniaū (naprykład, arabskaja supolnaść u Francyji ci rasiejska-habrejskija vuličnyja gangi ū ZShA).

Jość, adnak, i jinšyja, mienšynia, — ludzi, što byli paśpiachovyja ūžo doma, ale z roznych pryčynaū musili źjechać (sapraūdy roznych: naprykład, prafesijna dasiahnuli tam viaršyni ci, naadvarot, apynulisia ū asiarodździ, jakoje tarmaziła jichny prahress — prafesijny, intelektualny, sacyjalny, majomasny, palityčny dy jaki chočacie), — hetkija, jak praviła, chutka dasiahajuć pośpiechu i ū novaj prastory.

Sučasnaja, «novaja» biełemihracyja maje ūsie hetyja rysy plus jašče niešta specyfičnaje, vyklikanaje palityčna-nacyjanalnym uciskam na Baćkaūščynie. Akramia ahulnaje palityčnaje dy intelektualnaje niaśpiełaści, heta jašče j prablema viartańnia (fizyčnaha i emacyjnaha), trochi ekskluziūnaje stanovišča ū dačynieńni da jinšych imigrantaū (aūra baraćbitoū za niešta vysokaje), niezdarovaja mižasobasnaja kankurencyja až da padazronaści, časam dosyć dziciačaja («ja dva razy ū tanku hareū!»), časam apraūdanaja, prablema z zachavańniem suviaziaū z siabrukami, što zastalisia, dy apraūdańnie svajho adjezdu ū jichnych i svajich vačoch. Da taho jašče viadomaja prablematyka ludziej psychična labilnych, jakich tak šmat u apazycyjnych asiarodkach i jakich taksama niamała j tut.

Artykuł tavaryša Uškina na samaj spravie dosyć paviarchoūny. Paprešaje, asoby, pra jakich jdzie havorka, pryvieźli hety styl «kultury» ź Miensku (u asnoūnym), dzie jon paśpiachova žyvie j ciapier mienavita ū kołach sp.Uškina: biessensoūnaje badziańnie pa «miescach» ci «punktach», šmat pustych razmoū pad piva ci pad harełku, nendza j niežadańnie ničoha rabić, jakija narodžany grantavaj systemaj i apraūdvajucca lavackimi lozunhami.

Fenomen «pracy» ū jakaści žyvoje reklamy — pryvablivać minakoū-turystaū na roznyja praskija atrakcyji, pra jakuju raspaviadaje sp.Uškin, — paūstaū z jichniaha stylu žyćcia «doma». Jany j tam časam «stajali z plakatam», i jim hetaja pazycyja mentalna blizkaja. Z adnaho boku — byccam pracuješ, navat hrošy płaciać (apošnim časam da pazytyvaū jichnaha stajańnia dadałasia j niekatoraja lohkapartyzanskaja niebiaśpieka, bo Praskaja Rada tuju čynnaść zabaraniła), z druhoha — pa sutnaści, ničoha nia robiš, tolki marnuješ čas, ale aktyūna, siarod ludziej. Viadoma, jak zaniatak časovy, kali jinšaj mahčymaści niama, zajmacca hetym možna i treba, ale ž niekatoryja tak žyvuć užo kolki hadoū.

Naadvarot, tyja, chto byū na niešta zdolny na Radzimie, akazalisia paśpiachovymi j tutaka: Maks Ščur siońnia ličycca papraūdzie samym cikavym biełaruskim filozafam. Jinšy dziadzka-prahramatar staūsia adnym z samych vysokaapłatnych uciekačoū, ažaniūsia, dziaciej naradžaū, navat padtrymlivaje svajich siabroū na Biełarusi materyjalna. Niekalki daktaroū, što pracujuć u špitalach i paśpiachova intehravalisia ū českaje hramadztva, asiahajuć karjeru navukoūcaū. Sioj-toj vučycca, para čałaviek navat niešta vykładajuć va ūniversytetach. Karaciej, ludzi robiać učynki, i vidać ichnaja adkaznaść za budučyniu. Pakul što svaju, ale šmat dla kaho ź biełarusaū i heta užo niamała! Tyja ž, chto nia byū aničoha varty tam, akramia jak stajać z plakatam, toj i tutaka ū tym samym stanoviščy: zusim zahnucca sacyjalizm miascovy nie daje, ale j nadta namahacca nie prymušaje. Jość, praūda, i horšyja varyjanty: zvyčajnyja prydurki, psychapaty ci ahienciki, ale, dziakavać Bohu, praktyčnaja adsutnaść tutaka ūradlivaje «hleby» (arhanizacyjnaje j finansavaje) dla jichnaje aktyūnaści jich naturalnym čynam neūtralizuje. Pahatoū uzrovień žyćcia ū ČR nie zadavalniaje jichnych ambicyj, honić jich dalej na Zachad — u Belhiju, Niamieččynu ci kudy jašče. Dziakuj Bohu!

RR, Praha



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Аб непажаданай асобе

Маім улюбёным чытаньнем зьяўляюцца жыцьцяпісы. Прычым асабліва мяне цікавяць асобы неадназначныя, а часам і адыёзныя, бо, на маю думку, празь іх найбольш праяўляюцца адметнасьці часу. Але вось якраз такіх, крытычных дасьледаваньняў практычна няма ў нашай біяграфістыцы. Ёсьць нарысы Б.Сачанкі пра Мураўёва-вешальніка, Л.Бэндэ. Але дзе жыцьцяпіс? Напрыклад, П.Панамарэнкі або такой калярытнай постаці, як Я.Грыгулевіч — тэрарыст, вучоны, сябар Максіма Танка, П.Нэруды і Д.Сікейраса?

Увогуле ў нашых Плютархаў пануе суцэльная апалягетыка або выкрывальніцтва (як выключэньне можна назваць кнігу Г.Коласа пра Янку Купалу «Карані міфаў»). Гэта, можа, і патрыятычна, але ці адлюстроўвае адметнасьць нашай гісторыі, дзе выбар найчасьцей даводзілася рабіць паміж дрэнным і найгоршым? Прычым выбіралі звычайна апошняе. Прыкладам таго можа быць постаць Р.Астроўскага. Гэта імя даўно стала сынонімам беларускага калябанцтва падчас другой сусьветнай вайны, але можна сказаць, што ўвесь палітычны шлях Астроўскага — суцэльнае калябаранцтва. Ён супрацоўнічаў (а «калябарацыянізм», нагадаю, і азначае «супрацоўніцтва») з камуністамі. Нават хадзіў падчас працэсу Грамады ў камуністычных героях. Мала хто ведае, што Міхась Чарот назваў у ягоны гонар сына. Потым былі спробы паразумецца з палякамі, немцамі…

Хацелася б пра гэта не ўспамінаць, але, на жаль, менавіта тут знайшла свой адбітак уся беларуская палітыка XX ст. Фактычна пасьля 25 Сакавіка ў нас не было сур'ёзных спроб весьці сваю гульню, мы амаль заўсёды выступалі ў зьвязцы з кімсьці. Таму нас па сёньняшні дзень не ўспрымаюць у сьвеце як нешта самастойнае. Каб было інакш, трэба, каб мы самі не баяліся асьвятляць далікатныя моманты сваёй гісторыі («заходнерусізм», «беларускі камунізм», калябарацыю), не пакідаючы іх іншым.

Усяслаў Шатэрнік

Ізноў беларусам нельга

Зьмест артыкулу А.Сідарэвіча «Чый апостал і геній» найперш пераканаў мяне ў тым, што савецкую гістарычную школу аўтар засвоіў на «выдатна» (важна ня тое, што пакінуў чалавек пасьля сябе, а найперш хто ён — сябар ці вораг). У гэтым пляне лягічна нават тое, што, пішучы пра Рушчыца, А.Сідарэвіч толькі мімаходзь назваў яго мастаком — хіба гэта важна? Гэта зноў жа ў духу савецкай гістарычнай адукацыі. (Прыгадваю, што за пяць гадоў навучаньня на гістфаку паміж курсамі палітычнай ды партыйнай гісторыі не знаходзілася месца на асобныя курсы па гісторыі мастацтва ці культуры. Я, прыкладам, ад гэтага пакутавала і «дабірала» інфармацыю самастойна. Большасьці ж гэта падавалася нармальным. Ну як тут не згадаць славутага «Калі я чую слова «культура»…».)

Ролю асобы ў гісторыі сп.Анатоль засвоіў добра, а вось таго, што творца і творчасьць ёсьць розныя рэчы, асабліва на адлегласьці, — не разумее. Ну хіба можа каго адвярнуць ад Караткевіча тое, што ён любіў чарку? Вось так і ад Рушчыца. Мне хочацца спытаць у аўтара: а ці бачыў ён малюнкі Рушчыца? Ягоныя «Зямлю», «Эмігрантаў», «Старыя яблыні»? Чыя тут мэнтальнасьць і што «небеларускае», шкоднае можна тут убачыць? Я бачу тут толькі зьнітаванасьць, учэпістасьць і «ўкарэненасьць» менавіта беларусаў у сваю зямлю і вялікае гора ад страты свайго ДОМУ, ад таго, што трэба ісьці некуды ў белы сьвет. Гэта наш, а не які-небудзь іншы мэнталітэт. Так што, спадар Сідарэвіч, хочацца Вам гэтага ці не, — Фэрдынанд Рушчыц аб'ектыўна беларускі мастак і нацыянальны геній.

P.S. А вось якое дачыненьне да Рушчыца мае гісторыя з прыбіральняй? Хіба што ад таго бруду адмывацца цяжэй. Праўда, і самому можна моцна запэцкацца.

Н.Здановіч, Менск

Пра «Gudu»

Колькі заўвагаў да артыкулу «Іх музыку крадуць» з «НН» ад 21 траўня.

Расейскія нэапаганцы ня вывесілі на сваім інтэрнэт-сайце песьні «Gudy», а пірацкім чынам перавыдалі альбом гурту «Архаічныя абрадавыя спевы», перакруціўшы да таго ж зьмест прадмовы ў патрэбным для сябе «панславісцкім» стылі.

Магчыма, праф.Рагуля і ведае літоўскую мову, калі піша, што слова «gudas», якім «прыбалты» (на справе — толькі літоўцы) называюць беларусаў, азначае «бандыт». Але вось што пішуць пра гэтую назву, спасылаючыся на беларускага навукоўца С.Санька, у літоўскай газэце «Tautininkų Žinios» (нумар за лістапад 2003 г.): «Цікавая рэч, што раней ад Прусіі да Дзукіі [усходняя частка Літвы] літоўцы гудамі называлі таксама і сваіх найбліжэйшых суседзяў — наступныя літоўскія вёскі на ўсход ад сябе. Гэта тлумачаць ад прускага слова «guddi» (кустоўе, зарасьнік): калі з Захаду рушыла хваля крыжакоў-хрысьціянаў і несла новую веру, тыя, хто быў на ўсходзе, заставаліся яшчэ паганцамі і нібыта «хаваліся» ад новай веры ў лясох. Дзеля таго і называліся «гудамі» (падобным чынам узьнікла і нямецкая назва для паганцаў «heide»). З гэтага ўсяго відаць, што і сама назва «гуды» яднае беларусаў ды літоўцаў у адзін гістарычны кантэкст».

Аляксандар Мікус, Менск

Нашыя «генэралы» ўсё ж пры войску

Адбыўся чаканы выступ «Вопляў Відаплясава», ды не адбыўся чаканы дуэт Вольскі—Скрыпка. Як аказалася, шлях інтэграцыі Беларусі з Украінай пакручасты і цяжкі.

Увогуле, у адрозьненьне ад мінулых выступаў, шоў «Крамбамбулі» — зазвычай яскравае — было нейкае бляклае ды не зусім зразумелае; запомнілася хіба што аўтэнтычная цюркская песьня Гінэш Абасавай. Магчыма, часова скончыліся вынаходкі, а можа, так паўзьдзейнічаў нечаканы зрыў плянаў.

Украінскамоўны сьцёб-рок гучаў на парадак больш якасна, чыста і адпрацавана. Адчувалася прадуманасьць да драбніц: калі вакаліст «Вопляў» рабіў свае «вылазкі» проста па крэслах у залю, усе астатнія музыкі ведалі, што кожны зь іх павінен рабіць — забясьпечваць надзейнае рытмічнае суправаджэньне свайму лідэру.

Але трэба сказаць, адкуль што ўзялося. Такія якасныя выступы — плён шматгадовай працы. Таму ня ўсё ў нас так кепска, а наадварот, маем вельмі нават сьветлыя пэрспэктывы. «VV» у гэтым годзе сьвяткуюць сваё 18-годзьдзе — цалкам зразумела, чаму некаторыя нашыя «пачынаньні» ў іх распрацаваны значна шырэй: напрыклад, «Ляпісы» толькі запісалі песьню з аркестрам Акадэміі МУС РБ, а Алег Скрыпка — цэлы дыск разам з «Ансамблем пісні і танцю Збройних Сил України» яшчэ ў 2001 г.; «Крамбамбуля» толькі запрасіла розных беларускіх знакамітасьцяў у якасьці «гасьцей» у свой кліп, а Алег Скрыпка ўжо двойчы здымаўся ў навагоднім мюзыкле Канстанціна Мэладзэ «Папялушка»; тая ж «Крамбамбуля» толькі пачала супрацу зь «іншаземнымі» музыкамі, а «VV» граў у Парыжы…

Так што ў кожнага таленавітага беларускага музыкі нязьмераныя абшары дзейнасьці — было б жаданьне!

А на наступны дзень пасьля выступу ў «Казе» — зусім іншая музыка, іншая публіка, іншы Вольскі: вялікі сольны выступ «NRM». У маленечкі клюб «NC» набілася ледзь не з палову вялікай канцэртнай залі, і тут ужо Лявон ды кампанія пачуваліся поўнымі гаспадарамі. Справаздачу давялося даваць па поўнай праграме: публіка дарвалася й напоўніцу скарыстоўвала момант, атрымліваючы асалоду ад знаходжаньня побач з кумірамі. Заля лавіла кожнае слова сваіх «палкаводцаў»: Лявону нават удалося ўсіх пасадзіць на падлогу дзеля таго, каб потым разам ускочыць, а Піт Паўлаў пабываў на руках у фанатаў!

Калі праз паўтары гадзіны пасьля песьні «Лёгкія-лёгкія» музыкі-жаўнеры сышлі са сцэны, войска зараўло «ЭН-ЭР-ЭМ!» так, што маё піва на стойцы бару ледзь ня выскачыла са свайго плястыкавага кубачка…

…Адзінае — як на мяне, дык бракавала беларускае мовы ў тым самым «войску», дый славутай «інтэлектуальнасьці» было няшмат. Але на тое яна і маладосьць, якая, калі верыць Лявону Вольскаму, хутка скончыцца — адразу пасьля таго, як усе панкі пойдуць «клеркамі ў банкі»! Затое быў бел-чырвона-белы сьцяг ды шчырае жаданьне юных беларусаў больш ня быць у сваёй краіне падземнымі жыхарамі.

Цалкам натуральна, што ў такой публіцы, якая гатовая ісьці за імі хоць на барыкады, музыкі пачуваюцца як рыбы ў вадзе, але свой «інтэлектуал» нікуды не падзенеш, а менавіта ён і кліча Лявона асвойваць новыя далягляды ў беларускім шоў-бізнэсе. На пачатку гэта цяжка, але заўсёды не немагчыма. А таму — толькі наперад, мы заўсёды падтрымаем!

Алесь Квіткевіч

Пра «Адкрыты архіў»

Шмат пісалася пра «наша» тэлебачаньне. Пра яго шэрасьць, правінцыйнасьць, насьцярожанасьць да ўсяго беларускага. Выгадна вылучаюцца сваёй разьняволенасьцю духу толькі «Падарожжа дылетанта» і «Адкрыты архіў». Зь іх найбольш важкім зьяўляецца, безумоўна, «Адкрыты архіў», бо толькі ў гэтай тэлепраграме можна пачуць неафіцыйныя меркаваньні пра беларускае кіно, савецкую гісторыю, стан Белавескай пушчы. Апошні выпуск ужо назвай сваёй — «Жарсьці па гісторыі БССР» — абуджае цікаўнасьць у неабыякавага да беларушчыны гледача. Аднак нас чакае расчараваньне. Замест абмеркаваньня вострых пытаньняў нядаўняй нашай гісторыі нам даецца сусальны аповед пра здольнага вясковага хлопчыка Цімоха Гарбунова, ягоную службу роднай партыі ў якасьці сакратара па ідэалёгіі. Зьдзіўляе таксама, чаму аўтары, пачаўшы з інтрыгоўнага паведамленьня аб ідэалягічным скандале, у які быў уцягнуты першы рэспубліканскі ідэоляг, нечакана змаўкаюць. Глядач так і не даведваецца, чым не дагадзіў Цімох Сазонавіч свайму начальству ды пэрсанальна П.Панамарэнку, чаму ім прыйшлася недаспадобы ягоная «Гісторыя БССР». Гэта тым больш дзіўна, што гаворка ідзе пра тэму, вынесеную ў загаловак. Узьнікае думка пра цэнзуру або самацэнзуру. Але ў такім разе лепш было наагул не пускаць перадачу. Зрэшты, можа быць, тут звычайная недапрацоўка. Спадзяёмся, у наступным «Архіве» такога ня будзе.

УШ, Менск

Міраслаў Адамчык

Наш дэтэктыў

Выратаваны архіў Янкі Золака

Жыхар Нью-Джэрзі, які меўся пераехаць у Флорыду, тэрмінова прадаваў дом і ўсё яго «начыньне». Бібліятэцы мясцовага ўнівэрсытэту ён прапанаваў беларускія кніжкі, якія засталіся па сьмерці сваяка. Супрацоўнік Аляксандар-бібліятэкі ўнівэрсытэту Ратгерз (штат Нью-Джэрзі, ЗША) доктар гісторыі Джэймз Нісэн паехаў паглядзець кнігі і зусім выпадкова знайшоў архіў Янкі Золака. Аглядаючы спакаваныя скрыні кніжак, доктар Нісэн спачатку ня ўгледзеў нічога цікавага для бібліятэкі. Але ўжо пад самы канец натыкнуўся на скрыні з паперамі, складзенымі ў тэчкі. «Было падобна, што гэта архіў нейкага рэдактара», — згадвае сп.Нісэн. Гаспадар быў вельмі зьдзіўлены выбарам навукоўца: яму б і ў голаў не прыйшло, што гэтыя паперы могуць каго-небудзь зацікавіць. Ён ведаў, што той ягоны далёкі сваяк быў паэтам, але імя «Янка Золак» не казала яму нічога. Тым ня менш, ён ветліва дапамог данесьці тэчкі да машыны і пакласьці ў багажнік. Унівэрсытэцкая бібліятэка папоўнілася яшчэ адным зборам рукапісаў…

А пачынаў Джэймз Нісэн беларускі збор у бібліятэцы каля трох гадоў таму. Тады да яго, загадчыка аддзелу па Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе, зьвярнуўся Янка Запруднік і прапанаваў перадаць бібліятэцы свой кнігазбор — 2000 тамоў па гісторыі, літаратуры, мастацтве, фальклёры й інш. Апрача кніг Запруднік перадаў Аляксандар-бібліятэцы свой архіў — ліставаньне зь беларускімі нацыянальнымі арганізацыямі па ўсім сьвеце, лісты да канкрэтных асобаў, дакумэнты тых часоў, калі ён узначальваў беларускую рэдакцыю радыё «Свабода».

Галоўная праблема, якая ўзьнікла пры гэтым, — пераканаць бібліятэку, што ёй патрэбны гэтыя кнігі. «Кіраўнік аддзелу камплектаваньня казала, што мы можам узяць іх толькі ў тым выпадку, калі яны маюць дачыненьне да штату Нью-Джэрзі. Я спытаў у Запрудніка: мы можам даказаць, што гэтыя кнігі датычаць гісторыі штату? Ён адказаў: так, менавіта ў гэтым штаце жыве найбольшая ў ЗША колькасьць беларусаў. Таму кнігі трапілі ў бібліятэку як крыніца па гісторыі этнічнай супольнасьці», — кажа сп.Нісэн. Другая праблема ў тым, што кнігі надрукаваны кірыліцай, нязвыклай для амэрыканцаў.

АРЦЁМ ЛЯВА

Аглядаючы спакаваныя скрыні кніжак, доктар Нісэн спачатку ня ўгледзеў нічога цікавага.

Я.Запруднік паабяцаў амэрыканскаму бібліятэкару, што дасьць пагалоску па ўсёй беларускай супольнасьці: у гэтую бібліятэку можна прыносіць кнігі, рукапісы і здаваць грошы на падтрыманьне беларускага фонду. Доктар Нісэн спадзяецца, што чытачы ў беларускіх кніг абавязкова знойдуцца: «У нас вялікая бібліятэка па польскай гісторыі, па расейскай, па савецкай. Многія дактаранты прыяжджаюць у наш унівэрсытэт, каб абараняцца тут па гістарычнай тэматыцы. Магчыма, нехта, пачуўшы пра калекцыю Яна Запрудніка, прыедзе адмыслова дзеля яе».

Адам Воршыч

Бэстсэлеры вясны

Сярод кніжак беларусікі, якія карыстаюцца найбольшым попытам у чытачоў, па-ранейшаму найбольшую папулярнасьць маюць працы гістарычнай тэматыкі. Дуэт Шыбекі і Сагановіча, як кажуць работнікі «Акадэмкнігі», разыходзіцца вельмі шпарка. Тое самае тычыцца кніг Ігара Марзалюка і Вацлава Ластоўскага. Навуковасьць не перашкодзіла даведніку «Беларуская міталёгія» заняць высокі радок у рэйтынгах.

Сярод мастацкай літаратуры канкурэнцыю гістарычным працам могуць скласьці хіба толькі вершы Хадановіча.

Разам з тым, вялікім попытам пачалі карыстацца разнастайныя альбомы — як фатаграфічныя, так і мастацкія.

Алесь Яўдаха, незалежны распаўсюднік:

1. Захар Шыбека. Нарыс гісторыі Беларусі 1795—2002.
2. Андрэй Катлярчук. Швэды ў гісторыі і культуры Беларусі.
3. Сакрат Яновіч. Пад знакам Арла і Пагоні.
4. Антон Луцкевіч. Да гісторыі беларускага руху.
5. Біблія (пераклад Васіля Сёмухі).
6. Ян Станкевіч. Гістарычныя творы.
7. Генадзь Сагановіч. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасьці да канца XVIII стагодзьдзя.
8. «Госпаду памолімся». Малітаўнік (уклад. а.А.Надсан).
9. Андрэй Хадановіч. Лісты з-пад коўдры.
10. Уладзімер Арлоў, Зьміцер Герасімовіч. Краіна Беларусь.

«Акадэмкніга»

1. Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі. Т.6, ч.2.
2. Захар Шыбека. Нарыс гісторыі Беларусі 1795—2002.
3. Генадзь Сагановіч. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасьці да канца XVIII стагодзьдзя.
4. Ігар Марзалюк. Людзі даўняй Беларусі: этнаканфэсійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы (X—XVII ст.).
5. Беларуская міталёгія. Энцыкляпэдычны даведнік.
6. Вацлаў Ластоўскі. Кароткая энцыкляпэдыя старасьвеччыны.
7. Міхась Раманюк. Беларускія народныя строі.
8. Музэй старажытнабеларускай культуры.
9. Мінск. Минск. Minsk. Фотаальбом (фота А.Дрыбаса, Г.Ліхтаровіча, Л.Македонскага, У.Прыгарніцкага, В.Харчанкі).
10. Перапіс войска ВКЛ 1528 г.

«Кнігарня пісьменьніка»

1. Андрэй Хадановіч. Старыя вершы.
2. Уладзімер Караткевіч. Ладзьдзя Роспачы. Аповесьці.
3. Уладзімер Арлоў. Ордэн Белай Мышы.
4. Адам Глёбус. Дом.
5. Владимир Мулявин. Нота судьбы.
6. Анатоль Кляшчук. Пад небам Беларусі.
7. Минск за один день. (Фота С.Плыткевіча).
8. Arche. №2, 2004.
9. Васіль Быкаў. Доўгая дарога дадому.
10. Васіль Быкаў. Выбраныя творы.

Апытваў Адам Воршыч

Беларускі Быкаў для расейцаў

Василь Быков. Избранное / Пер. зь бел. Укладаньне У.Сіўчыкава, прадмова М.Тычыны. — Масква: Мартин, 2004.

Гісторыя выданьня быкаўскіх твораў па-расейску і ў Расеі вельмі доўгая, ды гэтая важкая і па-сучаснаму афармленая мастаком Сяргеем Пархаевым кніжка мае некалькі адметных рысаў. Для расейскага чытача яе рыхтавалі беларускія пісьменьнікі. Уладзімер Сіўчыкаў уключыў у падборку ня толькі творы, што расейскія школьнікі абавязкова вывучаюць у школьнай праграме («Сотнікаў», «Абэліск»), але й асабліва блізкія беларускай мэнтальнасьці раман «Знак бяды», аповесьці «Сьцюжа», «Ваўчыная яма», «Балота», а таксама па некалькі знакамітых быкаўскіх апавяданьняў ды прыпавесьцяў, напісаных у апошняе дзесяцігодзьдзе.

У сваёй прадмове да зборніку доктар філялёгіі Міхась Тычына піша: «Экзыстэнцыяльная праблема выбару, якой празаік аддаў належную ўвагу, дапаўняецца паняцьцем абсурду. Якраз абсурд дакладна выяўляе духоўны стан людзей XX ст. Абсурд як ператварэньне маралі ў сваю супрацьлегласьць. Абсурд як разбурэньне гіерархіі каштоўнасьцяў. Абсурд як падзеньне ў прорву бяспамяцтва. Абсурд, які ня сёньня пачаўся й ня сёньня закончыцца».

Зрэшты, затое не абсурдам выглядае зацятае змаганьне з Быкавым і нават з памяцьцю пра яго ідэолягаў розных уладаў — ад брэжнеўскіх да лукашэнкаўскіх. Уладатрымальнікі інтуітыўна адчуваюць у Быкаву пагрозу для свайго непадзельнага фізычнага панаваньня. Бо, нават не чытаючы яго, яны вычытваюць у яго пра сваю нікчэмнасьць і прымітыўнасьць.

Лявон Баршчэўскі

Гары Потэр адпачывае,

альбо У-вэй па-беларуску

Пятро Васючэнка. Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі. Казачныя аповесьці. — Менск: Мастацкая літаратура, 2003.

Падчас прэзэнтацыі кнігі ў Доме літаратара Лявон Баршчэўскі і Ўладзімер Арлоў не змаўляючыся назвалі яе аўтара сёньняшнім Янам Баршчэўскім. І, вядома, мелі рацыю. Галоўнае, у чым пераўзышоў Пятро Васючэнка свайго папярэдніка, — Ягамосьць Гумар. Кнігу варта прадаваць у аптэках у якасьці моцнага антыдэпрэсанту. Ляўрэату «Глінянага Вялеса» сапраўды ўдалося стварыць захапляльнае чытво з мноствам падтэкстаў і алюзіяў.

Дзіўны, здавалася б, з камэрцыйнага гледзішча ход — пазнака «для сярэдняга школьнага ўзросту» — прынёс выданьню добрую зьніжку сабекошту пры выключнай якасьці афармленьня (у крамах «Паны…» каштуюць каля 5 тыс.). Між тым, як сьведчыць сам аўтар, кніга гэтая зусім не дзіцячая.

Галоўныя пэрсанажы, чароўныя ў сваёй блазнаватасьці й непасрэднасьці ў дачыненьні да абсурдна-навакольнага, гэткія беларускія Бівіс і Батхэд, укараняюць ідэю «шляхецкага» У-вэю, «ня-дзеяньня» (ня блытаць зь бязьдзейнасьцю). І гэта не абібоцтва ключавых тыпажоў расейскае мэнтальнасьці — ад Ямелі да Абломава, — а гратэск на сапраўды наскую бязглуздую прагу да пасіўнасьці. Балазе, аўтар з дапамогай (ці ў выглядзе?) інфэрнальнага «рыжалысага» не дае панам адлежвацца на печы й жэрці рэпу, вынаходзячы ўсё новыя трасцы й гузакі на іх галовы. Абяцаюцца новыя неймаверныя прыгоды й авантуры. Чакаем зь нецярпеньнем.

Анатоль Івашчанка

• НОВЫЯ КНІГІ •

Бацюкоў А. Мэтамарфозы. Вершы. — Магілёў, 2004. — 32 с. 15 ас.

Болбас В. Забытыя прывіды мрояў. — Менск: Логвінаў, 2004. — 120 с. 300 ас.

У кнігу ўвайшлі навэлы, напісаныя ў розны час, а таксама пераклады вершаў К.І.Гальчынскага, А.Блока, І.Бродзкага, Э.Багрыцкага й інш.

Бярозка А. Выбранае / Уклад. А.Белы; Прадм. А.Ліса. — Менск: УП «Тэхнапрынт», 2004. — 193 с.: іл. 300 ас.

Імя гэтага паэта ўпершыню зьявілася на старонках літаратурна-мастацкіх часопісаў і газэтаў у 1930-я гады, але потым доўгі час ня згадвалася ў Беларусі з ідэалягічных прычынаў. Зрабіўшыся эмігрантам, Мацей Смарчок атрымаў шырокую вядомасьць найперш як мэдык, хаця й пісаць ня кінуў. Дзякуючы выданьню гэтай кнігі ягоная паэтычная спадчына, што ўяўляе гісторыка-літаратурную цікавасьць, амаль цалкам вяртаецца на радзіму. Зборнік уключае вершы й успаміны А.Бярозкі, бібліяграфію, фотаматэрыялы й артыкулы пра яго. Пытайцеся на выставе ў ТБМ.

Вайцяшонак М. Кола: Апавяданьні. — Менск: Про Хрысто, 2004. — 226 с.: іл. 500 ас.

Новая кніга апавяданьняў знакамітай пісьменьніцы.

Вашкевіч Ю. Беларуска-польскія культурныя сувязі ў 1945—1991 гадах. — Менск: Тэсэй, 2004. — 184 с. 250 ас.

Прадметам дасьледаваньня ў кнізе сталі культурныя дачыненьні паміж Польшчай і пасьляваеннай БССР. Аўтар аналізуе сацыяльна-палітычныя ўмовы, у якіх разгортваліся розныя віды польска-беларускага культурнага абмену, а таксама асаблівасьці ўспрыманьня беларускай культуры ў Польшчы. Разгледжана тагачасная польская беларусістыка, гістарыяграфія й зьвязаная зь Беларусяй мэмуарыстыка.

Куфэрак Віленшчыны. 2004, №9. 299 ас.

Новы нумар маладачанскага альманаху прысьвечаны паэту і літаратуразнаўцу Рыгору Семашкевічу. Друкуюцца таксама краязнаўчыя матэрыялы, мэмуары Мар'яна Дуксы, артыкулы Анатоля Сідарэвіча, Дануты Бічэль-Загнетавай і Юркі Голуба.

Ляшчынская А. Слова ў паэзіі Янкі Купалы. — Менск: Беларуская навука, 2004. — 272 с.

Манаграфія прысьвечана вобразна-выяўленчым сродкам паэзіі Янкі Купалы й асьвятляе таксама ягоную ролю ў станаўленьні беларускай літаратурнай мовы.

Чарнобыльскія матылі: Жыцьцё пасьля Чарнобылю / Рэд.-уклад. В.Вераб'ёва, Пер. М.Бенц і інш. — Менск: Рэсп. літ.-маст. фонд «Гронка», 2003. — 214 с.: іл. 1000 ас.

Сёньняшнія 20—22-гадовыя юнакі і дзяўчаты, у малым веку перажыўшы Чарнобыль, цяпер на сабе адчуваюць усе наступствы гэтае бяды. Новае пакаленьне беларусаў распавядае пра тое, чым сталася чарнобыльская аварыя ў іхным лёсе, — і гэтыя сьведчаньні сапраўды страшныя. Некаторыя вершы, малюнкі, апавяданьні друкуюцца ўжо па сьмерці аўтараў. Тэксты ў кнізе пададзены на ангельскай, беларускай, нямецкай і расейскай мовах.

Тацяна Вабішчэвіч

Чатыры дні — восем канцэртаў

Прыхільнікі айчыннай музыкі мусілі выбіраць між «Крамай» і Памідоравым, між Вайцюшкевічам і «Сьцяной», між аўтэнтыкай «Гуды» і фолькам «Pete Paff». Канцэрты пачыналіся адначасова, і некаторыя арганізатары панесьлі ў сувязі з гэтым страты.

Так, канцэрт у «NC» 27 траўня з удзелам «Гарацкіх» і берасьцейскай «Сьцяны» прыйшлося адмяніць, бо заля была пустая. Піт стаяў на ўваходзе цэлую гадзіну і асабіста вітаў кожнага наведніка. Паціснуў руку ён ня больш чым дзесяць разоў... Арганізатары прызналіся, што прагарэлі з рэклямай.

«Тэзаўрус» гэтым апраўдацца ня мог, бо рэклямная кампанія ў іх была даволі моцная. Канцэрт рок-гурт усё-такі даў, але колькасьць запрошаных гасьцей перавышала колькасьць тых, хто набыў квіткі.

Цікава, што «Гуда» сабрала больш гледачоў, чымся ўсе айчынныя рэпэры разам узятыя. Заля Тэатру эстрады была запоўнена дарэшты: былі там і падлеткі, і выкладчыкі ВНУ, і музыкі — у прыватнасьці, Аляксандра і Канстанцін. Акром сьпеваў, гледачы пачулі цэлую слайд-лекцыю пра паганства.

Падзялілі аўдыторыю і Памідораў з Варашкевічам. Аматары культурнага адпачынку абралі «Рэактар», слухалі музыку, елі ды закусвалі. Прыхільнікі камэрных вечарынаў пайшлі ў гэты час у Тэатар юнага гледача на «Краму». Такіх аказалася болей. Нават госьці Памідорава Алег Хаменка і Юлія Сеўрук перамясьціліся на канцэрт «Крамы». Тамсама быў Іван Кірчук, які перад канцэртам уласна прадаваў у фае новы альбом «Тройцы». Варашкевіч на канцэрце прыгадаў ня толькі гіты, але й кампазыцыі з «Хворага на рок-н-рол» і «Камэнданта», якія не выконваліся дзесяцігодзьдзе («Выпі са мной», «Малдаванка», «Паходная»).

На надзвычай энэргетычнай вечарыне Памідорава можна было пабачыць Лявона Вольскага з жонкай, Макса Івашына. Ніхто зь яе наведнікаў не шкадаваў аб выбары. Але хочацца спадзявацца, што надалей арганізатары будуць разумней плянаваць імпрэзы.

Сяргей Будкін

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Камэрная «Крама».

«Басовішча» –2004

Паколькі гэты фэст будзе амаль юбілейны — 15-ы па ліку, арганізатары зьбіраюцца звузіць конкурсную праграму і зрабіць стаўку на запрошаных гасьцей. У такой якасьці ў Польшчу паедуць «IQ-48», «БН», «Zet», «Нэйра Дзюбель», «Крама», «Уліс», «Pamidor/off», «Сьцяна», Кася Камоцкая. З польскага боку выступяць «Zero-85», «Triquetra», «Rima». Пад пытаньнем удзел леташніх пераможцаў — групы «Індыга». Як нам паведаміў беларускі каардынатар «Басовішча-2004» Аляксандар Памідораў, у конкурсе возьмуць удзел 7 беларускіх камандаў і 2-3 гурты з Польшчы (раней у конкурсе бралі ўдзел да 20 камандаў). Вызначаць вартых будуць наведнікі музычнага інтэрнэт-парталу «Тузін гітоў» (www.music.fromby.net), але апошняе слова застанецца за Памідоравым і Славам Коранем. Свае дыскі (30 хвілін музыкі, фота, кантакт) можна дасылаць да 20 чэрвеня на адрас: А.Памідораву, кампутарны клюб «О'К», вул.Інтэрнацыянальная, 9, 220050, Менск ці проста пакінуць дыск у гэтым клюбе на імя Памідорава.

Адбор па дысках дазваляе аб'ектыўна ацаніць вартасьць музычнага матэрыялу, які прэзэнтуе гурт. Аднак ступень сыгранасьці каманды, яе ўменьне паводзіцца на сцэне так вызначыць будзе цяжэй. Уся надзея — на вялізны досьвед і неаспрэчную сумленнасьць экспэртаў. Памідораў і Корань абяцаюць вызначыцца з канкурсантамі 1 ліпеня. Потым у адным зь менскіх клюбаў пройдзе паказальны канцэрт будучых удзельнікаў.

Сёлета адна з турагенцыяў будзе ладзіць адмысловы «тур на Басовішча» і гарантуе атрыманьне візы без чаргі.

СБ

ДЫСКАГРАФІЯ

Генэралы айчыннага року

(C)&(P) Кампіляцыя, БМАgroup/БелПІ.

Тут падабаецца ўсё. Маладога і юнага гледача няхіла шакуюць песьні старых гуртоў часоў распаду СССР: «Я рок-музыкант» ад «Мроі», «Прыйдзе іх дзень» ад «Бонды» і асабліва «Наш шлях» ад «Мясцовага часу». Да іх прымыкаюць Кася Камоцкая і «Zygimont VAZA». Рэвэрсія партызанскай «Лясной песьні» ў выкананьні «NRM» задзёрзкая, а ад таго і прыцягальная. Мусіць спадабацца ўсім рамантызатарам таварыша Чэ. «Нэйра Дзюбель» зь ледзяным сэрцам пужае вядоўцаў аналітычных праграмаў БТ няўстрымным «Belarus über alles». Стары гіт — упершыню па-беларуску (цікава, ці пераклаў ужо Вітаўт Мартыненка ляпісаўскія «Залатыя яйцы»?). Увогуле зь нямецкай мовай у 60-я ўгодкі выгнаньня фашыстоўцаў зь Беларусі ўсё нармальна: «Mein Faterland, auf wiedersehen» спявае «Крама», не даючы сябе пазнаць. Як Варашкевіч і абяцаў, «очань жорстка, хоць і не зусім панятна аб чом». Урэшце ёсьць магчымасьць заслухаць паўлегендарную Русю з «Indigo», якая трапіла ў анамальную зону і згледзела ў небе цэлыя «Тры сонцы». «Znich» ад усіх анамаліяў мае найвыдатнейшую дапамогу — «Крыжы-абярэгі». «Tesaurus» аруплены собскім replay'ем. «Zet» шпарка рушыў па сьлядох аднаго Бураціны і, каб не забыцца, дзе знаходзіцца, паўтарае чароўныя словы — трэкс-пэкс-фэкс («Краіна дурняў»). «Deadmarsh», узяўшы лішніх кіляграмаў (у сэнсе цяжкасьці музыкі), па-ранейшаму змагаецца з хімэрамі («Ня больш чым дым»). «Куклы» напэўна вельмі рады палітычным посьпехам Шварцэнэгера («Кібэр»). «Partyzone» працягвае даказваць, што ён не «Rammstein», а напару і тое, што «Сьмерці няма». «:Б:Н:» (такая назва на плытцы), вырваўшыся зь незабыўнай Бярозы, заўважыў, што навокал ня толькі мястэчкі, але й «Гарады» з аўтобусамі, тралейбусамі й заторамі. «P.L.A.N.» усур'ёзку загруз у шынку, кідаючы перад «Шынкарачкаю» панты пра багатых родзічаў. Па суседзтве «Ў карчме» даймае карчмітку «Стары Ольса», патрабуючы ня піва ёцавіцкага разьліву, а чыста канкрэтную крамбамбулю. Нават перад «Сьцяной» мы ўсе жадаем пабачыць чароўную «Вясну.by». Прыйдзе вясна з нашымі генэраламі.

Fuck show busine$$

«Montevideo». (F) 2003, FSB Records

На Бацькаўшчыне стае людцоў, якія намагаюцца супрацьстаяць (ці, прынамсі, выгляд робяць) камэрцыялізацыі музыкі, рухаючыся проці паноўнае плыні. Гэта кружэлка — тутэйшае «фэ» сусьветнаму шоўбізу. У 17 трэках «нямодные, але свабодныя» пераважна беларускія гурты (ёсьць адзін расейскі) перавярнулі навыварат гіты апошніх гадкоў так дваццаці пяці. Ніякае адмысловае канцэпцыі, акрамя сьцёбу і сёру, нашыя падземныя песьняры (ой, сад-анэрграўнд!) тут не запрэзэнтавалі. Кожны, відаць, проста ўзяў першую-лепшую песьню зь якога-кольвек «сраного хит-парада» і задаў ёй добрага жорсткаэратычнага дыхту (гл. яшчэ раз назву!). У бальшыні выпадкаў прадукт, не зважаючы на раскіданыя сям-там лёгкія лаяначкі, не адпрэчвае, што, у прынцыпе, зьдзіўляе. Вот слухаеш новыя ўвасабленьні гітоў «Ace of Base» ці «Desireless» (новыя хлопцы — «3t.ON» ды «Виниловые сны») і міжволі настальгуеш па піянерскіх дыскатэках пачатку 90-х: менавіта так рэзка і мусілі гучаць у вушах уражанага зьяўленьнем неўзаемнага каханьня і «All that she wants», і «Voyage». Складанка ўключае ў сябе стобэркаўцовыя (бэркавец — мера вагі ў ВКЛ ~74, 96 кг) гіты, якія пры жаданьні пэўных асобаў маглі б гучаць на нашых доблесных «радыёстэйшанах». Дзецюкі з «IQ-48» зусім па-даросламу палюбілі «In-Grid?», якая заклосьціла была ўсіх сабой і сваім баянам (на хвіга казе баян?), у выніку нарадзіўся цудоўненькі, але мурзаценькі «Талян, паавер!». Гурт «Alles Mein» рызыкоўна заняўся зводніцтвам, паяднаўшы ў адной пясьнюльцы лацінячку Shakir'у і чарнасоценца Ягорушку Летава («Луна и грош»). Пад чуйнымі рукамі й языкамі гурту «Атоми» Кайлі Міноўг, дакладней, яе «Can't get you out of my head» загучала больш пераканаўча і, я б сказаў, жыцьцесьцьвярджальна. Сярод паразаў кампіляцыі, як на мой густ і глузд, — DJ Stanny Tape зь перакручаным Эмінэмам. Лупня ад гэнага дыджэя зарабіў ня столькі беласкуры амэрыканскі рэпэр, колькі цэлае соймішча народу беларускае і расейскае, так бы мовіць, эстрады. Занадта зласьлівы атрымаўся сьцёбчык. Яшчэ адзін мінус кампіляцыі — адсутнасьць беларускае мовы. Усе кавэры або ў арыгінале, або па-расейску. Выдаўцы мяркуюць працягнуць сэрыю, абяцаючы прасабачыць маскальскую папсяціну і… айчынных зорак. Ой, мамуня, што ж гэта будзе!

Сяргей Балахонаў

ШТУРМ FM — 2

«Вока» і «BMA-group» пачынаюць новую кампанію

Больш за год ужо на нашых радыёстанцыях можна пачуць 50% беларускай музыкі. У гэтым, зразумела, нічога дрэннага няма! Але што ж мы бачым пасьля таго, як мінуў год? Як круцілі Б.Маісеева, Ю.Антонава, гурт «Краскі», «Бі-2», А.Сьвірыдаву і г.д., так і цяпер іх можна пачуць, але ўжо пад іншым лэйблам («Слухай сваё!»). Якія ж гэта беларускія выканаўцы? І яшчэ: расейскамоўны сьпеў ці можна назваць беларускай музыкай?!

Таму моладзевая ініцыятыва «ВОКА» і «BMA-group» распачалі кампанію «Штурм FM», асноўнай мэтай якой зьяўляецца павелічэньне колькасьці беларускамоўных кампазыцый у этэры радыёстанцый.

Як гэта будзе адбывацца:

1) вы рэгіструецеся;

2) за тыдзень да пачатку кампаніі Вам прыходзіць раскладка, якую радыёстанцыю і ў які дзень мы «штурмуем» (там будзе ўказаны час выхаду ў этэр);

3) Вы тэлефануеце ў этэр і замаўляеце беларускамоўныя песьні.

Заўвага: віншуючы сяброў, пажадана, каб Вы ў этэры размаўлялі па-беларуску. Але ж на якой мове гаварыць — гэта ваш выбар.

Рэгістрацыя. Дашлі на 220006, Мінск, а/с 104 (Алесю) імя, горад, паштовы адрас і сродак сувязі (тэл., e-mail).

Нават голы беларус застаецца беларусам



АЛЕНА АДАМЧЫК

З Адамам Глёбусам гутарыць крытык Ганна Кісьліцына.

Ганна Кісьліцына: Гаворачы пра літаратурныя падзеі 2003 г., цяжка абмінуць публікацыю дзёньнікаў Вячаслава Адамчыка, якія сталі сапраўднай скрыняй Пандоры. «Дзеяслоў», «Arche», «Маладосць», «ЛіМ»… Зьяўленьне кожнай новай часткі суправаджалася кулюарнымі дыскусіямі, якія зводзіліся да абмеркаваньня ня столькі літаратурных вартасьцяў дзёньнікаў, колькі да праблемы рэдагаваньня. Даволі складана ацаніць рашэньне пакінуць усё як ёсьць, але яшчэ складаней, напэўна, было Вам, бо Вы ня толькі ініцыятар публікацыі, але і яе герой, прычым герой хутчэй адмоўны, чым станоўчы. Такім чынам, Вы падставіліся двойчы, дадаўшы да свайго іміджу «апошняй свалаты» пару новых штрыхоў… Цікава, ці былі выданьні, што адмовіліся ад прапанаваных Вамі тэкстаў?

Адам Глёбус: Працу з татавымі дзёньнікамі я зьвёў да навукова-тэхнічнай: даручыў набраць тэксты з рукапісных сшыткаў, пракантраляваў адпаведнасьць набранага напісанаму, расклаў па датах напісаньня і разьнёс рукапісы па рэдакцыях тых часопісаў, дзе бацька рабіў публікацыі твораў.

Кожны з рэдактараў зрабіў уласную вэрсію дзёньнікаў. Віктар Шніп («ЛіМ» — **Рэд.**) аздобіў публікацыю здымкамі з подпісамі. Валерка Булгакаў («Arche» — **Рэд.**) акцэнтаваў палітычныя выказваньні і ў якасьці камэнтароў дадаў водгукі Абрамовіча і Мемуса, а таксама слова ад рэдакцыі. Раіса Баравікова («Маладосць» — **Рэд.**), наадварот, апусьціла эмацыйна-палітычныя пасажы, але надрукавала найбольшую колькасьць з прапанаванага. Барыс Пятровіч («Дзеяслоў» — **Рэд.**) пайшоў шляхам Баравіковай. Як зробіць публікацыю Мікола Мятліцкі, ня ведаю, спадзяюся, што ня горш за астатніх, тым больш што ў ягоным «Полымі» ляжаць апошнія словы, напісаныя татавай рукою. Зрэшты, у мяне дастаткова матэрыялу, каб зрабіць некаторыя абагульненьні. Тое, што сягоньня мае беларускі чытач, толькі частка дзёньнікаў. Публікацыі, зробленыя ў пэрыядычным друку, мелі шматлікія і разнастайныя водгукі, часам вельмі палярныя, а часам занадта эмацыйныя. Тое, што апублікавалася, — у большай ступені вэрсіі рэдактараў, а не мае. Мой варыянт чакае нашых чытачоў наперадзе, калі дзёньнікі выйдуць асобнай кнігаю.

Асноўны папрок, які чую ад апанэнтаў… «Каму патрэбна аголеная праўда? Ці трэба выносіць на публіку інтымныя бакі сямейнага жыцьця? Сораму ў Вас няма!» Ёсьць і яшчэ адно рытарычнае пытаньне… «Ці хацеў Ваш бацька, каб дзёньнікі былі апублікаваныя менавіта ў такім выглядзе?» Магу запэўніць публіку, што тата меў намер апублікаваць штодзённыя запісы. Частку зь іх ён і апублікаваў. Пэўна, як і кожны літаратар, ён бы іх дапрацоўваў і, магчыма, шмат якія фрагмэнты зьняліся б, а нешта дадалося і дапісалася б. Але гэта толькі мая вэрсія. А фактам застаецца тое, што бацька неаднаразова мне і брату майму Міраславу казаў, што ягоныя дзёньнікі, якія пісаліся таемна, хаваліся ад варожага вока, пісаліся, як асноўная кніга жыцьця. Каб ён не хацеў публікацыі, ён меў шмат магчымасьцяў іх зьнішчыць ці сказаць пра тое нам. У зьвязку з гэтымі развагамі варта нагадаць, што мёртвыя ня ведаюць сораму. Сорам — прыярытэт жывых, нас з вамі.

А тое, што ніхто не адмовіўся ад прапанаваных мною тэкстаў, толькі даказвае значнасьць бацькавай літаратурнай спадчыны.

Г.К.: Праўда можа быць толькі голай. Аднак літаратура вымагае мастацкай праўды, а гэта розныя паняцьці. Ці мае сэнс тое літаратурнае распрананьне, што Вы пачалі на старонках беларускага друку?

А.Г.: Гісторыя літаратуры поўніцца распрананьнямі і апрананьнямі. Калі распранаешся, варта думаць і пра тое, як будзеш потым апранацца, як хутка зможаш апрануцца і ў што апранешся. Кашулі-вышыванкі, саламяныя брылі, сачыкі, андаракі, буркі, валёнкі… Каб Вы толькі ведалі, як мне абрыдлі гэтыя нацкалярыты, нацдушкі, нацасаблівасьці, фолькідыёцтвы, сувэнірныя крамы псэўдатрадыцыяў. Ну хіба можна, стоячы ў палітоне з крамы «Бос», нацягнуць на патыліцу саламяны брылёк? Вось гэты віртуальны брыль я і зьбіваю з галавы Пушкіна. А ён, наш Пушкін зь вёскі Бобр, яшчэ крыўдуе; адно добра — ня доўга тая крыўда жыве ў ягоным мастакоўскім сэрцы.

Варта прыгадаць тэорыю літаратуразнаўца Каваленкі, які заўважыў паскоранае разьвіцьцё айчыннай літаратуры. Нешта падобнае адбывалася зь японскім прыгожым пісьменствам напрыканцы XIX ст., калі каштоўнасьці эўрапейскай цывілізацыі прыйшлі на выспы Далёкага Ўсходу. Дзёньнікі Акутагавы і Такубоку яскрава сьведчаць, як цяжка, як пакутліва зьдзіралася зь японца паношанае кімано і зь якімі цяжкасьцямі апранаўся стыльны эўрапейскі строй. У Японіі была процьма аўтараў, што спрабавалі нацягнуць смокінг наверх традыцыйнай апранахі. Так яны нібыта захоўвалі самабытнасьць. Насамрэч яны выглядалі бяздарнымі блазнамі, вартымі жалю. Так было, пакуль усе не пераканаліся, што японец, апрануты па-эўрапейску, застаецца японцам. Так і беларус застаецца беларусам, нават калі ён суцэльна голы. А кашуля-вышыванка не дадае беларускасьці, а, наадварот, прыніжае і дыскрэдытуе яе, апускае нацыянальнае да таннай сувэнірнай этнаграфічнасьці.

Г.К.: Калі ў «Дамавіках» Вы дапамагаеце людзям распранацца, то ў «Сучасьніках» хутчэй зрываеце зь іх апранахі… Цяжка прыгадаць эпізод — акрамя, зразумела, тых, дзе гаворка ідзе пра членаў Вашай сям'і,— каб Вы каго пахвалілі. І хоць Вы любіце паўтараць, што толькі крыўдзіце, але ніколі не абражаеце, відавочна, што абражаных ня менш, чым пакрыўджаных. Некаторыя робяць выгляд, што не чыталі, некаторыя — як я, напрыклад, — што іх гэта не кранае. Цікава, а ці былі такія, хто паспрабаваў адстаяць свой гонар у судзе ці хаця б даць па мордзе?

А.Г.: Ухваленьні і цёплыя словы хутка забываюцца, а крыўды помняцца доўга. Можа, таму і варта часьцей паўтараць словы ўдзячнасьці. Менавіта з пачуцьцём удзячнасьці я напісаў вялікі разьдзел у кнігу «Сучасьнікі», якая называецца «Настаўнікі». У ёй я выказаў удзячнасьць усім, хто ахвяраваў свой час, каб мяне вучыць. Працуючы ў некалі вельмі папулярным часопісе «Крыніца», я штомесяц публікаваў артыкулы, дзе бараніў і ўхваляў мастакоў, літаратараў і музыкаў, якія стварылі новую культурна-палітычную сытуацыю, што і прывяла да руйнаваньня імпэрыі злобы і стварэньня новых незалежных дзяржаў.

Цяпер да морды ў судзе…

Фарсава-правакацыйная спроба адстойваць свой нібыта гонар у судзе была. Каб я давёў суду пра зладзейскую дзейнасьць гэтага чалавека, ён бы апынуўся ў турме. Садзіць чалавека за краты я не зьбіраўся. Таму я патлумачыў сваю пазыцыю: я пішу мастацкія творы, а ня рапартавую журналістыку.

Калі трэба некаму даць па твары, магу і даць. Толькі мне цяжка зразумець людзей, што на газэтную нататку адказваюць позваю ў суд. Яны пераводзяць спрэчку на іншы ўзровень. На артыкул трэба адказваць артыкулам, на постынг — постынгам, на судовы працэс — сустрэчным судовым працэсам, як на ўдар — ударам. Пераскокваньне да больш жорсткіх мераў толькі падкрэсьлівае няздатнасьць адказаць на сваім адпаведным узроўні.

Судзіцца з аўтарам тэкстаў, у якіх нехта пазнаў свае рысы, — старая завядзёнка, праз гэта Дантэ выгналі з роднага гораду, праз гэта Джэймс Джойс пакінуў Дублін, праз гэта Сакрат мусіў выпіць атруту… Сьпіс памылак і трагедый бясконцы.

Г.К.: Месца знаходжаньня ўплывае на чалавечыя паводзіны. Вось і Вы ў сваіх падарожных нататках зусім іншы. Выхад Вашых «Сшыткаў» прымусіў мяне задумацца — Вы сьвядома падзяляеце вобраз апавядальніка ў розных жанрах, пакідаючы хабальства «Сучасьнікам», сарказм — «Расейскай кунсткамэры», лірызм — «Жонцы»?

А.Г.: Розныя тэмы патрабуюць рознай танальнасьці ў расповедзе. Нават калі я пішу тэксты ад першай асобы, гэта не азначае поўнай тоеснасьці майго «я» і апавядальніка. Таму і вынайдзена гульня з псэўданімамі. Напрыклад, падарожныя нататкі, што склаліся ў кнігу «Сшыткі», спачатку друкаваліся ў «НН» і часопісе «Бярозка» пад псэўданімам Антон Бакіноўскі.

Клімат, асяродзьдзе, краявід, атачэньне на мяне ўплываюць. Дзіўна было б, каб не ўплывалі.

Некалі Іван Мележ вярнуўся з Англіі і мой бацька спытаў: «Як там, у Вялікай Брытаніі?» — «Ведаеш, Чэсь, шукаў я там сваю вёску Глінішчы і не знайшоў!» Дзякуючы Мележу я не шукаю за мяжой Беларусі і беларусаў, для мяне іх больш чым дастаткова на Радзіме.

Г.К.: У «Сшытках» заўважаецца, як многа Вы разважаеце пра рэлігію. Мне цяжка прыгадаць беларускага пісьменьніка, які б так многа і адкрыта гаварыў пра свае стасункі з Богам. Гэта нечакана пасьля «Дамавікоў»...

А.Г.: Скажу так: я шмат зрабіў і раблю добрага тым людзям, што шчыра вераць у Бога. Некалькі гадоў я адпрацаваў на рэстаўрацыі касьцёлу ў Мсьціславе. Дапамагаў аднавіць працу касьцёлу ў сваім родным Койданаве. Мае погляды не супадаюць зь перакананьнямі сярэднестатыстычных вернікаў. У мяне шмат сумневаў. Ёсьць пытаньні пра Бога, на якія я не магу даць адказ. Ёсьць пытаньні да Бога, якія я не наважваюся агучваць. Для мяне саборы — творы мастацтва, творы сынтэзу самых розных мастацтваў: тэатру, музыкі, літаратуры, слова. А рэлігійны мае пачуцьці ў саборах другасныя, менш яркія, больш таямнічыя, амаль неспасьцігальныя і непраясьненыя.

Яшчэ цямнейшыя мае ўзаемаадносіны з д'яблам і ягоным незьлічоным войскам. Тут адносіны ня проста цёмныя, а чорныя зусім, як настрой удзельніка чорнай імшы.

У стасунках з Богам мне пасярэднікі не патрэбныя. Калі выходжу з царквы на сонечны пляц, Бог робіцца бліжэйшым.

Вечарына-прэзэнтацыя раману Глёбуса «Дом» пройдзе ў вялікай залі Дому літаратара 9 чэрвеня. Пачатак а 19-й. Сьпявае «NRM». Уваход вольны.

Сустрэчы з Труэлем



У Менск прыяжджае рэжысэр Ян Труэль, клясык швэдзкага кіно.

Ягоная карціна «Гэта тваё жыцьцё» (1966) лічыцца адной з найлепшых швэдзкіх карцінаў усіх часоў. Посьпех Труэль замацаваў фільмам «Энэ, бэнэ, рэс» (1967), за які атрымаў галоўную прэмію на МКФ у Бэрліне. Адзін з апошніх сваіх фільмаў, «Белы як сьнег» (2001), рэжысэр прэзэнтуе **6 чэрвеня** а 18-й у кінатэатры «Перамога»). А 15-й у Нацыянальным музэі гісторыі і культуры адбудзецца прэс-канфэрэнцыя з удзелам швэдзкага госьця. А ў панядзелак **7 чэрвеня** а 15-й Ян Труэль сустракаецца з студэнтамі Акадэміі мастацтваў (пр.Скарыны, 81).

АР

Гандбол

5 чэрвеня ў Палацы лёгкай атлетыкі (пр.Скарыны, 196) адбудзецца адборачная гульня «плэй-оф» Чэмпіянату Эўропы сярод жанчын нацыянальных каманд па гандболе (Беларусь—Азэрбайджан). Пачатак а 16-й.

НАВІНЫ

Ратаваньне паркаў

Беларуская асацыяцыя студэнтаў-архітэктараў распачала праграму захаваньня і выратаваньня помнікаў горадабудаўніцтва і ляндшафту. Сёлета пройдуць летнікі ў парках Нясьвіжу, каля замку ў Гальшанах і ў мястэчку Любчы (Навагрудчына).

Кіно пра гетмана Хадкевіча

Здымкі пачнуцца гэтым летам у Хоцінскай крэпасьці ва Ўкраіне.

Фільм пра Хоцімскую бітву 1621 г. мае здымаць вядомы польскі рэжысэр Ежы Гофман. У той бітве аб'яднанае войска Рэчы Паспалітай пад ачольніцтвам гетмана Яна-Караля Хадкевіча і Запароскае Сечы на чале з гетманам Пятром Сагайдачным разьбіла армію султана Асмана II. Пра гетмана Хадкевіча можна прачытаць у кнізе Міхася Чарняўскага «Правадыр крылатых вершнікаў» у сэрыі «Нашы славутыя землякі».

Чэскі літмаратон

З 27 траўня да 1 чэрвеня ў Празе адбыўся VII літаратурны маратон «Нон-стоп чытаньня чэскай літаратуры». Прафэсійныя артысты, грамадзкія дзеячы і простыя чытачы з 16 краін сьвету агучвалі 15-хвілінныя ўрыўкі з твораў чэскай літаратуры на розных мовах. Чытаньні адбываліся пасьлядоўна ў Празе і чэскіх цэнтрах за мяжой, скончыўся маратон у Нью-Ёрку.

АШ

Выставы

Своечасовы плякат

Да 16 чэрвеня ў Галерэі ЭГУ (пр.Скарыны, 24) экспануецца выстава «Своечасовы беларускі плякат».

Краявід з прыдурам

Да 6 чэрвеня Музэй сучаснага выяўленчага мастацтва запрашае паглядзець экспазыцыю карцін і гравюр Сяргея Баленкі «Гарадзкі краявід з прыдурам», прысьвечаную 50-годзьдзю мастака.

Дзёньнік адлюстраваньняў

З 4 да 18 чэрвеня ў галерэі візуальных мастацтваў «Nova» экспануецца выстава фатаздымкаў Аляксея Андрэева «Дзёньнік адлюстраваньняў». Прэзэнтацыя адбудзецца 4 чэрвеня а 18-й.

Белагра-2004

З 8 да 11 чэрвеня на Машэрава, 14 адбудзецца міжнародная спэцыялізаваная выстава «Белагра-2004» — традыцыйны штогадовы форум работнікаў сельскай гаспадаркі.

Галерэя «Эрмітаж»

Да 9 чэрвеня працуе выстава «Карнавал», якая аб'ядноўвае карціны Андрэя Смоляка і лялькі ў карнавальным стылі Ганны Балаш. Т.: 229-27-07.

Мастацкі музэй

Да 1 ліпеня можна паглядзець выставу, прысьвечаную 90-годзьдзю архітэктара М.Бакланава.

Гістарычны музэй

З 3 чэрвеня да 1 ліпеня працуе выстава дзіцячага малюнку **«І як цудоўна вяртацца пад дах уласнага дому»**, прысьвечаная Міжнароднаму дню ўцекачоў. Тамсама можна наведаць выставу **«Ў пошуках страчанага»**, прысьвечаную вытокам Гістарычнага музэю, і выставу **«Вобраз Маці Божай у іканапісе»**, якая будзе працаваць да канца чэрвеня.

У філіі музэю на Фрунзэ, 19 працуе выстава **«Праз далячынь стагодзьдзяў»** — абразы, этнаграфія, традыцыйнае народнае мастацтва.

Канцэрты

Парад мадэлек

5 чэрвеня ў Палацы Рэспублікі — парад мадэлек «Твар новага стагодзьдзя». Тамсама **10 чэрвеня** — канцэрт Аляксандра Сярова. Пачатак а 19-й. Квіткі: ад 20000 да 100000.

Заля камэрнай музыкі

4 (пт) — канцэрт камэрных твораў беларускіх і замежных кампазытараў. Уваход вольны.

7 (пн) — канцэрт арганнай і фартэпіяннай музыкі.

15 (аўт) — канцэрт заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусі Галіны Паўлёнак. Пачатак а 19-й. Квіткі — 4000.

Тэатры

Цэнтральны дом афіцэраў

9 (ср) — «Сыльвія, ці Сабака на сцэне».

Купалаўскі тэатар, Малая сцэна

5 (сб) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».

9 (ср), **10** (чц), **11** (пт), **12** (сб) — спэктакль «Эрык XIV» паводле Аўгуста Стрындбэрга. А.Стрындбэрг апісвае ў сваім творы рэальныя падзеі. Кароль Эрык XIV зрабіўся валадаром Швэцыі ў XVI ст. Ён закахаўся ў звычайную дзяўчыну, дачку вайскоўца-ахоўніка, якую кароль выпадкова сустрэў у адным з шынкоў Стакгольму... Рэжысэр-пастаноўшчык — народны артыст Беларусі Валеры Раеўскі, мастак — народны мастак Беларусі Барыс Герлаван, кампазытар — Віктар Капыцько.

Опэра

5 (сб) — «Чыё-чыё-сан».
6 (ндз) — «Іялянта».
10 (чц) — «Сэвільскі цырульнік».

Балет

4 (пт) — «Сьпячая красуня».
8 (аўт) — «Жызэль».
9 (ср) — «Спартак».

Музычны тэатар

6 (ндз) — «Вясёлая ўдава».
7 (пн), **8** (аўт) — «Юнона і Авось».

Клюбнае жыцьцё

Bronx

4 (пт), 23.00 — live Jazz.
5 (сб), 23.00 — твар новага стагодзьдзя. «Beauty show final party»: dj Benua, dj Andrius Alien (Happyendless dj's, LT).

Гудвін

4 (пт), 21.00 — жывая музыка.

Ямайка

4 (пт), 3.00 — Preparty + Afrter party.
5 (сб), 3.00 — Afrter party.

Presto

5 (сб), 22.00 — «The Plastic World»: dj LK aka Конь, dj Arsenti Tchouprina.

Рэактар

4-5 (пт, сб)**, 11-12** (пт, сб) — Love Parade. Беларусь-2004. Штогадовы парад любімай музыкі.

Graffiti Club

4 (пт), 20.00 — ВечаROK-музыкі «Бяз панікі». Уваход толькі па картах клюбу.
5 (сб) — канцэрт Дзьмітрыя Авілава і Аляксандра Антаноса.
7 (пн), 20.00 — Нагуаль і Драбінска (Расея—Баўгарыя—Малдова—Сэрбія). Выконваюцца народныя мэлёдыі і сьпевы. Інструмэнты: кавал, гайда, кабза, уд, цылінка, клярнэт. Т.: 671-58-65.

Кінаафіша

«Аўрора» (253-33-60)
«Гары Потэр і вязень Азкабану» (прэм'ера): **4—6** (пт—ндз) 13.00, 14.30, 15.40, 18.20, 19.30, 21.00.
«Неслужбовае заданьне» (да 60-годзьдзя вызваленьня Беларусі): **4—6** (пт—ндз) 17.10.

«Бярэсьце» (272-87-91)
«50 першых пацалункаў»: **4** (пт) 16.30, 21.00; **5, 6** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.30, 21.00.
«Барвовыя рэкі-2: анёлы Апакаліпсысу»****: **4—6** (пт—ндз) 19.00.

«Дружба» (240-90-13)
«Троя»: **4** (пт) 18.00, 21.00; **5** (сб) 15.00 (іл), 18.00, 21.00; **6** (ндз) 15.00, 18.00, 21.00.

«Кастрычнік» (232-93-25)
«Гары Потэр і вязень Азкабану» (прэм'ера): **4** (пт) 15.20, 18.10, 21.00 (прэзэнтацыя фільму); **5, 6** (сб, ндз) 15.20 (іл), 18.10, 21.00.

«Масква» (223-27-10)
«Гары Потэр і вязень Азкабану» (прэм'ера): **4** (пт) 16.00, 18.30; **5, 6** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30.
«Троя»: **4—6** (пт—ндз) 21.00.

«Мір» (288-22-33)
«Пітэр Пэн» (прэм'ера): **4** (пт) 15.00; **5, 6** (сб, ндз) 11.00, 15.00.
«А вось і Полі»: **4—6** (пт—ндз) 17.10, 19.10, 21.10.

«Перамога» (223-77-66)
«Пітэр Пэн» (прэм'ера): **4** (пт) 14.00, 16.30; **5** (сб) 14.00 (іл), 16.30; **6** (ндз) 15.00 (іл).
«Нават ня думай-2: цень незалежнасьці»: **4, 5** (пт, сб) 19.00, 21.10; **6** (ндз) 21.20.
«Белы як сьнег» (рэтраспэктыва фільмаў рэжысэра Яна Труэля): **6** (ндз) 18.00 (сустрэча з рэжысэрам).

«Піянер» (227-64-87)
«Выкрадальнікі кніг»: **4—6** (пт—ндз) 19.00.
«Дом зь пяску і туману» («Оскар-2004»): **4—6** (пт—ндз) 16.30, 21.00.

«Цэнтральны» (220-34-16)
«Мільён год да нашай эры»: **4** (пт) 11.00, 13.30. 18.20; **5, 6** (сб, ндз) 11.00 (іл), 13.30, 18.20.
«Іншы сьвет»***: **4—6** (пт—ндз) 15.50, 20.30.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

Для дзетак

Балет

6 (ндз) — «Беласьнежка і сем гномаў».

Тэатар юнага гледача

3 (чц), **4** (пт) — «Палёт у краіну мрой».
7 (пт), **8** (сб) — «Шлях у Батлеем».

Моладзевы тэатар

3 (чц) — «На шчупаковы загад».

Тэатар «Дзе-я?»

10 (чц) — «Зачараваная прынцэса».

Цырк

З 6 чэрвеня пачынаецца новая праграма — праект Тацяны Бандарчук «Прысьвячэньне». Т.: 236-10-08, 227-22-45.

Кіно

«Аўрора»
«Цімур і яго камандас» (прэм'ера): **4** (пт) 11.00; **5, 6** (сб, ндз) 12.00.
«Плянэта скарбаў»: **4** (пт) 10.30.

«Бярэсьце»
«Атлянтыда: згубленая імпэрыя»: **4** (пт) 10.30; **5, 6** (сб, ндз) 12.00.

«Дружба»
«У пошуках Нэма»: **4** (пт) 11.00, 13.00; **5, 6** (сб, ндз) 13.00.

«Мір»
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **4—6** (пт—ндз) 13.00.
«Гуляй як Бэкхем»: **4** (пт) 10.30.

«Піянер»
«Два байцы» (да 60-годзьдзя вызваленьня Беларусі): **4** (пт) 12.00.
«Карлік Нос»: **5, 6** (сб, ндз) 12.00.
«Абрафакс пад пірацкім сьцягам»: **4—6** (пт—ндз) 10.20.
«Тайна Блакітнай даліны»: **4** (пт) 14.20; **5, 6** (сб, ндз) 14.00.

Падрыхтавалі Наста Бакшанская і Сяргей Петрыкевіч

КУЛЬТУРА UNUSUAL

Скокі на балоце

«Жабін склеп» у пастаноўцы студэнтаў Унівэрсытэту культуры

Крапівоўская традыцыя ўзноўлена ва Ўнівэрсытэце культуры. Новая кардонна-акустычная пастаноўка «Жабін склеп» ускалыхнула багвіньне культурніцкага балота. Гледачы адчулі сябе гэткімі мужнымі жабяняткамі, здольнымі выкараскацца са збана ды паўдзельнічаць у пэрформансе. Усе, хто прарваўся праз ахову, хаваліся ад сухога афіцыйнага сьвету пад парасонікам натхняльніцы-Аксаны. Джэці ды Віктар Жыбуль зладзілі скокі ў стылі хваробы сьвятога Віта й практыкавалі моўную эквілібрыстыку. Анёл-абаронца ўсіх амфібіяў (С)адам зьяўляўся адначасна добрым дзядзькам-гайдам ды ід(э)алам сысуноў. Вершы-пагрозы забойцам жабак разбаўляліся сьпевамі несагрэтых дзявочым каханьнем удзельнікаў гурту «Жаба ў каляіне», уяўным лыканьнем з экзатычных пляшак («Бясхвостая русалка» — улюбёнка маленькіх лусканапаветраных пярэваратняў) ды рытуальнымі стогнамі гуманістых з «Рэха». Якасны мікс нагадаў нацыянальную страву з «моху-чартапалоху ды ўсяго іншага патроху, аздобленую чарвячыным маслам ды жабінымі лапкамі». На шчасьце жабафілаў, буслы-цэнзары на імпрэзе адсутнічалі.

Лошыца-мікс

Веснавы рыцарскі фэст

Травеньскі фэст — геданічная сумесь старадаўняга сьвята (турніры, строі ды кірмашовы тлум), савецкага мерапрыемства (шашлыкі, адсутнасьць алькаголю й наяўнасьць дзяржаўных службоўцаў) ды сьвецкае тусоўкі (ад знаёмых мызаў можна было схавацца хіба ў хмызох. І адтуль выкалупвалі!). Бракавала толькі сярэднявечных страваў (смажанага на ражончыку зубра ці вэнджанага языка лошыцкага цмока).

Атмасфэра турніраў ускалыхнула рэшткі мае шляхетнае крыві. Бы прапрапра…-бабуля Барбара, здольная была з анёльскаю ўсьмешкай падаць знаку: «Забі!» Зацягваў дэмакратычны карагод ды заклікалі размаітыя рамесьніцкія вырабы (ад папсовых саламяных кветак да аўтэнтычнага посуду). Здавалася, імпрэза, як прыдбаны пярсьцёнак (шатляндзкі арнамэнт? любі беларускае, хлопча!), ня мае ні пачатку, ні лягічнага заканчэньня. Памылкова. Праўду ведаў толькі нязьведзены лошыцкі цмок. Але чамусьці маўчаў.

Болачка

КІНО Ў МЕНСКУ

З такімі анёламі апакаліпсысу не дачакаешся

KINO.URAL.RU

«Барвовыя рэкі-2: анёлы Апакаліпсысу» («Les Rivières Pourpres-2: Les anges de l'apocalypse»)
Францыя—Італія—Вялікабрытанія, 2004, каляровы, 100 хв.
Жанр: Містычны фільм жахаў, баявік
Адзнака: 4,5 (з 10)

У закінутым і забытым Богам кляштары знаходзяць труп чалавека, якога нядаўна замуравалі зажыва. Разбор гэтай жорсткай справы пачынае адзіны ўдзельнік папярэдняй сэрыі інспэктар Німан (у выкананьні соннага Жана Рэно). Забойствы працягваюцца, а порсткі капітан Рэда (узыходзячая зорка францускага кіно Бэнуа Мажымэль, якога ў свой час катавала «Піяністка») сутыкаецца з чалавекам, падобным да Хрыста, якога перасьледуюць невядомыя сэктанты.

Дзьве францускія зоркі аб'ядноўваюць свае высілкі, каб змагацца з таямнічымі баявымі манахамі, знайсьці патаемныя хады ў лініі Мажыно і спыніць Апакаліпсыс, які зьбіраюцца распачаць недабітыя нацысты на чале з Крыстофэрам Лі, культавай фігурай жудасьцікаў.

Манахі ў змрочных капелюшах, бяз твараў і са звышнатуральнымі здольнасьцямі — кінэматаграфічныя. Яны не зусім пасуюць старой фабрыцы, але ў сутарэньнях кляштару і нават у супэрмаркеце містычныя істоты да месца. Што ж да звышнатуральнага, то, калі невядомы манах пачынае з празьмерным імпэтам дэманстраваць каратысцкія схільнасьці, гэта таксама ня надта адпавядае ягонаму сану.

Апэратарская работа Алекса Лямарка сьлізка-чырвоная, чорная, хаця й саступае барвовым выявам першай часткі. Жан Рэно затарможаны, амаль што ніякі, Бэнуа Мажымэль занадта імпэтны. Карціна атрымліваецца пуставатай. Імя Люка Бэсона — як аўтара сцэнару — усё яшчэ гарантуе дынаміку, але зусім не гарантуе глыбіні.

Андрэй Расінскі

Мёртвыя

Уладзімер Арлоў

Боля

Адзінае, што табе недаспадобы ў антычным сьвеце, — ідыёцкая звычка старажытных грэкаў напалам разбаўляць віно вадою. Ты ўпэўнены, што калі б эліны спажывалі чысты прадукт, іх даробак у цывілізацыі быў бы прынамсі ўдвая значнейшы.

Да прыкладу, апісваючы асноўныя чалавечыя пачуцьці, Арыстотэль несумненна пайшоў бы далей, а не спыніўся на пяці, спарадзіўшы гэтым самым спрэчку: якое ж пачуцьцё ў прапанаванай ім сыстэме мае падставы прэтэндаваць на шостае месца? Часу? Раўнавагі? Небясьпекі? Каханьня?

А можа — болю?

«Мама! Боля! — крычыш ты, уцякаючы ад кусту агрэсту, што да крыві пакалоў табе ручкі, а цяпер, табе здаецца, гоніцца за табою па сьцежцы, каб пакалоць дупцю. — Боля!»

Табе два гады. «Боля» — адзін зь першых успамінаў у тваім і, напэўна, ня толькі ў тваім жыцьці.

Тады «боля» сьведчыла, што ты *ўжо* жывы. Цяпер яна нагадвае, што ты жывы — *яшчэ*.

Адсякаючы ўсё астатняе, боль здатны прывесьці ў стан, блізкі да дзэну.

Боль мае дзясяткі, а мо й сотні эпітэтаў: востры і тупы, манатонны і маланкавы, калючы і пякучы, кусьлівы і дзяўблівы, казытлівы і грызьлівы, ясны і цёмны, бясконцы і бязьмежны...

Апошні эпітэт недакладны. Боль не бывае бязьмежным: ён дакладна абмежаваны тваім целам. Цяжка хворы на сьпінную сухотку Альфонс Дадэ занатоўваў у дзёньніку: «Кожны робіць сабе свой боль, а пакуты мяняюцца, як голас сьпевака, у залежнасьці ад акустыкі залі».

Боль падзяляе людзей на тых, хто баіцца і пазьбягае яго любой цаною, нават цаною сьмерці, і на тых, хто здольны зь ім паразумецца, знайсьці ў ім ацаленьне, зазірнуць у прадоньне, дзе варушацца пачвары, і ўзьняцца ў зааблочча да анёлаў.

Самагубства як вызваленьне ад нясьцерпнага болю можна лічыць формаю эўтаназіі (у шырокім сэнсе таксама). З другога боку, мэдыцына ведае выпадкі, калі хворы абірае лёс homini dolorosi (чалавека, што заўсёды пакутуе ад болю) і адмаўляецца ад лекаваньня.

Боль — твой даўні суразмоўца. Боль — неадлучны ад цябе зьвярок, зрэдку паслухмяны і нават камфортны, але найчасьцей — капрызьлівы і жорсткі. Часам табе ўдаецца яго залагодзіць, аднак зазвычай ніякія ласункі й атруты на яго ня дзейнічаюць.

Зьвярок ня раз пераўвасабляўся ў зьвера і ператвараў тваё жыцьцё ўжо не ў чысьцец, а ў само пекла. Ты падазраеш, што ў раі лепшы клімат, затое ў пекле бязьмерна цікавейшая кампанія, але ў такія дні ты згодны і на абсалютна бязьлюдны выстылы рай. У такія дні на ўсю поўніцу разумееш сёмага пракуратара Юдэі, якому мроіўся кубак зь цёмным выратавальным пітвом.

На тваё жыцьцё выпала столькі фізычнага болю, што безь яго ты ня стаў бы самім сабою, гэтаксама як быў бы зусім іншым без сваіх ворагаў, сяброў і каханых. Ты падумваеш напісаць пра яго, боль, эсэ, аднак пакуль нешта замінае. Магчыма, ты ўнікаеш канфлікту з уласным болем, якому, можа, не спадабаецца роля паддосьледнага. Магчыма, ты не сасьпеў для інтымных прызнаньняў такога кшталту, таму што боль — адна з найінтымнейшых рэчаў. А магчыма, прычына больш простая: перажытага табой болю для прысьвечанага яму эсэ яшчэ бракуе. Гэта абнадзейвае.

Моцныя натуры ўва ўсе эпохі імкнуліся быць гаспадарамі свайго болю. Кант пераадольваў яго філязофскім здумленьнем. Блез Паскаль зьнясільваў цяжкі нэўралягічны боль складанымі матэматычнымі вылічэньнямі. Фройд апошнія гады працаваў, не зважаючы на пакуты ад ракавай пухліны ў роце.

Ты — пішаш. Гэта дапамагае, хоць і не заўсёды.

Напэўна, тваё будучае эсэ пачнецца з думкі, што лёгка змагчы толькі адзін боль. Боль іншага.

Добры доктар Дурымар

Мастацтва мэдыцыны, пісаў Гіпакрат, складаецца з трох элемэнтаў: хваробы, хворага і лекара. Ня бачачы вялікай розьніцы паміж мудрасьцю й мэдыцынай, ён параўноўваў лекара зь філёзафам.

Табе больш падабаецца іншае параўнаньне — з дэтэктывам. Хворы паведамляе пра свой боль, і доктар, учапіўшыся за гэтую нітачку, мусіць разблытаць увесь клубок, каб прадухіліць магчымае забойства.

Дагэтуль табе не сустрэўся доктар, які справіўся б з тваім клубком. Але, з другога боку, высілкі «дэтэктываў» далі пэўны эфэкт, доказам чаго ёсьць тое, што зараз ты сядзіш за пісьмовым сталом, а не бесклапотна спачываеш у зацішным кутку полацкіх Ксавэр'еўскіх могілкаў.

Ты пакуль тут, а некаторыя дактары, якія цябе лекавалі, пасьпелі, як кажуць японцы, памяняць сьветы. Але гэта хісткае суцяшэньне: мо якраз яны, ужо адсутныя, і здолелі б выбавіць цябе з вартаванай болем мэтафізычнай вальеры, што почасту сьціскаецца да памераў клеткі.

Пра тых, хто змагаўся за тваё вызваленьне, ты ўжо можаш напісаць прыстойную кнігу, поўную любові і ўдзячнасьці, захапленьня й расчараваньня, зьедлівасьці й пагарды.

Сярод яе пэрсанажаў прысутнічаў бы доктар, які ставіў цябе на ногі так натхнёна, што праз колькі месяцаў ягоныя калегі ўсё ж здолелі выратаваць цябе ад вынікаў лекаваньня. Затое Бог шчодра надзяліў згаданага спэцыяліста талентам красамоўцы. Ён называў хваробу драмай у дзьвюх дзеях, зь якіх першая разыгрываецца ў нашых істотах у глыбокай цемры, без усялякага намёку на бяду, і толькі ў другой пачынаюць запальвацца сьвечкі, вястункі пажару, патушыць які падчас бывае немагчыма.

Паміж тваіх лекараў былі прафэсары, дацэнты, таленавітыя практыкі і ня менш таленавітыя хлусы і круцялі. Адзін доктар апрача клясычнае акупунктуры глыбока разьбіраўся ў клясычнай кітайскай філязофіі. У кабінэце другога зь нямецкамоўнымі трактатамі пра піеланэфрыты і нэфрасклерозы суседнічалі на кніжнай паліцы «Дзікае паляваньне караля Стаха» і «Ладзьдзя роспачы». Трэці найлепей знаўся не ў мікробах, зь якімі яму выпала доля змагацца, а ў конях і спартоўках, што выяжджалі на іх на манэж. (За своеасаблівую індульгенцыю эскуляп меў выслоўе пра тое, што мэдыцына, паводле дакладнасьці, ідзе ўсьлед за тэалёгіяй.) Чацьверты лічыў абавязкам падрабязна знаёміць цябе з букетам уласных хваробаў, што, на шчасьце, не заміналі яму цешыцца цэлым суквецьцем каханак, пра якіх ён распавядаў гэтаксама ахвотна й дэталёва. Пяты дасягаў пэўнага псыхатэрапэўтычнага эфэкту тым, што выдаваў табе белы халат і браў з сабою на абход палатаў зь безнадзейнымі пацыентамі. Шосты бліскуча абвяргаў назіраньне Мантэня пра тое, што хмурны доктар не дасягне ў сваім рамястве аніякага посьпеху...

Сьветач лазэрнай хірургіі расказваў табе, як апэраваў у замежжы, дзе меў пашану ад калегаў і вучняў, што ўзахапы запрашалі яго на гасьціны ды вазілі па сваёй цудоўнай горнай краіне на мяжы славянскага сьвету. Расказваў, як цешыўся прафэсійным прызнаньнем і гасьціннасьцю гаспадароў і як аднойчы ягоная радасьць умомант сьцьмела, калі ў застоліцы ў яго запыталіся, ці праўда, што Беларусь — адзіная славянская краіна, дзе народ не гаворыць на сваёй мове...

Дактары, а бывала, і доктаркі мацалі й цягалі цябе за розныя органы, калолі, прагравалі, масажавалі, зрэдзьчас выпівалі з табой і зноў цягалі, калолі і прамывалі. Табе ставілі магніты, іголкі і п'явак, дзякуючы чаму ты пераканаўся, што нелюбёны табой у дзяцінстве Дурымар — насамрэч герой ня менш станоўчы за доктара Айбаліта.

Ты выслухоўваў новыя й новыя дыягназы,

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

не пацеюць

іншым разам падобныя да прысудаў, і ўсё глыбей пераконваўся, што самы небясьпечны доктар — доктар без пачуцьця гумару.

З кім жыць, як няма мікробаў

Ёсьць гумар сьветлы і чорны. Габрэйскі і армейскі. Адэскі і ангельскі. Ёсьць гумар шыбенікаў.

А ёсьць гумар мэдыкаў.

Доктар, якому тутэйшыя пацыенты чамусьці любілі прыносіць у якасьці ганарару пушкі цукерак, эмігруе ў ЗША, адчыняе прыватны кабінэт на Брайтан-біч і чапляе на дзьвярох абвестку: «Конфет доктор не пьёт».

Колькі разоў прагледзеўшы вынікі тваіх аналізаў, загадчык лябараторыі задуменна падыходзіць да акна й пачынае няпростую размову: «Вы ведаеце, у кожнага мэдыка ёсьць свае маленькія могілкі...»

На знак павагі да пацыента зь велізарным стажам дырэктар дыягнастычнага цэнтру пасьля прыёму прапануе табе наведаць іхнюю саўну, але толькі пры ўмове, што ў парыльню ты на ўсялякі выпадак возьмеш мабілку. Саўна сустракае цябе густоўна выразанай на дрэве высновай шматгадовых дыягнастычных экспэрымэнтаў: «Мёртвыя не пацеюць». Ты лагодзішся ў парыльні на пару з мабілкай, разважаючы над тым, каго хацеў бы бачыць зараз на яе месцы, і раптам твая «Nokia» ажывае. Клапатлівы голас доктара пытаецца: «Спадар Арлоў, вы ўспацелі?»

Паведаміўшы, што ў тваім арганізьме ня знойдзена аніякіх інфэкцыяў, прафэсар заўважае, што радавацца з гэтае прычыны не выпадае. У адказ на твой устрывожаны позірк сьвяціла айчыннае ўралёгіі тонам амаль трагічнага гучаньня канкрэтызуе: «З кім цяпер будзеце жыць?»

Ты выбіраеш Дыяну

Сынонімаў да слова «доктар» (з улікам літаратурных герояў кшталту Пілюлькіна) можна назьбіраць дзясяткі два. Мэдсёстры ў гэтым сэнсе незаслужана пакрыўджаныя. А між тым бязь іх, сястрычак, мэдыцына даўно ляснулася б.

Яны спрытна робяць уколы і зь любасьцю ставяць клізмы. Увечары яны супакойваюць безнадзейных хворых, а ўначы зачыняюцца з надзейнымі лекарамі ў працэдурных і ардынатарскіх. Яны зазіраюць у палату, каб пераканацца, што ты яшчэ жывы, і просяць пачытаць новую кніжку Фрэдэрыка Бэгбэдэра. Яны становяцца гераінямі бальнічных раманаў і крымінальных гісторыяў.

Танклявая красуня Марына перад тым, як ушпіліць табе новую порцыю нібыта карыснага табе зельля, скардзіцца, што муж вінаваціць яе за худзізну і тыднямі не выконвае сваіх мужчынскіх абавязкаў. Дакладней, як яна падазрае, гэтыя абавязкі выконваюцца дзесьці ня дома. Ты даеш Марыне сяброўскую параду адказаць няверніку тым самым. Сястрычка кажа — страшна. Кожны другі — хворы. Магчыма, яна чакае ад цябе нейкай дапамогі. Ты няўпэўнена кажаш пра гумкі. Але, па-першае, яна, Марына, з гумкай нічога не адчувае. А па-другое, гумкі не даюць ніякай гарантыі. Ты маладушна ўстрымліваешся ад іншых парадаў і падстаўляеш сястрычцы сколаты шпрыцамі азадак колераў украінскага нацыянальнага сьцяга.

Нябеснавокая Дыяна, ставячы табе кропельніцу, папярэджвае, што ляжаць пад ёй (кропельніцай) ты будзеш гадзіну. Калі роўна праз гадзіну сястрычка вяртаецца, бутлік зь лекамі разьвітваецца з апошняй кропляю.

Вішнёвавокая Мілана таксама абяцае гадзіну «кайфу», аднак ейнай кропельніцы можа хапіць і на пяцьдзясят, і на семдзесят хвілінаў.

Нэфрытававокая Жана, пакідаючы цябе з уторкнутай у вену іголкай, ня кажа нічога, і, калі лекі сканчаюцца, ты мусіш націскаць на гузік выкліку мэдпэрсаналу.

Жана прыгажэйшая за Дыяну, а Мілана — за Жану, аднак у выпадку чаго ты выбраў бы Дыяну. Табе даспадобы жанчыны, якія адчуваюць час: не прыходзяць раней і ня позьняцца. Нават калі гаворка ідзе пра кропельніцу.

Але, паколькі згадаліся вочы сястрычак, самы дарагі твой успамін — зялёныя, засяроджана-сумныя вочы дзяўчыны, што брала ў цябе кроў на адзін адмысловы аналіз, і — тыя самыя, толькі ўжо зіхотка-зыркія, з бурштынавымі іскрынкамі, — калі яна паведамляла табе, што вынік адмоўны. Табе дасюль хочацца ўбачыць тыя іскрынкі блізка-блізка. Трэба адно зайсьці ў анкалягічны дыспансэр...

Сіротка Надзя

Калісьці ты ведаў шэравокую, падобную да дробнай кошкі ці да буйной мышкі мэдсястру, якая не пасьпела зрабіць табе ніводнага аналізу і ўколу, бо ў адваротным выпадку тваё жыцьцё магло б скласьціся зусім іначай, а магчыма, і наагул — сьціснуцца ў працяжнік паміж дзьвюма датамі на сьціплым помніку.

Гісторыю сястрычкі з цудоўным імем Надзея расказаў табе знаёмы загадчык аддзяленьня, куды мышка прыйшла працаваць пасьля мэдвучэльні.

Надзея гадавалася бяз мамінае ласкі ў дзіцячым доме і, відаць, таму асабліва гарнулася да хворых кабетаў, зь якімі любіла весьці ціхія шчырыя размовы. Адной пацыентцы Надзея з расінкамі на дрыготкіх вейках параіла перадаць дачцы, каб тая не насіла ў больніцу памаранчыкі, а ашчаджала грошы на блізкія маміны хаўтуры. Другая жанчынка ўведала ад Надзеі, што ў яе, хворай, у нырках ніякія не камяні, а самы сапраўдны рак на апошняй стадыі. Трэцяя пасьля размовы з мышкаю ў гістэрыцы прыбегла да загадчыка аддзяленьня.

Той наважыў дзейнічаць абачліва і правёў атэстацыю мэдычнага пэрсаналу. Надзейцы намякнулі, што пра яе даверлівыя гутаркі з хворымі сталася вядома. Далейшыя падзеі разгортваліся зь неверагоднай імклівасьцю і пеніліся шэксьпіраўскімі жарсьцямі.

Ужо назаўтра пасьля атэстацыі загадчык аддзяленьня, скінуўшы ў канцы працы больнічныя тэпці і ўсунуўшы ногі ў чаравікі, закрычаў ад болю. Нечыя клапатлівыя ручкі паклалі ў кожны чаравік па градусьніку.

Не пасьпелі ў доктара загаіцца ногі, як яго напаткала новая страшная неспадзяванка. Загадчык уласнаручна рабіў высокапастаўленаму пацыенту прамываньне мачавога пухіра антысэптыкам. Працэдура толькі пачалася, як пацыент з вусьцішным ёкатам ускочыў з кушэткі і, крышачы ўсё на сваім шляху, рынуўся прэч. Адно велізарны досьвед дапамог доктару хутка зразумець, што замест прэпарату срэбра ён запампаваў хвораму падрыхтаваны руплівай сястрычкаю ёд такога самага колеру.

Назаўтра, калі з палаты для VIP-пэрсонаў яшчэ чуліся енкі ледзьве адратаванай ахвяры, загадчыка аддзяленьня выклікалі да начмэда больніцы, якому пераслалі зь Міністэрства аховы здароўя напісаны круглявым жаночым почыркам ліст на пяці старонках. Адтуль твой знаёмы даведаўся пра запаветную мару дзятдомаўкі Надзейкі лекаваць людзей і пра тое, якія нечалавечыя выпрабаваньні чакалі сіротку на жыцьцёвай пуцявіне. Самым жудасным была сустрэча зь ім, доктарам, што ў першы ж дзень, паказаўшы юнай мэдсястрычцы аддзяленьне, дзе зьдзейсьняцца яе мроі, бесцырымонна й груба авалодаў ёю на гінэкалягічным крэсьле. З таго часу Надзеіна праца ператварылася ў сэксуальнае рабства, ад якога не было паратунку, ты перапрашаеш, і ў чырвоныя дні ейнага жаночага календара, калі монстар у белым халаце ўсё роўна вымагаў наталяць свой юр нялюдзкім замежным спосабам.

Твой знаёмы цяпер кіруе аддзяленьнем у іншым горадзе. Як склаўся лёс сіроткі Надзеі, невядома, аднак ты не выключаеш, што яна працягвае адхаджваць хворых у мэдустановах шматпакутнай Бацькаўшчыны і, можа, якраз у гэтую хвіліну рыхтуе які-небудзь эфэктыўны прэпарат для ўколу або прамываньня.

Назаву цябе Зінаіда

Калісьці хваробы прыходзілі й адыходзілі, а цяпер — зьмяняюць адна адну. Зграбна сфармуляваў Адам Глёбус. Але гэта сказана не пра цябе.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Калі прозьвішча Ўладзімера Арлова закласьці ў інэрнэтаўскі пошукавік, апошні выкіне сем тысяч спасылак. Зь іх арніталягічныя не складаюць і сотай часткі.

Ты б дорага заплаціў, каб на зьмену адной немачы сапраўды прыходзіла іншая. Ты б даваў ім свойскія і экзатычныя жаночыя імёны, пяшчотныя й трошкі паблажлівыя мянушкі й мянушачкі. Ты размаўляў бы з кожнай: ураньні — просячы быць да цябе лагоднай, увечары — угаворваючы падараваць калі не сваю пяшчоту, дык, прынамсі, літасьць. Потым надыходзіў бы момант разьвітаньня: бяз лішняга шкадаваньня і нават з захаваньнем сяброўства; калі б нейкай зь іх заманулася вярнуцца, ты б ужо ведаў, на што яна здатная і як зь ёю паводзіцца.

Але ты стаўся абраньнікам адной-адзінай хворасьці, і толькі пазнаёміўшыся зь ёю, адразу чамусьці вырашыў: назаву цябе Зінаіда. Ты б і рады быў здрадзіць уладальніцы гэткага сур'ёзнага й файнага імя зь якой-небудзь ангінаю, аднак Зінаіда, паслаўшы ўсіх суперніц на сухі лес ці куды далей, узялася за справу як сьлед.

Ды хопіць пра тое, бо Антон Чэхаў і як мэдык, і як двойчы твой калега — пісьменьнік і хворы — цалкам слушна заўважыў, што чалавек любіць пагаварыць пра свае хваробы, а гэта — самае ў ягоным жыцьці нецікавае.

Праўда, ты гаворыш аб адной-аднюткай тваёй спадарожніцы і таму дазваляеш сабе зацеміць, што толькі дзякуючы ёй да цябе прыйшло разуменьне раней абсалютна зацемненых словаў Камю пра хваробу ня толькі як крыж, але і як апірышча. Сапраўды, яе можна зрабіць прытулкам, які надае моцы.

Самыя здаровыя ў сьвеце

Так казалі пра савецкіх хворых, што было сьвятой праўдай.

Некалі расейскі пісьменьнік і былы лягернік Леў Разгон апавядаў табе, як францускі перакладчык распытваў у яго пра жыцьцё ў ГУЛАГу. У прыватнасьці пра тое, на чым ён, Разгон, прымудраўся ў тых умовах пісаць. На чым давядзецца, адказаў калега. «Божа мой! — жахнуўся француз. — Вы пісалі на туалетнай паперы!»

Прыкладна такія ўяўленьні мелі яны і пра савецкія больніцы. Ты ведаеш пару вясёлых гісторыяў пра іншаземцаў, што ў часы перабудовы, неабачліва адарваўшыся ад родных палестынаў, патрапілі ў нашыя мэдустановы. Але няхай гэтыя жахалкі ўвасабляюцца ў мастацкіх творах за заходнімі рубяжамі тваёй краіны. Табе хопіць і суайчыньнікаў зь іхняй атрыманай у савецкіх шпіталях загартоўкаю, што нярэдка дапамагае дацягнуць да выпіскі і ў сувэрэннай Беларусі.

Калі б ты задумаў прысьвяціць кнігу ня толькі дактарам, але і хворым, то абавязкова зарэзэрваваў бы там месца электрамэханіку Сярогу, жыцьцярадаснаму хлапцу, які ў сваім бясхмарным чэрвеньскім юнацтве загнаў пад скуру ў прычынным месцы чатыры шпрыцы парафіну.

Пасьля гэткай «экіпіроўкі» дзяўчаты ў Чэрвені і ваколіцах проста ашалелі ад жаночага шчасьця. Легенды пра мэханіка, вартага Кнігі рэкордаў Гінэса, захопленым шэпцікам перадаваліся з завулку ў завулак і зь сельсавету ў сельсавет. Ды, як пісала паэтка, «дзіўнай казкай прайшла маладосьць», і ашчасьліўленыя дочкі старажытнага Ігуменскага краю раптам засумавалі й пачалі цэлымі чародамі зьнікаць зь Сярогавага далягляду. Аднае раніцы электрамэханік спусьціў перад люстэркам майткі і ў бязьлітасным сонечным сьвятле ўбачыў разгадку: крамяны й заўсёды гатовы да наступу «прыбор» трансфармаваўся ў страхотны, кароткі ды шырокі пацурбалак, які, зважаючы на парафін, можна было параўнаць з аплылым недагаркам таўшчэзнае сьвечкі.

У першую шпітальную ноч зь Сярогавага ложка чуюцца ўсхліпы. Ты ляжыш і думаеш, што плач, як і сьмех, адрозьнівае чалавека ад жывёлы. У бабра таксама могуць каціцца з вачэй сьлёзы, аднак гэта ня больш за дзейнасьць адпаведных залозаў. Плача адно чалавек. З гэткіх глыбокіх развагаў вынікае, што Сярога — чалавек. Ну дык будзь чалавекам і сам, думаеш ты і, хвіліну павагаўшыся, дастаеш з тумбачкі пачатую пляшку чырвонага чылійскага з цудоўным букетам, наліваеш да краёў кантовую шпітальную шклянку і на правох вэтэрана палаты прапануеш Сярогу «прыняць».

Сусед спраўляецца зь віном адным глыкам, і ў прыцемку ты бачыш, як ягоны твар расчаравана крывеліцца. «Кампот», — пагардліва кажа Сярога, аднак плакаць пакідае й імгненна захропвае. Затое пачынае варушыцца другі твой сусед — турак-будаўнік Энвэр, які ажаніўся ў Маладэчне зь беларускай і, мусіць, дзякуючы салу ды іншаму нязвыкламу харчу, выгадаваў сабе ў нырках велічэзны камень.

Энвэр паведамляе табе, што ў больніцы піць «нельзя». «Маўчы, магамэтанін», — адгукаешся ты і наліваеш шклянку чылійскага сабе. «Нельзя», — цягне сваё турак.

Глыток за глытком ты ганяеш віно па рэцэптарах, уяўляючы вяршыні Андаў, філямата Дамейку, сівенькага й лядашчага Аўгуста Піначчэта і — нечакана — журботнавокага курда Канада, вашага доктара-стажора.

Працяг на старонцы 22.

Працяг са старонкі 21.

Мёртвыя

Ідзе другая гадзіна ночы, твае чалавечыя пачуцьці хочуць спацькі, і ты ўнікліва цікавішся ў Энвэра, ці ведае той, хто будзе рабіць яму апэрацыю. Для Энвэра гэта загадка, затое табе ўсё вядома: доктар-курд. Турак, як апараны, зрываецца з ложка: «Курд — не чалавек! Курд хужэ шакала!» Сярога прачынаецца і ачмурэла лыпае пугачынымі вачыма. Энвэр хуткахутка гаворыць па-свойму. Відаць, моліцца. Ты ўжо ня хочаш віна, але дэманстратыўна наліваеш сабе шкляначку і абяцаеш Энвэру, што заўтра ўсё раскажаш доктару Канаду, каб той выразаў яму ня камень, а што-небудзь іншае.

У акно палаты зазірае жоўтая поўня, падобная да сьпелага круглага сыру, якім бы ты з асалодаю закусіў свае законныя дзьве шклянкі. Сярога зноў усхліпвае, але, калі разьлічвае на другую порцыю «кампоту», яму не дапаможа і роспачнае галашэньне. «Усё нармалёва, — суцяшаеш ты суседа. — На той сьвет трэба сыходзіць хворым, а не здаровым».

Былы герой Чэрвеньшчыны па-ранейшаму румзае. Ты пытаешся ў Энвэра, ці плачуць курды. «Курды — шакалы», — цьвёрда адказвае турак. Ты засынаеш з шчасьлівай думкаю, што і тут, у больніцы, табе шанцуе на цікавых спагадлівых людзей.

Пасьля сьняданьня Сярогу забіраюць на апэрацыю. Табе яго зусім не шкада. Сёньня ўначы ты адназначна акрэсьліў сваё стаўленьне да ўладальнікаў парафінавых чэлесаў, як яшчэ раней — да гаспадыняў сыліконавых грудзей. Магчыма, ты — нехарошы і злы чалавек. А можа, ты проста за сумленную гульню ў роўных умовах.

Курва зь Серабранкі

На Сярогава месца кладуць доктара-вэтэрынара з Лагойшчыны, заўзятага чытача «Народнае волі» і прыхільніка Зянона Пазьняка, у выніку чаго ў палаце пачынае дамінаваць беларушчына. Адзін з нумароў «Волі» ты ўручаеш Энвэру і пагрозьліва тлумачыш, што надышоў час вучыць мову народу, які даў яму прытулак. Сярод іншых аргумэнтаў — твой мітычны знаёмы курд, які па-беларуску гаворыць лепей за некаторых народных пісьменнікаў. Энвэр відавочна ня хоча быць дурнейшым за курда. Неўзабаве ён робіць першыя посьпехі: «Что такое «пэршы»?»

«Первый!» — радасна галёкае лагойскі айбаліт. У яго адметны даўгі нос, ад якога, здаецца, можна без праблемаў прыкурваць, — наступства разьлікаў за вэтэрынарныя паслугі акавітай розных гатункаў. Каровіны доктар ганарыцца малодшым братам-бізнэсоўцам, які мае ў Серабранцы шыкоўную пяціпакаёвую кватэру і жонку, што не пускае швагражабрака й на парог. «Курва», — незласьліва кажа вэтэрынар. «Нельзя ругацца», — устаўляе свае тры шэлегі Энвэр.

На панядзелак вы прызначаеце турку першы залік па вашай мове. Тэма — «Знаёмства зь беларускай жанчынай». Але да панядзелка трэба дажыць. Дзеду зь сёмай палаты, гэта, напрыклад, не ўдаецца. У чацьвер дзед не прачынаецца, пакінуўшы ў лядоўні вам, жывым, цэлую торбу вясковых паляндвіцаў, каўбасаў ды сальтысонаў.

У пятніцу ў палату завітвае бізнэсовец з гронкаю бананаў. Ён выпісвае старэйшаму брату на ўікэнд $10. Вэтэрынар просіць малодшанькага адразу памяняць іх на беларускія. Той дастае 20-тысячную купюру, і айбаліт працягвае яму толькі што атрыманы «зелянец». Бізнэсовец шчодра пакідае яго брату і, напэўна, робіць фатальную памылку, бо ні ў панядзелак, ні ў аўторак адпушчаны на выходныя вэтэрынар не вяртаецца.

На месцы айбаліта зьяўляецца малаарослы падхорцісты міліцэйскі маёр, малады пэнсіянэр з ныркавай колікай. Дзень навылёт, навёрстваючы ўпушчанае за гады службы, маёр чытае кніжкі. Крытэр падбору міжволі кідаецца ў вочы: «Таварыш генэрал», «Камбат» і «Справа маёра Косьціна» зусім невядомых табе аўтараў, «Капітан Фракас» Тэафіля Гацье і «Адысэя капітана Блада» Рафаэля Сабаціні. Пасьля выходных ты прыносіш суседу Габрыэля Гарсія Маркеса — «Палкоўніку ніхто ня піша», што ўспрымаецца з удзячнасьцю.

Тым часам з палаты ў палату ходзіць кульгавы, часткова спаралізаваны і цалкам невідушчы неахайны таўсматы хлопец, што расказвае ўсім гатовым слухаць, як яго, армейскага «дзеда», за два тыдні да дэмбелю сустрэлі за капцёркай «салагі» і сьпярша выцялі нечым цяжкім па патыліцы, а тады ўзяліся біць сьмяротным боем нагамі. Ты мусіш слухаць гэтую гісторыю зноў і зноў і штораз, гледзячы на абсыпаныя перхацьцю брудныя валасы калекі, ня можаш абагнацца ад думкі: што ж трэба было вырабляць «дзеду» з «салагамі», каб тыя зь зьвярынай лютасьцю адбілі яму і ныркі, і пячонку, і зрок?

Зрэшты, ня ўсё так проста і з «салагамі». У суседняй палаце ляжаць тры маладыя салдацікі, што найперш нагадваюць выпушчаных на «хімію» зьвераватых маладзенькіх зэкаў, на якіх ты няглядзеўся некалі ў Сібіры ў студэнцкіх будатрадах. Цэлы дзень «салагі» шнуруюць, як злыганыя, па шпіталі, нешта бясконца жуюць і п'юць, а ўвечары, пасьля адбою, пояць у цёмнай сталоўцы віном маладую запаволеную санітарачку з заўсёднай разгубленай усьмешкаю на дзіцячым твары. Пояць, а затым па чарзе водзяць у ейную бакоўку з канапай, каб ураньні хваліцца, хто колькі разоў гэтае дзяўчо «отодрал». Апрача свайго начнога занятку, больш-менш асэнсавана яны робяць дзьве рэчы: стрыгуць перад выпіскай адзін аднаго «пад нуль» (бо ў іхняй брыгадзе спэцназу дазволеная толькі такая фрызура) і на супрацьпажарным плякаціку «проход держать свободным» акуратна прымалёўваюць сьпераду слова «задний».

Калі пяюць ваўкалачкі

Перад адбоем ты пераведваеш ужо безнадзейнага мастака з анкалёгіі. Ён знаёмы з правілам Гіпакрата, паводле якога пры двух болевых агменях пакутуеш толькі ад больш моцнага, які дашчэнту «сьцірае» слабейшы, таму закасвае рукаво, выцягвае з кішэні зграбную запальнічку-русалку і выкрасае агеньчык… Валаскі імгненна згараюць, скура падымаецца пухіром, ападае і запякаецца. Нясьцерпны боль у страўніку сьціхае, гаспадар бярэ цыгарэты (на пачку лёгкага «Marlboro» мільгае зроблены шарыкавай асадкаю малюнак), і вы выходзіце ў калідор.

Мастак меў пэрсанальныя выставы, замежныя паездкі. Але пра іх ён ніколі ня згадвае. Ён гаворыць выключна пра сваіх жанчын. Чамусьці мастак хоча, каб ты даведаўся, што адна зь іх пасьля аргазму замірала і ён спачатку палохаўся, ці не спынілася ў яе сэрца. Яшчэ адну калаціла, нібы ў ліхаманцы, а другая, перад тым як абрынуцца ў нірвану, паваўчынаму завывала, лякаючы яго ня менш за тую, што нерухомела. Напэўна, была ваўкалачкаю, думаеш ты.

Не сказаць каб такія размовы табе падабаліся. Але ты слухаеш спакойна й уважліва: там, дзе неўзабаве апынецца мастак, у яго можа не знайсьціся слухача. Пэўна, якраз жанчыны, а не вэрнісажы й альбомы рэпрадукцыяў, — галоўнае, што было ў жыцьці твайго суразмоўцы. Магчыма, менавіта ў іх, жанчынах, у іхняй памяці, ён будзе жыць значна даўжэй, чым у творах.

Мастакова рука — у суцэльных апёках. Ты пазіраеш на яе і разумееш, што жыцьцё, нават зь невыноснымі пакутамі, таксама мае свой кошт — да апошняе хвіліны.

Цяпер ты маеш магчымасьць разгледзець, што намаляванае на залаціста-белым цыгарэтным пачку. Упэўненая прафэсійная рука пакінула на ім складаную кампазыцыю з жаночых целаў, якія нібыта пераліваюцца адно ў адно. Малюнак падкрэсьлена эратычны, але, каб «зайграць», яму нечага не стае. У цябе зьлёгку сьціскаецца сэрца: няма мужчыны.

Ты думаеш, што пры ўсёй сваёй натуральнасьці й банальнасьці часам сьмерць сапраўды набывае трагізм — калі творца памірае раней за ўласны талент.

Твой суразмоўца апавядае, як аднойчы на добрым падпітку зрабіў бесцырымонна-грубую прапанову незнаёмай прыгажуні, зь якой выпадкова падымаўся ў ліфце, і яна крыкнула ў адказ: «Хачу! хачу!», і якраз у гэтым пад'езьдзе быў выхад на гарышча.

Аповед зьмяняе аповед. Табе робіцца цікава: пра што ты сам гаварыў бы ў ягонай сытуацыі?

Клізма з антычным падтэкстам

Сястрычка Дыяна, тая, што беспамылкова вызначае, калі сканчаюцца лекі ў кропельніцы, нагадвае, каб ты ад абеду рыхтаваўся да перадапэрацыйнае клізмы і нічога ня еў. Апрача таго, выяўляецца, што ты мусіш пагаліць навакольле сваіх самых запаведных месцаў.

Праблема не настолькі элемэнтарная, як некаму здаецца. За пражытыя паўстагодзьдзя ты самастойна аніколі не галіўся (калі не лічыць пакінутага ў юнацтве скублівага электрапрыстасона «Харкіў», які, памылкова ўторкнуты ня ў тую разэтку, умомант сапсаваўся, але пачаў спраўна перадаваць першую праграму радыё). Боязь лёзаў закладзенае ў табе генэтычна, бо ў 1944-м найлепшага сябра твайго бацькі зарэзаў лязом у вугорскай цырульні гаспадар-хартыст.

Ты знаёміш з гэтай гісторыяй Дыяну і ўгаворваеш яе трошкі пабыць цырульніцай, адно што больш літасьцівай за вугорскага адмыслоўца. Ціск на спагаду ты спалучаеш з спробамі матэрыяльнага стымуляваньня гэтага чалавечага пачуцьця — дэкляруеш разьлічыцца паводле тарыфаў элітных салёнаў прыгажосьці або запрасіць чароўную цырульніцу на вячэру ў ціхую кавярню з адпаведным імені сястрычкі «антычным» інтэр'ерам. Дыяна абяцае падумаць, але ўвечары, відаць, атрымаўшы цікавейшыя прапановы (ня выключана, што нехта павядзе яе ў кавярню ўжо сёньня, якраз у той момант, калі цябе павядуць на клізму), паведамляе, што мэдсёстры голяць толькі спаралізаваных хворых. Абвясьціўшы жорсткі вэрдыкт, яна ўручае табе нажніцы, пару кранутых іржой лёзаў «Спутник» і дапатопны станок.

Ты зачыняешся ў ванным пакоі, становішся перад люстэркам і думаеш, што кожны мужчына, які браў у рукі лязо, напэўна, хоць раз ды ўявіў, як лёгка ён можа перарваць срэбную нітку жыцьця. Ты прыкідваеш, дзе найбольш надзейна і эстэтычна лязо магло бы зрабіць сваю пачэсную справу, і пераконваешся, што думка пра самагубства — магутны заспакаяльны сродак.

Наступныя паўгадзіны ты зразаеш, а потым сашкрабаеш сваю інтымную фрызуру тупымі нажніцамі ды яшчэ больш тупымі лёзамі (зрэшты, дастаткова вострымі, каб пакінуць некалькі пякучых парэзаў).

У дзьверы настойліва стукаюць. Мэдсястрычка ўважліва правярае вынікі тваёй працы. Ты стаіш перад ёю, як Актэон перад Дыянай-Артэмідай, што ператварыла антычнага паляўнічага ў аленя. Сухія, цёплыя й упэўненыя пальцы сястрычкі таксама выклікаюць у тваіх паголеных органах пэўныя пераўтварэньні...

«А цяпер — на клізму!» — задаволена кажа Дыяна.

Пад ветразем прасьцінкі

Ліфт, на якім цябе, ужо абсалютна голага, адно прыкрытага прасьцінкай, падымаюць на шосты, апэрацыйны паверх, нараджае самыя нечаканыя мэтафары.

Лежачы на апэрацыйным стале, ловіш сябе на тым, што нават тут пах сьвежай бялізны ўсё роўна выклікае ў целе лёгкае прыемнае хваляваньне. У складках прасьцінкі тоіцца непаўторны эдэмскі халадок, настоены адначасна і на цнатлівых успамінах маленства, і на грэшных прыгадках сталасьці. Ты сьціскаеш краі прасьцінкі трошкі зьмерзлымі пальцамі, на хвілю заплюшчваеш вочы — і табе мроіцца, што гэта — ветразь. Ён прывёз цябе зь нябыту ў жыцьцё, а некалі яго напоўніць іншы вецер і вы адплывяце ў новы нябыт.

Наступная думка афарбаваная іншымі эмоцыямі: а чым ты празь пяць хвілінаў будзеш прынцыпова адрозьнівацца ад тых, што ўжо адплылі? Бадай адно надзетымі на ногі бахілкамі, якія нескладана будзе зьняць. Далей — яшчэ больш цікава: лезе ў голаў знаёмы апазыцыянэр абласнога маштабу, які пакутуе ад язвы, але ўпарта не кладзецца на апэрацыю, перакананы, што ў такім разе яго неадменна напаткае лёс таварыша Фрунзэ, нібыта зарэзанага сталінскімі эскуляпамі.

Убачыўшы хірурга, ты ўздрыгваеш. Верагодна, такі самы засяроджаны твар быў у апошняга доктара, якога бачыў у сваім гераічным жыцьці тав.Фрунзэ. Тым часам хірург, зь якім цябе толькі ўчора пазнаёмілі, кладзе на тваё безабароннае калена важкую руку ў апэрацыйнай пальчатцы й пытаецца, як правільна пісаць слова «змаганьне» — зь мяккім знакам ці без. Анэстэзіёляг пачынае даваць наркоз, часу на тлумачэньне праблемы двух правапісаў ужо няма, і перад тым як цябе агорнуць цёмныя хвалі няпамяці, ты адно пасьпяваеш наіўна падумаць, што, калі ня вернешся, калі прачнешся ў іншым вымярэньні, твая справа *тут* не загіне, бо галоўнага ў краіне спэцыяліста ў лазэрнай хірургіі займаюць пытаньні беларускай артаграфіі.

Крылы мацнеюць у палёце

У наркозе ты, быццам тапелец, выгодна ляжыш на глыбокім дне і да цябе з усіх бакоў паўзуць перлавіцы ды цягнуцца смарагдавыя «русалчыны косы» — каб атуліць, аплесьці, уладкаваць яшчэ прытульней. Ды зьнячэўку ў твой зацішак, дзе табе ўпершыню за некалькі гадоў нічога не баліць, аднекуль з страшэннае далечыні далятае чыйсьці слабы голас: «Як вас завуць?»

Чаму некага абыходзіць, як цябе завуць? Тут табе добра і без імя. А раптам, узгадаўшы сваё імя, ты падкажаш болю, дзе цябе шукаць, і ён ізноў учэпіцца ў тваю плоць усімі кіпцюрамі і кіпцікамі?

Але далёкі голас не пакідае цябе — набліжаецца, набрыньвае нецярплівасьцю: «Як вас завуць?!» Ты разумееш, што голас адтуль, зьверху, належыць жанчыне, і, можа, якраз гэтая акалічнасьць змушае цябе ўспомніць.

Голас ужо ня просіць, а патрабуе твайго імя. Табе яшчэ хочацца застацца там, дзе не баліць, аднак ты адчуваеш, як «русалчыны косы» нябыту, не раўнуючы — зямныя нячысьцікі ад ранішняга сьпеву пеўня, увачавідкі слабеюць. Адчуваеш, як бездапаможна адвальваюцца й паўзуць прэч перлавіцы, што ўжо пачалі былі зручна ўладкоўвацца на тваім целе…

Жанчына кліча, хоча ведаць тваё імя, і ты — дзеля яе — спрабуеш вымавіць яго: У-ла… На большае не стае змогі, але краёчкам памяці ўзгадваеш, што так — проста Ўла — кліча цябе сябар. Ды жанчына, відаць, ня ведае гэтага, і ты варушыш непаслухмянымі вуснамі: «У-ла-дзі-мер». Кожны склад — бы прыступка скінутай у тваё прадоньне лесьвіцы, па якой ты караскаешся ўгору. «Яшчэ раз!» — вымагае жанчына. «Уладзімер», — паўтараеш ты, ужо адчуваючы цеплыню ейнае рукі. Жанчына — у зялёным халаце, але гэтая зеляніна не такая, як там, на дне. Яна сонечная, як і рыжыя валасы, што выбіваюцца з-пад зялёнага каптурыка.

Жанчына калісьці выштурхнула цябе зь неіснаваньня. Цяпер, зь няпамяці, цябе таксама вярнула жанчына, якая тваім імем зьвязала нітачку, што лучыць зь сьвядомасьцю. Гэтае просьценькае разважаньне зьнясільвае цябе, і ты засынаеш.

У сьне ты ўжо ведаеш, як цябе клічуць. Час ад часу ты прахопліваешся, і кожны раз тваё засынаньне ўсё спакайнейшае. Мо таму, што і тут, у працягах твайго сну, нязьменна прысутнічае жанчына, падобная на дарослую дзяўчынку. Яна то ідзе вуліцаю насустрач і ўсьміхаецца табе шчасьлівай усьмешкаю ад вуха да вуха, то нахіляецца да цябе і хутка кранае вуснамі лоб, нібы на яго палахліва апусьцілася і ўзьляцела мятлушка.

Нарэшце твой сон канчаткова набывае цьвярозую сьветлыню й празрыстасьць. Па падвоканьні лапоча дождж, а ты валяешся ў вялізным утульным ложку з жанчынаю-дзяўчынкай, што сустракала цябе на вуліцы

не пацеюць

ўсьмешкаю да вушэй, і робіш зь ёю тое, што жадаецца табе і чаго прагнецца ёй, і расказваеш ёй, што ты зь ёю робіш у гэтую хвіліну і што будзеш рабіць пасьля, і просіш яе таксама расказваць пра тое, чым вы займаецеся, расказваць, называючы рэчы сваімі імёнамі. І яна, спачатку бянтэжачыся, згаджаецца і гаворыць гарачым духмяным (табе хочацца сказаць — ліпеньскім) шэптам, знаходзячы свае словы — невымоўна пяшчотныя і неверагодна грубыя, якія нараджаюць новую хвалю пяшчоты, што конча выносіць цябе на бераг рэчаіснасьці.

І там, на беразе, дзе цябе пакінула сьветлая хваля сну, чакае жахлівае адкрыцьцё. Толькі што, у дажджлівы дзень зь вялізным ложкам, ты валодаў уласным целам, як юны антычны бог, а цяпер ператварыўся ў пачварна-недасканалае брыдкае стварэньне, прыпятае да ложка трубкамі й трубачкамі, што нібыта мусяць табе дапамагчы. Напрыклад, ты выбачаешся, — пасікаць.

Доктар супакойвае: гэта на суткі, найбольш на двое. Іначай будзе вельмі балюча. Але ўжо ўвечары ты не вытрымліваеш. А раптам за ноч трубачкі пусьцяць карэньчыкі і назаўсёды прырастуць да тваёй істоты. Цябе скаланаюць жах і агіда, ад якіх цела робіцца здрадліва бязважкім. Ты моліш доктара хутчэй выдаліць зь цябе ўсё іншароднае прычындальле. Будзе вельмі балюча, паўтарае доктар. Вельмі. У цябе сьвежая рана. Ты не адступаешся, і доктар здаецца.

Праз колькі хвілінаў ты стаіш на ўласных нагах над унітазам і сікаеш крывёю й болем. Ты згадваеш улюбёны загаловак рэдактара газэты, дзе некалі зарабляў на хлеб і віно, — «Крылы мацнеюць у палёце». У нейкі момант свайго «палёту» ты амаль губляеш прытомнасьць, але выгляд крыві ўзбадзёрвае. Кроў сьведчыць, што ты — жывы.

Стаіш над унітазам і адчуваеш сябе амаль шчасьлівым. Тваё цела зноў належыць табе.

Памерці, каб скараціць выдаткі

Часам ты думаеш, што ўсе афарызмы — ня больш чым прыгожая хлусьня. Асабліва афарызмы пра сьмерць. Да прыкладу, вось гэты: «Шлях у падземнае царства адусюль аднолькавы» (Марк Тулі Цыцэрон). Няўжо ён аднолькавы ў правадыра гунаў Атылы, які сышоў у Аід проста з гарачых абдымкаў сваёй юравабнай Ільдэкі, і ў старога, што памірае за сьценкай — няголены, з запалымі ледзь не ў сярэдзіну чэрапа вачыма, з рукамі-бізунамі, якія сутаргліва чапляюцца за нікеляванае білца. Зірнуўшы на такое відовішча, Гарацы, безумоўна, зразумеў бы, што рэкнуў абышто: маўляў, сьмерць да ўсіх стукаецца аднолькава. А Жуль Рэнар аднойчы, відаць з будуна, дагаварыўся да таго, нібыта, атрымаўшы неўміручасьць, мы б у роспачы штодня рабілі спробы самагубства.

Твой здаровы скепсыс, відаць, вынікае з таго, што табе ўжо даводзілася ад абстрактных разважаньняў пра сьмерць пераходзіць да жывых узаемазацікаўленых дыялёгаў з згаданай мадамай.

Памятаецца, Сэнэка дзеля пераадоленьня страху сьмерці раіў кожны дзень думаць пра яе. Сэнтэнцыя досыць сумнеўная, ды паспрачацца з выхавальнікам імпэратара Нэрона замінаюць крыкі з-за сьценкі.

Ты клічаш мэдсястру, але тая адмаўляецца й пасылае ў палату санітарку. «Ну што ты, дзед, шуміш, — кажа яна. — Нічога мы табе ня зробім. Не шумі». Ня выключана, што гэта астатнія словы, што данясуцца да сьвядомасьці старога. «Як вы ўсе ўстылі, блядзі», — незласьліва дадае немаладая зьнябытая санітарка ў калідоры.

Хтосьці заўважыў, што памерці — значыць перастаць паміраць, чаго ты шчыра зычыш пякельна спакутаванаму суседу. У тваёй палаце цяпер нікога няма, і ты ўпершыню пасьля апэрацыі дазваляеш сабе пяць глыткоў віна, замаскаванага пад кока-колу.

З дна плястыкавай бутэлькі вынырвае самае мудрае «сьмяротнае» выслоўе, якое ты калі-небудзь сустракаў: памерці, каб скараціць выдаткі.

Пра завяршэньне зямнога шляху трэба пісаць ня толькі з павагай, але і з гумарам. Прынамсі, табе хочацца, каб пра тваю сьмерць напісалі менавіта так.

Пакуль ты занадта слабы і хутка хмялееш. Таму прыдуманы табой назоў для будучага прысьвечанага табе тэксту зь сьціплым подпісам «Група таварышаў» нельга назваць шэдэўральным — «Ён больш не запоўніць падатковай дэклярацыі».

Пацалунак бязвусага

Дыяна прыносіць табе кропельніцу з антыбіётыкам і глюкозай. А што будзе, калі ў гэты кактэйль дадаць грамаў сто сухога францускага віна? Сястрычка не адказвае і наагул трымаецца сувора й непадступна. Як быццам і не яна ўчыняла табе перад апэрацыяй незабыўную праверку пасьля галеньня, а потым тымі самымі таленавітымі ручкамі ставіла клізму (пасьля чаго ты зразумеў, як пачуваўся біблійны Адам, калі ўжо быў створаны, але яшчэ не пасьпеў нічога зьесьці).

Ты таксама з задавальненьнем паставіў бы зараз Дыяне клізму або зрабіў нейкую іншую лекавую працэдуру, але пакуль мусіш назапашваць імпэту, бавячы час з агорклым немудрагелістым апаратам.

Зрэшты, ты несправядлівы да кропельніцы. Яна, між іншым, нагадвае клепсыдру. Розьніца ў тым, што, калі бутлік апусьцее, назад у яго зь цябе нічога не пакропае. Твая істота паглыне гадзіну разам з празрыстымі кропелькамі, якія яе адлічвалі, і народзіць думку, што іх, гадзінаў, застаецца ўсё меней, але, насуперак элемэнтарнай лёгіцы, іх вартасьць зусім не расьце. Яна непараўнальна меншая, чым у юнацтве. Тады ад якойсьці гадзіны магла залежаць лінія лёсу. Нешта магло фатальна не адбыцца, ня зьдзейсьніцца. Цяпер ад яшчэ адной сплылай у невараць пустой гадзіны, як і ад безьлічы іншых, у прынцыпе нічога не залежыць. Нічога ў жыцьці ты ўжо ня зьменіш, ніякіх новых магчымасьцяў табе не адкрыецца. Вось прыйдзе Дыяна, ты дасі ёй шакалядку з арэхамі, адвернешся да сьцяны й паспрабуеш заснуць.

Ты заваяваў сабе права не берагчы час і не выціскаць зь яго максымуму, кажа ў табе нехта стамлёны і мудры. Аднак неспадзеўкі ў яго зьяўляецца няўпэўнены, затое даволі бадзёры апанэнт. Вось вернецца Дыяна, нашэптвае ён, і ты прапануеш ёй парушыць спартовы рэжым. Хіба кепска на начным дзяжурстве выпіць шкляначку добрага вінца з хворым, які дзень пры дні ўсё менш выдае на дахадзягу.

У тваёй клепсыдры застаюцца апошнія кроплі. Прамінула роўна 60 хвілінаў, і ў калідоры чуюцца сястрыччыны крокі. Покуль адчыняюцца дзьверы, у цябе ўжо не ўпершыню мільгае думка, што такая жанчына ня будзе спазьняцца на спатканьні.

Дыяна захоўвае непрыступны выгляд, але ён ужо робіцца стымулам. Калі сястрычка выцягвае з тваёй вены шпрыц, ты асьцярожна накрываеш яе руку сваёй далоняй і, натапырыўшы вусы, пачынаеш: «Вы ведаеце, што пацалунак бязвусага — як суп бяз солі?..»

Канібалы — за нас

Калі надыходзіць ачуняньне?

Калі сярод ночы прачынаешся ад жаданьня.

Калі просіш прынесьці з дому новы альфабэтнік і бярэшся перапісваць з старога зацухмоленага адрасы й тэлефоны знаёмых.

Калі хочацца схаваць, як у дзяцінстве, адзеньне пад перакуленай лодкай і пераплысьці туды й назад Дзьвіну насупраць Сафійскага сабору.

Калі пачынае цягнуць у падарожжа куды-небудзь у Барсэлёну ці на Сыцылію.

Калі прагнецца выпіць пляшачку, а то і дзьве рэдкага ў тваіх шыротах віна. Паўднёваафрыканскага — з даўкім сухаватым прысмакам прозы Джозэфа Кутзэе і ўяўленьнем пра львоў, што любяцца сярод вінаграднікаў. Новазэляндзкага — уяўляючы, што акурат такім віном тубыльцы-маары, вытанчаныя канібалы-гурманы, запівалі засмажаныя філейныя часткі калянізатараў. А найлепей — прапусьціць праз сваю істоту колькі шклянак аўстралійскага — з успамінамі пра адзіную знаёмую табе жыхарку паўднёвага паўшар'я, якая зрэдзьчас прысылае табе лісты й здымкі (што пакуль не катастрафічна адрозьніваюцца ад навечна сфатаграфаванага тваёй памяцьцю дзявочага аблічча) і просіць, каб і ты пісаў ёй, бо іначай яна зусім забудзе сярод кенгуру і качканосаў мову, якой калісьці ты навучаў яе, нязьменна завяршаючы ўрокі практычнымі заняткамі.

Ачуняньне надыходзіць, калі карціць прапанаваць тост за юравабнасьць як найлепшае віно для свабодных сэрцаў.

Калі вабіць пісьмовы стол, на якім здаралася і яшчэ здарыцца столькі неверагоднага…

P.S. Усе спробы атаясамленьня згаданых больніц і шпіталёў з рэальнымі мэдустановамі краіны будуць недаравальнай памылкаю.

ARCHE
твой любімы часопіс
падпісны індэкс 00345

У новым «Arche» №2-2004 палітыка і культура:
Віталь Сіліцкі «Гістарычны выбар Лукашэнкі»
Юры Чавусаў «Цэнтры цяжару ідэалягічнае працы»
Аляксандар Надсан «Даведнікі — не паэзія»
Юрась Ліхтаровіч «Кароткі курс посткамунізму»
Андрэй Дынько «Між братняй Расеяй і мірнай Эўропай»
Сакрат Яновіч «Беларусь заўтра»
Пётра Садоўскі «Нататкі рэтраграда»
Кастусь Лашкевіч «Паміж спортам і палітыкай»
Сяргей Балахонаў «Пятнаццаць лішніх хвілін»
Мілан Кундэра «Эдуард і Бог»
Ані Жаліф «Беларуская прыгода»

КОШТЫ
На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў), на старонку 16
Рэклямныя расцэнкі:
— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб.
За кожныя наступныя 20 словаў — 4000 руб.
Аформленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 650 руб.
Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калектарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764.
На зваротным баку бланку паштовага пераказу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».
Даведкі праз т. (017) 284-73-29

Найлепшая хрэстаматыя па беларускай літаратуры


кожнаму абітурыенту

ЛЕВЫМ ВОКАМ

Усім есьці «чупа-чупс»!

1 чэрвеня, у Міжнародны дзень абароны дзяцей, прыемна прыгадаць, што дзяцінства — адзіны сапраўдны вольны сэктар у краіне. Чвэрць беларусаў жывуць сабе і нават слыхам ня ведаюць пра дырэктыву аб дысцыпліне і дэфіцыце з палівам для пасяўной кампаніі.

Зразумела, доўга так працягвацца ня можа. Барацьба за дзіцячыя душы зьяўляецца адным з галоўных імпэратываў рэжымаў, якія адмерылі сабе больш за два тэрміны. Так было ня толькі ў часы камуністаў, што абвінавацілі Чукоўскага ў прапагандзе дзіцячай субкультуры. Прыгледзьцеся да дыснэеўскіх мульцяшак. Усе яны нахабна ўціраюць ў мазгі дзетак капіталістычную карпаратыўную культуру: каманда (team) герояў — правобраз фірмы або кампаніі — змагаецца за месца пад сонцам.

Такая філязофія, натуральна, не пасуе канцэптуальным асновам беларускай дзяржідэалёгіі (нацыянальнай, дарэчы, таксама). Калі б Галівуд знаходзіўся недзе ў Асіповічах, то Мікі Маўс на экране быў бы павінен шчаміць ворагаў, сьпяваючы «Хай заўжды будзе бацька, хай заўжды буду я!». А так, наглядзеўшыся прыгод Мікі, Дональда і Гуфі, дзеці хутчэй становяцца бязроднымі сэлф-мэйдэрамі або сыходзяць у «брыгаду».

Паколькі рэсурсы «Беларусьфільму» не дазваляюць Лукашэнку стварыць годную канкурэнцыю Дыснэю, яму застаецца толькі псыхатэхніка. Напрыклад, у псыхагісторыі ёсьць папулярны тэзыс аб тым, што спавіваньне немаўлят — крыніца аўтарытарных рэжымаў. Бо на Захадзе бацькі не выкарыстоўваюць пялюшак і ў выніку бэйбі заўсёды адчуваюць сябе вольнымі, а ў нас — наадварот. Чаму б не абавязаць дзіцячыя садкі трымаць дзіця ў фармаце муміі да 10 гадоў? А потым — адразу ў БРСМ.

Цікавая таксама вэрсія аб тым, што дарослыя жахі выпрацаваны дзіцячымі казкамі, якімі нас нашпігоўвалі ў дзяцінстве. У такім разе відавочна, чаму, убачыўшы ППРБ, нашы чыноўнікі ня могуць вымавіць ані слова. Напэўна, у дзяцінстве маці ім зашмат чытала «Таракана».

А ці ведаеце вы, што існуюць розныя віды цацак, перавага аднаго зь іх у маленстве ўплывае на прыроду дарослых патрабаваньняў? Каб выхаваць ляяльнага дэбіла, трэба даваць яму ў дзяцінстве ванькуўстаньку, гульня зь якім не патрабуе ніякага напружваньня зьвілінаў. І, натуральна, не забудзьце пра бізун: зламаўшы ў дзяцінстве волю, потым лёгка прымусіць асобу да дысцыпліны.

Аднак баюся, што ўсе згаданыя мерапрыемствы тэхнічна рэалізаваць цяжка. Як ні дзіўна, адзіным лягічным выйсьцем для ўраду зьяўляецца барацьба зь дзяцінствам як асобнай храналягічна-культурнай сытуацыяй. Галоўным хаўрусьнікам ураду зьяўляецца дзікі капіталізм, які вельмі хутка прыводзіць дзяцей у дарослы сьвет. Жадаючы быць падобнымі на дарослых, яны ўжо ў 10—11 год пачынаюць паліць, касіць пад іх, пазычаючы панты і палітычныя настроі… Адсюль выснова: абарона дзяцінства ў форме дыялёгу зь ім — вось што павінна рабіць апазыцыя. Усім есьці чупа-чупс!

Лёлік Ушкін

КАІСА

Рэкордны чэмпіянат

У нядзелю 23 траўня ў менскім Палацы шахмат і шашак завяршыўся чэмпіянат краіны сярод шахматных клюбаў, які сабраў рэкордную колькасьць каманд (14) і ўдзельнікаў (каля сотні). Клюбнае першынство сталася, бадай, найбольш масавым шахматным фэстам Беларусі за апошняе дзесяцігодзьдзе. Вядома, да Кубы, дзе пад патранажам Фідэля на плошчах адначасова гуляюць тысячы аматараў, нам яшчэ далёка, але пільная ўвага ўладаў да шахматнага «зборышча» ў турнірнай залі адчувалася. Пасьля візыту ў палац міністра спорту й турызму ў залі зьявіўся вялізны партрэт найлепшага сябра ўсіх шахматыстаў. Кажуць, гіпнатычны погляд апошняга сяго-таго з гульцоў давёў нават да цайтноту… Сярод кур'ёзаў, непрыемных для фэдэрацыі шахмат, — нецьвярозы ўдзельнік, які заснуў за дошкай. Такога ў практыцы нацыянальных спаборніцтваў не здаралася ніколі. Дзянісу Т. залічылі паразу…

Чэмпіянат ладзіўся ў шосты раз. Яго арганізатары пастараліся завабіць як мага болей гульцоў, устанавіўшы не абыякія грашовыя прызы ды паабяцаўшы выправіць пераможцаў у Турцыю, на клюбнае першынство сьвету. За дошку селі ня толькі беларусы, але й легіянэры з Украіны — грасмайстар Федарчук ды міжнародны майстар Насенка. Першае месца, як і летась, здабылі зоркі «Вясьнянкі» — гэтак называецца маленькі беларускі цуд, шахматны клюб пры адной зь менскіх ЖЭС, які аб'ядноўвае гульцоў сусьветнага маштабу. На другім месцы — каманда «Вэктар», на трэцім — зборная Івацэвічаў. Сярод аўтсайдэраў варта назваць клюб імя Давіда Яноўскага з Ваўкавыску — хаця б за сьмеласьць, зь якой першаразраднікі змагаліся зь цяжкавагавікамі.

Пасьпяхова згуляў у турніры новы чэмпіён Беларусі Андрэй Малюш, праўда, чамусьці толькі на чацьвёртай дошцы. На першай жа найлепшы вынік — 3,5 ачка з 5 — паказаў беларускамоўны студэнт-філёляг Павал Ламака, аўтар шахматнага слоўніка.

На закрыцьці было абвешчана аб наданьні Сяргею Азараву, шматразоваму чэмпіёну краіны і віцэ-чэмпіёну сьвету сярод юнакоў ва ўзросьце да 20 год, годнасьці майстра спорту міжнароднай клясы — паводле дзяржтрэнэра Яўгена Мачалава, найвышэйшай у беларускай спартовай гіерархіі.

Вольф Рубінчык

Як бы вы згулялі?



Э.Калесьнік — А.Малюш, Менск, чэмпіянат Беларусі-2004. Ход чорных

НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

ВАКАНСІІ

«Наша Ніва» запрашае

спэцыяліста па абслугоўваньні кампутарнай сеткі на траціну стаўкі. Пажаданыя рэкамэндацыі.

Зьвесткі пра сябе дасылаць на адрас nn@promedia.by

Запрашаем мастака

для працы над кніжнымі і рэклямнымі праектамі. Акрамя выдатных прафэсійных якасьцяў пажадана павага да Сьвятога Пісаньня.

Т.: 69-69-501. Віктар

Незалежны культурны часопіс «ARCHE»

шукае на пастаянную працу дызайнэра-афарміцеля вокладак.

Патрабаваньні да кандыдатаў:

— мастацкая адукацыя;

— дасканалае валоданьне праграмамі «Adobe Photoshop» і «Coreldraw»;

— крэатыўнасьць;

— беларускамоўнасьць.

Наяўнасьць рэкамэндацыяў вітаецца.

Просьба дасылаць рэзюмэ на адрас arche@arche.org.by з пазнакай у полі тэма — «конкурс».

Конкурс

для маладых журналістаў-аналітыкаў

Беларускі ПЭН-Цэнтар пры падтрымцы газэты «Наша Ніва», часопісаў «Arche» і «Палітычная сфера» ды Беларускай асацыяцыі журналістаў

абвяшчае конкурс на найлепшы аналіз

«Выбары-2004: шанцы і прагнозы».

Пераможцаў чакаюць прызы, дыплёмы і майстар-клясы.

На конкурс прымаюцца артыкулы памерам да 15 тыс. знакаў. Працы дасылайце на электронны адрас pen@pen.unibel.by або на адрас: а/с 18, 220050, Менск, з пазнакай «На конкурс». Апошні тэрмін падачы — 25 чэрвеня.

Журы конкурсу: Валер Булгакаў, Андрэй Дынько, Андрэй Казакевіч, Віталь Сіліцкі.

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ВІТАНЬНІ

Прыўкрасная панна! Сярэднявечныя насельнікі Крэўскага замку віншуюць Вас з Днём народзінаў і запрашаюць у госьці

Нашу любімую Ленку Цітавец віншуюць з Днём народзінаў Паша З. і Зьміцер М. Чакаем не дачакаемся чарговага супольнага падарожжа

Самую вялікую соню з вуліцы Ангарскай віншуюць з Днём народзінаў знэрваваныя суседзі. Уставай, прасьпіш сваё каханьне

Віншуем Ленку з Днём народзінаў і зычым атрымаць у падарунак усе старадаўнія строі Беларусі

Дарагога тату і мужа Мікалая Рыжкова з днём народзінаў. Алёкса, Стасік, Каця

Станчыку ад Алы: усьмешкі й пагляды, дотыкі й дарункі, як сьвяціліся вочы — усё, што памятаць я буду з жыцьця

КАНТАКТЫ

Падкажыце, у якой музычнай школцы (гуртку) непадалёк ад цэнтру вучаць дзетак па-беларуску. Т.: 507-41-98. Крысьціна, пасьля 19-й

Уладальнікі «Siemens», дашліце на маю мабілу бел. мэлёдыю-SMS. За грошы. Т. 8-029-767-20-37

Рэгістрацыя для ўдзельнікаў «Штурм FM» па адрасе: а/с 104, 220006, Менск. Пазначце імя і сродак сувязі

Запрашаем на экзатычны адпачынак у міжнародны летнік «Камунікацыя Палятыды». Т.: 8-029-776-26-75. Http://www.bonalita.narod.ru

Пазнаёмлюся зь беларускім хлопцам. Валянціна. Т.: 259-97-80

Сутнасьць угледзіш праз гэтыя словы: любоў да Радзімы, павага да мовы. Будзь разам з намі! А/с 104, 220006, Менск

СПАЧУВАНЬНЕ

Хочам выказаць нашыя глыбокія спачуваньні барду Андрэю Мельнікаву з нагоды сьмерці маці. Сьцяпанавы, Віцебск

КНІГІ

Новыя майкі з нацыянальнай сымболікай, шаўроны, значкі, відэа, аўдыё, CD, кнгі, падручнікі, слоўнікі на сядзібе ТБМ (Румянцава, 13) з панядзелка да пятніцы (13.30—19.30) да 14 чэрвеня. Т.: 707-40-01

Запрашаем на падарожжа

13 чэрвеня (нядзеля)

па маршруце: **Менск—Сынкавічы—Зэльва—Крамяніца—Ваўкавыск—Гнёзна—Мсьцібава—Ізабэлін—Краскі—Менск.**

Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
264-12-38, 776-24-35 (Павал)

Запрашаем у вандроўку

13 чэрвеня

Мір—Наваградак

Мір:
Замак (XVI ст.)
Капліца-пахавальня (1904 г.)
Касьцёл Сьв.Мікалая (1594—1604 г.)
Траецкая царква (сярэдзіна XVI ст.)

Наваградак
Замак (руіны) сярэдзіны XIII ст.
Барысаглебская царква (1519 г.)
Фарны касьцёл (1712—1733 г.)
Сьвята гораду — Наваградку 950 год!

Кошт — 18000 руб. для дзяцей і 21000 руб. для дарослых.
Тэлефануйце: 222-88-76, 755-03-70; http://altusplus.narod.ru

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

Алесю Ю. зь Менску. У Вас, як і ў многіх старых чытачоў «НН», засталося жаданьне, каб газэта замяняла сабою краіну — каб яна была і палітыкам, і пісьменьнікам, і тэлевізарам. Гэта немагчыма. Дый зьвесьці нацыянальны праект да маштабу аднаго, хай сабе й геніяльнага твору — гэта, па вялікім рахунку, жаданьне мастака, а не грамадзяніна. Вяртаньня да старое «НН» няма, бо дзяржава і нацыя разбудоўваюцца. Самыя сьмелыя мары і праекты дзесяцігадовае даўніны зьдзяйсьняюцца, а іншыя — не зьдзяйсьняюцца, бо насеньне ўпала на камень. У тым і ёсьць пазытыў нашага часу, што нацыянальнае перастала зводзіцца да літаратуры і мастацтва, што літаратура й мастацтва больш не падмяняюць сабой дзяржаўнасьць. Мы яшчэ няўпэўнена пачуваемся ў гэтай новай Беларусі, за якую змагаліся, але ў посьпех якой да канца ня верылі, нам яшчэ хацелася б стаіцца ў зьведаным, прадказальным і эстэтычным сьвеце культуры і літаратуры, як зубру, узрошчанаму ў вальеры, спачатку нязвыкла выходзіць у лес. Аднак лёсы вырашыліся. Нацыянальны рух не абмяжоўваецца колам творчае інтэлігенцыі. Гэта рэчаіснасьць, а не выпадковасьць.

В.Г-бу-Я-аму зь Менску. Вы ўсё зьмяшалі ў кучу: і аналіз бягучае палітычнае сытуацыі (нетрывіяльны), і прагноз на выбары (заснаваны на вельмі спрэчных пасылах, ён не паддаецца праверцы), і праект ідэальнага грамадзкага ладу (тэма для асобнага дасьледаваньня). Вы панарамна бачыце палітычную сытуацыю, але грашыце запазычваньнем прыёмаў і стылістыкі сучаснае расейскае паліталёгіі не заўжды найлепшых узораў. Калі пісаць у «НН», трэба выправіць гэтыя хібы.

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі	Наста Бакшанская
галоўны рэдактар	Андрэй Дынько
фота-рэдактар	Арцём Лява
карэктар	Сяргей Петрыкевіч
карэктарка	Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара	Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар	Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік	Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3525. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 2.06.2004.
Замова № 3309.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а